КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ № 28 (204) ◂ 23 ліпеня ◂ 2010 г.
www.novychas.org

# Новы Час



ПРАЎДЗІВЫ РЭПАРТАЖ АПАКАЛІПСІСУ

Стар. 30

### ПАМЫЛКА РОЯ МЯДЗВЕДЗЕВА

Рой Мядзведзеў сказаў, і гэта вельмі спадабалася прыхільнікам рэжыму, што Беларусь сёння (трэба разумець, і раней) з'яўляецца эканамічным лідэрам СНД

Стар. 6

### НАШТО ЧАВЕСУ БАЛІВАР

У Венесуэле ўскрылі магілу Сімона Балівара — героя вайны за незалежнасць Лацінскай Амерыкі. Чавес абяцае вялікую сенсацыю

Стар. 29

### ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ

Стар. 9–24

ISSN 2218-2144
9 772218 214401 10028

**ПАВАЖАНЫЯ ЧЫТАЧЫ!**

**НАСТУПНЫ НУМАР ГАЗЕТЫ «НОВЫ ЧАС» ВЫЙДЗЕ 20 ЖНІЎНЯ**

▸ З НАГОДЫ

# БАІ СЛАВЯНСКАГА БАЗАРУ

Вольга ХВОІН

**Летні застой і сіесту ў чарговы раз разбаўляе славянскі базар — канфлікт паміж Беларуссю і Расіяй. І калі летась забаўляліся спрэчкамі на малочныя тэмы, то сёлета ўсё больш сур'ёзна. У Беларусі хутка чарговыя прэзідэнцкія выбары, а цяперашні лідэр сінявокай паднадакучыў кіраўнікам Крамля.**

Расійскія тэлеканалы пускаюць у эфір фільмы і сюжэты з непрыемнымі для Аляксандра Лукашэнкі тэмамі. Нагадваюць пра расійскія фінансавыя датацыі ў мільярды долараў, зніклых апанентаў беларускага кіраўніка, яго пазашлюбныя сувязі, малодшага сына, з якім Аляксандр Рыгоравіч і да палітыкаў, і да Папы Рымскага, і на ваенныя вучэнні заяўляецца. Карацей, крамлёўскія паліттэхнолагі напярэдадні перадвыбарчай кампаніі Лукашэнкі вырашылі развеяць міф пра добрага пана, а заадно і паказаць жыхару Чырвонага дома на Карла Маркса, што ў вачах крамлёўскай палітычнай эліты ён ужо персона нон-грата. А там, глядзіш, і да падтрымкі альтэрнатыўнай яму асобы недалёка.

Натуральна, што гэтай сітуацыяй не прамінулі скарыстацца і беларускія апазіцыйныя палітыкі. Пасля выхаду на канале НТВ фільма «Хросны бацька», у якім прыводзіліся вядомыя ў Беларусі факты сімпатыі Лукашэнкі да Адольфа Гітлера, яго датычнасці да знікнення вядомых палітыкаў, да фальсіфікацыі вынікаў выбараў і да іншых злачынстваў, апазіцыйны бамонд заявіў, што збіраецца дамагацца міжнароднага расследавання справы аб зніканнях людзей. У прыватнасці, палітыкі збіраюцца звярнуцца ў ААН і Еўрапейскі парламент з мэтай ініцыяваць міжнароднае расследаванне па справе зніклых.

Таксама кіраўнік Аб'яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька расказаў журналістам, што яго партыя на наступны дзень пасля паказу фільма «Хросны бацька» звярнулася ў Генеральную пракуратуру, каб завялі крымінальную справу па фактах, што былі агучаныя ў праграме НТВ, ці каб завялі справу на журналістаў. Палітык зазначыў, што гэта тэма набывае большую актуальнасць напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў. Прадстаўнікі апазіцыі падалі ў Мінгарвыканкам заяўку на правядзенне мітынгу і шэсця 16 жніўня з патрабаваннем расследаваць справы зніклых. Па задуме арганізатараў, акцыя мусіць прайсці ад 18 да 20 гадзіны вечара па маршруце Акадэмія навук — плошча Свабоды. Аднак ужо цяпер ёсць сумневы як наконт таго, што маршрут улады зацвердзяць, так і наконт масавасці. 16-ы дзень кожнага месяца ў апазіцыйных колах уважаецца за Дзень памяці і салідарнасці. Але пра ступень падтрымкі гэтага сімвалічнага дня яскрава сведчаць сціплыя акцыі з некалькіх удзельнікаў і пары дзесяткаў амапаўцаў на цэнтральнай плошчы сталіцы.




Цікава, што Белтэлерадыёкампанія прапусціла ў беларускі эфір правакацыйныя перадачу і фільм, але не за проста так. А каб мець падставы адказаць тым жа Крамлю. У прыватнасці было паказанае інтэрв'ю з прэзідэнтам Грузіі Міхаілам Саакашвілі, які для Расіі, што чырвоная ануча для быка, — раздражняльнік імперскіх амбіцый. У давесак БТ падрыхтавала інтрэв'ю з прэзідэнтам Латвіі Валдзісам Залтэрсам. А афіцыйны орган Савета міністраў Беларусі, газета «Рэспубліка» апублікавала ў нумары за 20 ліпеня частку дакладу расійскага апазіцыянера Барыса Нямцова «Пуцін. Вынікі. 10 гадоў», які ў Расіі выйшаў яшчэ ў 2009 годзе. У каментары журналіста, які суправаджаў артыкул, выказвалася пазіцыя, што крытыка Нямцовым крамлёўскага кіраўніцтва небеспадстаўная і праблем ва ўладзе там нямерана. Кажуць, што ідэю артыкула рэдакцыя атрымала з Адміністрацыі прэзідэнта. Інфармацыйныя войны ў разгары, і прыўладныя СМІ па абодва бакі барыкадаў шчыра адпрацоўваюць свой хлеб.

Да слова, Аляксандр Лукашэнка таксама выказаўся з нагоды крамлёўскай антыпатыі. «Калі вы хочаце быць незалежным, суверэннымі, то ні я, ні вы, грамадзяне Беларусі, і нашы сябры, не павінны схіляцца і станавіцца на калені. Схілімся, устанем на калені — не паднімемся, усё жыццё будуць патыкаць, як гэта заўсёды было. Таму я не магу сабе дазволіць устаць перад імі на калені або лбом стукаць аб крамлёўскую сцяну, — заявіў Лукашэнка падчас працоўнай паездкі па Гомельскай вобласці. — Я ім прапаную: давайце па-чалавечы, як рускі і беларус, жыць, сябраваць. Апошні кавалак, калі трэба, будзем дзяліць. Абарона агульная, СПА і іншае. Я не супраць, але па-людску. Але ў нас розныя падыходы і паняцці. Яны вельмі багатыя, яны «ўпакаваныя» ўсе па поўнай праграме, супермільярдэры. Ну чаго мне з імі размаўляць? Я для іх чужы чалавек». Да ўсяго, кіраўнік Беларусі заявіў, што Расія будуе сваю палітыку такім чынам, каб не толькі запалохаць сваіх бліжэйшых партнёраў, але і далёкіх.

Відавочна, наша кіраўніцтва асэнсоўвае, што Крэмль настроены на змену ўлады ў Беларусі і спрабуе пайсці на контрзахады. Пачынаючы ад інфармацыйнай вайны і да ўкаранення ў свядомасці беларусаў антырасійскіх настрояў. Не можа Аляксандр Лукашэнка выключаць і спробы рэалізаваць у Беларусі сцэнар па змяшчэнню дзейснай улады і спробе паставіць на яго месца чалавека больш згаворлівага ды зручнага Расіі. Адпаведна, можна чакаць, што прэзідэнцкую выбарчую кампанію прызначаць на бліжэйшыя тэрміны, каб пакінуць расійскім паліттэхнолагам менш часу для магчымай рэалізацыі іх планаў. А варыянт, што Аляксандр Рыгоравіч стане для Расіі такім мяккім, што хоць да раны прыкладай, хіба што магчымы, калі краіна дойдзе «да ручкі» ў посткрызісных умовах і сяброўства ды адданасць больш не будзе каму задэклараваць.

## НАВІНЫ РЭГІЁНАЎ

### МОХАНАВІЧЫ. ЧАРГОВЫЯ КРЫЖЫ

У нядзелю ва ўрочышчы Крыжы, што непадалёк ад вёскі Мохавічы, адбудзецца чарговае ўшанаванне памяці паўстанцаў 1863 года, якія загінулі ў бойцы з расійскімі рэгулярнымі войскамі. Магілы загінулых паўстанцаў былі адшуканы 16 гадоў таму. І з гэтага часу напрыканцы ліпеня тут адбываецца набажэнства. Ужо каторы год запар лідскі райвыканкам дае афіцыйны дазвол на яго правядзенне. Не прамінаюць прысутнічаць на ім акрамя мясцовых дэмакратычных актывістаў і тутэйшых жыхароў чыноўнікі, у тым ліку кіраўнік ідэалагічнага аддзела райвыканкама. У гэты дзень сюды наведваюцца таксама прадстаўнікі грамадскіх арганізацый і палітычных партый іншых рэгіёнаў Беларусі. У гэты раз прысутнічаць на імпрэзе выказалі намер некалькі палітычных асобаў, што пажадалі быць кандыдатамі на пасаду прэзідэнта на будучых выбарах.

### НОВАЯ МЫШ. ВЯРТАННЕ ДА КАРАНЁЎ

На мінулым тыдні адбылося адкрыццё фотавыставы. Яна прысвечана 615-годдзю вёскі Новая Мыш, што на Брэстчыне. Мерапрыемства прайшло ў мясцовай бібліятэцы. Яго арганізатарам выступіла краязнаўца Ірына Тамарава. Неўзабаве намаганнямі Ірыны Тамаравай і яе паплечнікаў з'явіцца сайт фотамузея «Новая Мыш».

### СПОРАВА. ЖАРТАВАЦЬ ДЫК ЖАРТАВАЦЬ

Новы цэнтр смеху і гумару з'явіўся на Беларусі. Яго арганізавалі ў мінулыя выходныя «жартаўнікі», што сабраліся на фестываль. Усіх гасцей і гледачоў чакала сустрэча з самымі вясёлымі, кемлівымі ды неардынарнымі людзьмі не толькі з вобласці, але прадстаўнікамі з Любані, Валожына, Аўцюкоў, Украіны і Польшчы. Праграма свята была вельмі разнастайнай і арыгінальнай. Вынікі фестывалю прайшлі пад назвай «Падбіццё бабак», а ўручэнне ўзнагарод — «І смех і слёзы».

**Падрыхтаваў Язэп Палубятка**

---

УЛАДА

# У КРУГЛЫМ ЗНОЎ ПРАЦАВАЛІ БЯСПЛАТНА

*Сяргей СЕМЯНОВІЧ*

**Згодна рашэння Круглянскага раённага выканаўчага камітэта, 15 ліпеня 2010 года ў Круглянскім раёне Магілёўскай вобласці быў праведзены «дзень безаплатнай працы».**

Жыхары Круглянскага раёна даведаліся пра «мудрае» рашэнне раённых чыноўнікаў са змешчанай у раённай газеце «Сельскае жыццё» за дзень да правядзення мерапрыемства» з нататкі пад назвай «Мэта — высакародная».

15 ліпеня жыхары Круглянншчыны працавалі на сваіх месцах, а таксама займаліся добраўпарадкаваннем і прывядзеннем у належны стан гарадскога пасёлка Круглае. Пры гэтым грошай за сваю працу яны не атрымаюць, бо, у адпаведнасці з рашэннем райвыканкама, грашовыя сродкі, заробленыя ў «дзень безаплатнай працы», будуць пералічаны на разліковы рахунак Круглянскага райвыканкама.

Мясцовыя жыхары вельмі адмоўна паставіліся да чарговай ініцыятывы мясцовых улад.

«Чыноўнікі ўвесь час імкнуцца вырашыць свае праблемы за кошт простага народа, — дзеліцца сваім меркаваннем жыхар Круглага Аляксандр К. — Мала таго, што ўвесну ўвесь час на розных «суботніках» працуеш бясплатна, дык ужо і летам другі год запар грошы вылічваюць з зарплаты на добраўпарадкаванне. Людзі, вядома, абураюцца, але робяць гэта як мага далей ад начальства, бо баяцца страціць працу. А новую працу ў нашым невялікім пасёлку паспрабуй знайдзі...»

Працаваць задарма для жыхароў Круглянншчыны становіцца традыцыйным, 17 ліпеня 2009 года «дзень безаплатнай працы» ўжо праводзіўся ў Круглянскім раёне. Як і сёлета, заробленыя ў гэты дзень грошы былі пералічаны на разліковы рахунак мясцовага райвыканкама і выкарыстаны для добраўпарадкавання Круглага.

У мінулым годзе «ноу-хау» круглянскіх чыноўнікаў па «сумленнаму вынятку грошай у народа» падтрымаў і Бялыніцкі райвыканкам, які таксама правёў 25 жніўня «дзень безаплатнай працы». Грошы, заробленыя людзьмі, былі тады накіраваны на будаўніцтва чарговага аграгарадку ў вёсцы Свяцілавічы. Пакуль дакладна не вядома, ці збіраюцца чыноўнікі з Бялыніч зноў паўтарыць эксперымент круглянскіх калег і перааодолець недахоп сродкаў бюджэтнага фінансавання на стварэнне «паказухі» метадам рэкецiраў — адабраўшы сумленна заробленыя грошы ва ўласных грамадзян, многія з якіх і так ледзь-ледзь выжываюць ва ўмовах крызісу.

Пытанне пра тое, наколькі адпавядае беларускаму заканадаўству ініцыятыва круглянскіх чыноўнікаў па вынятку грошай у працаўнікоў, застаецца адкрытым.

---

ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

# ЯШЧЭ АДНА ГАЛАДОЎКА

**Актывіст апазіцыі Сяргей Каваленка 10 дзён галадаў у віцебскім ізалятары часовага ўтрымання (ІЧУ), адкуль быў вызвалены вечарам 18 ліпеня.**

Нагадаем, Каваленка быў затрыманы вечарам 8 ліпеня супрацоўнікамі міліцыі. У маі яго асудзілі ўмоўна, і кожны дзень пасля 21.00 ён павінен быў знаходзіцца дома. Як паведаміў Каваленка БелаПАН, 8 ліпеня ён прыйшоў дамоў на дзве хвіліны пазней, пасля чаго на яго ўсклалі дысцыплінарны арышт на 10 дзён за парушэнне ўмоў праходжання ўмоўнага пакарання.

Усе 10 дзён знаходжання ў ІЧУ апазіцыянер галадаў. «Гэта мой пратэст на папярэднія затрыманні, вельмі дрэнныя ўмовы ў ІЧУ. Не было цюфякоў, падушак, мяне не выводзілі на прагулкі», — заявіў Каваленка.

Ён меркаваў, што можа быць затрыманы. «Улады не хацелі, каб я быў на волі падчас правядзення «Славянскага базару», таму што мог праводзіць беларускамоўную агітацыю сярод вялікай колькасці народа», — сказаў апазіцыянер.

З пачатку 2010 года Сяргей Каваленка неаднаразова затрымліваўся міліцыяй за арганізацыю розных акцый. У маі суд Кастрычніцкага раёна Віцебска прыгаварыў яго да трох гадоў пазбаўлення волі ўмоўна за вывешванне бел-чырвона-белага сцяга на галоўнай ёлцы Віцебска 7 студзеня. Гэты ўчынак быў кваліфікаваны ўладамі як «наўмысныя дзеянні, у выніку чаго быў груба парушаны грамадскі парадак і праяўлялася яўная непавага да грамадства».

**Паводле БелаПАН**

---

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# АБЯЦАНАГА ЧАКАЮЦЬ ТРЫ ГАДЫ

**Пасля трох гадоў зваротаў у розныя інстанцыі актывісты грамадзянскай кампаніі «Наш дом» дабіліся ад уладаў Гомеля агароджвання дзіцячага гарадка.**



Гульнявая пляцоўка размешчана ў мікраёне Сельмашаўскі ўздоўж магістральнай вуліцы — праспекта Касманаўтаў, паміж прыпынкам грамадскага транспарту «Вуліца Яфрэмава» і паркоўкай супермаркета «Веста».

«Суседства гульнявай пляцоўкі з магістраллю небяспечнае для дзяцей. У адпаведнасці з санітарнымі нормамі, дзіцячыя пляцоўкі павінны быць абсталяваны на тэрыторыі, што прылягае да жылых дамоў. Але, хутчэй за ўсё, логіка чыноўнікаў такая, што з боку дарогі, седзячы ў салоне аўтамабіля, дзіцячыя гарадкі кідаюцца ў вочы і пpаглядваюцца значна лепш, чым схаваныя ў глыбіні кварталаў. Але, каб агарадзіць дзіцячы гарадок, давялося тры гады абіваць парогі інстанцый», — расказаў актывіст кампаніі «Наш дом» Андрэй Аксёнаў.

Паводле яго слоў, са жніўня 2007 года калектыўныя звароты адпраўляліся ў камунальныя службы, раённую адміністрацыю і гарвыканкам. Вырашыць праблему не змаглі і дэпутаты, да якіх таксама звярталіся актывісты. Між тым, зазначыў Аксёнаў, размяшчэннем дзіцячага гарадка каля дарогі былі парушаны не толькі санітарныя нормы, але і Канвенцыя ААН аб правах дзіцяці.

Падчас правядзення агульнагарадской акцыі грамадзянскага кантролю «Небяспечныя дзіцячыя пляцоўкі» актывістам кампаніі «Наш дом» за апошнія два гады было атрымана 12 перамог, падкрэсліў Аксёнаў.

У прыватнасці, яны садзейнічалі пераносу дзіцячай пляцоўкі ад прыпынку «Вуліца Галавацкага» і праезнай часткі вуліцы Мазурава ў мікраёне Мельнікаў Луг; пасадцы дэкаратыўных кустоў у выглядзе жывой агароджы паміж дзіцячым гарадком і вадаёмам на перасячэнні вуліц Свірыдава і Агарэнкі; ліквідацыі аварыйных арэляў-качалкі, пясочніцы і горкі-ската па вуліцы Рэчыцкая шаша.

«На чарзе — перапіска з упраўленнем юстыцыі Гомельскага аблвыканкама і новым кіраўніцтвам адміністрацыі Навабеліцкага раёна аб выкананні мерапрыемстваў для больш бяспечнага знаходжання дзяцей на дзіцячых гульнявых пляцоўках, што размяшчаюцца ў зоне адпачынку «Сажалкі» па вуліцы Ільіча», — паведаміў грамадскі актывіст.

**Паводле інфармацыі кампаніі «Наш дом»**

---

АДУКАЦЫЯ

# ВНУ ПАДТРЫМАЕ ЕЎРОПА

**Больш за 30 мільёнаў еўра будзе выдзелена на праграмы падтрымкі вышэйшай адукацыі.**

Еўракамісія абвясціла пра планы ўкласці гэтыя грошы ў праграмы падтрымкі вышэйшай адукацыі ў краінах Еўрапейскай палітыкі добрасуседства і Расіі. Як паведамляе прэс-служба Камісіі ЕС, сродкі дазволяць пашырыць супрацоўніцтва ў гэтай сферы.

Еўракамісар па пытаннях пашырэння і Еўрапейскай палітыкі добрасуседства Штэфан Фюле прывітаў рашэнне. Паводле яго слоў, «інвестыцыі ў людзей — ключавая мэта палітыкі суседства», і плённае супрацоўніцтва паміж ВНУ будзе працягнута.

У сваю чаргу, Андрула Васіліу, еўракамісар па пытаннях адукацыі і моладзевай і культурнай палітыкі, адзначыла, што ўзаемадзеянне паміж ВНУ заўсёды ўзаемавыгаднае, яно таксама павышае прывабнасць вышэйшай адукацыі Еўропы.

У рамках праграмы акадэмічных абменаў Tempus будзе падтрымана каля 50 шматбаковых праектаў, накіраваных на мадэрнізацыю вучэбнага працэсу і кіравання ВНУ. У праектах возьмуць удзел каля 350 навучальных устаноў.

**Паводле прэс-службы камісіі ЕС**

---

АКЦЫЯ

# ДАБРАЧЫННЫ РАСПРОДАЖ

**Сустаршыня Аргкамітэта па святкаванню 600-годдзя Грунвальдскай перамогі мастак Мікола Купава абвяшчае пра продаж некаторых сваіх твораў.**

Мастак разлічвае на тое, што атрыманыя ад продажу карцін сродкі дазволяць кампенсаваць частку выдаткаў Аргкамітэта на падрыхтоўку і адзначэнне 600-годдзя Грунвальдскай перамогі. У першую чаргу маецца на ўвазе выраб Грунвальдскіх харугваў, паездка на Грунвальдскае поле ды стварэнне банераў-плакатаў.

Мікола Купава запрашае беларускіх патрыётаў прыняць удзел у дабрачыннай акцыі.

Забяспечаным і неабыякавым грамадзянам прапануецца набыць творы Міколы Купавы, сярод якіх акварэль «Вільня. Замак», «Вечар у Ляўках», «Менск. Верхні горад», «Менск пач. XX ст.», а таксама партрэты Янкі Купалы, Якуба Коласа, Алаізы Пашкевіч, Фрацішка Багушэвіча, выканаыя ў тэхніцы лінарыт і іншыя.

Тэлефоны для кантактаў: (029) 551-32-36. (017) 306-33-17

**Паводле інфармацыі аргкамітэта**

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# ПРЫРОДНАЯ І ГЕАПАЛІТЫЧНАЯ ГАРАЧЫНЯ

Генадзь КЕСНЕР

**Спачатку падавалася, што абмяняюцца парай інфармацыйных udараў Масква з Мінскам, як тое здаралася і раней, ды на гэтым усё суцішыцца. Не суцішылася. За апошні тыдзень інфармацыйныя залпы з абодвух бакоў зрабіліся больш моцнымі і адчувальнымі, да інфармацыйнай вайны далучыліся не толькі новыя сродкі масавай інфармацыі, але і палітыкі, і нават прэзідэнты іншых краінаў.**



Photo.ByMedia.Net

З расійскага боку з тэлеканалам НТВ скааператаваліся ОРТ і «Расія», з беларускага — у бітву ўступілі буйныя дзяржаўныя друкаваныя выданні (электронныя СМІ даўно не спыняюцца ў сваім выкрыванні «варожых захадаў» з боку расійскага дуумвірату).

Сапраўднай бомбай для расійскага істэблішменту стала інтэрв'ю на Першым канале БТ прэзідэнта Грузіі Міхаіла Саакашвілі, які згуляў ролю «адваката» беларускага кіраўніцтва. Не сакрэт, што для расійскага дуумвірата, ды і для ўсяго расійскага палітыкуму, грузінскі лідэр з'яўляецца «ворагам №1».

Самі Пуцін з Мядзведзевым пакуль прамаўчалі, затое астатнія сказалі ўсё, што думаюць, прычым не абмяжоўваючы сябе ў выказваннях — ад «здрадніка» (Мікалай Сванідзе, палітычны аглядальнік) да «палітычнага хамелеона» (Мікалай Левічаў, кіраўнік фракцыі партыі «Справядлівая Расія» ў Дзяржаўнай думе).

Выбухнулі на адрас Аляксандра Лукашэнкі і думскі спікер Барыс Грызлоў, і кіраўнік ЛДПР Уладзімір Жырыноўскі, і нават лідэр КПРФ Генадзь Зюганаў. Карацей, робіцца відавочным, што фанатаў першай асобы РБ у вышэйшых эшалонах РФ амаль не засталося. А на расійскага абывацеля, які яшчэ «любіць Бацьку», накіраваны інфармацыйныя плыні ў выглядзе стужак «Хросны Бацька» і «Хросны Бацька–2» ды іншых «тэлешэдэўраў», наспех сляпаных па загадзе Крамля ды Старой плошчы.

«Гульня з Саакашвілі вырубае пад корань усё палітычнае пазіцыянаванне Аляксандра Лукашэнкі ў дачыненні да Расіі, — адзначае эксперт «Аналітычнага цэнтру «Стратэгія» Валеры Карбалевіч. Паводле меркавання палітолага, «імкнучыся ўдарыць па Пуціну і Мядзведзеву, Лукашэнка кінуў выклік расійскаму грамадству, разбурыў сваё ранейшае аблічча сябра і саюзніка Расіі».

Але не толькі інфармацыйная вайна займае час дзейнага кіраўніка Беларусі. 20 ліпеня ў краіне пачаўся «гарачы час» — уборка збожжавых. І нішто не робіцца без непасрэднага ўдзелу прэзідэнта, які персанальна кантралюе ход уборачнай кампаніі. Аляксандр Лукашэнка, паводле яго словаў, ужо ўбачыў 9,5 мільёна тон зерня на палях і загадаў сабраць не менш за 10 мільёнаў тон збожжа, не дапусціць страт падчас умалоту, маўляў, ёсць магчымасці добра зарабіць на экспарце зерня.

Хто б сумняваўся. Вось толькі ўжо не першы раз пішацца і гаворыцца пра тое, што падобныя паездкі вышэйшых службовых асоб падчас уборачнай кампаніі толькі адцягваюць увагу сялян і мясцовых кіраўнікоў ад спраў надзённых, таксама вымагаюць дадатковых фінансавых і часавых рэсурсаў для арганізацыі і абслугоўвання такіх высокіх інспекцый… Але кожны жыве сваім розумам, у тым ліку і беларускія небажыхары.

Нягледзячы на заявы беларускага кіраўніка пра тое, што яму зараз «не да выбараў», набліжэнне прэзідэнцкай кампаніі назіраецца па рытопыцы і абяцаннях высокапастаўленых асоб, уключна з прэм'ер-міністрам. Так, Сяргей Сідорскі, прадстаўляючы праект асноўных палажэнняў Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на 2011–2015 гады, паведаміў, што ВУП Беларусі плануецца павялічыць на 62–68 працэнтаў, а сярэдні заробак — да тысячы долараў. Гэтыя лічбы будуць агучаны на IV Усебеларускім народным сходзе.

Тое, што гэта мерапрыемства будзе стартавай пляцоўкай для выбарчай кампаніі Аляксандра Лукашэнкі, — аксіёма. І такія гучныя планы ўраду ёсць сведчаннем таго, што ўжо зараз ідзе хваля настрою электарату «на ўнутраны пазітыў» (знешняга негатыву, які можа згуляць на руку цяперашняга кіраўніка дзяржавы, і так хапае). І самаўпэўненасць аўтараў Праграмы сведчыць пра тое, што яны не сумняваюцца ў выніках будучых выбараў.

Вось толькі як яно станецца насамрэч, калі Беларусь будзе змушана жыць па законах рынку, набываючы энерганосьбіты па сусветных коштах, невядома.

Тым часам, вядомыя беларускія журналісты прынялі заяву ў падтрымку інтэрнэт-газеты «Салідарнасць». Падставай стаў ціск на «Салідарнасць» з боку прафсаюзных функцыянераў.

Прынцыповая пазіцыя выдання ў дачыненні да некаторых негатыўных момантаў у беларускім прафсаюзным руху прывяла да таго, што супраць рэдакцыі былі высунуты недарэчныя і беспадстаўныя абвінавачванні. Стаўленне да свабоды слова вызначае ўзровень дэмакратычнасці поглядаў саміх палітыкаў. Асабліваe шкадаванне выклікае інцыдэнт, які адбыўся 1 чэрвеня. Старшыня Беларускага кангрэсу дэмакратычных прафсаюзаў Аляксандр Ярашук аднаасобна забараніў журналісту «Салідарнасці» Алене Якжык прысутнічаць на пасяджэнні Савета БКДП.

Як лічаць аўтары заявы, такі крок прафсаюзнага лідэра ніяк не стасуецца ні з дэмакратычнымі стандартамі, ні з ранейшымі заявамі самога Аляксандра Ярашука. Сярод падпісантаў заявы — старшыня ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў» Жанна Літвіна, галоўныя рэдактары газет «Новы час» Аляксей Кароль, «Народная воля» Іосіф Сярэдзіч, «Наша ніва» Андрэй Скурко, кіраўнікі іншых незалежных сродкаў масавай інфармацыі.

З гэтай нагоды прыгадваецца пазіцыя яшчэ аднаго прафсаюзнага дзеяча Аляксандра Бухвостава, які некалькі гадоў таму заявіў, што ўсе недзяржаўныя выданні мусяць стаць партыйнымі і ледзьве не абслугоўваць дэмакратычныя сілы. У той час гэта заява Бухвостава таксама выклікала абурэнне ў журналісцкай супольнасці, а ў дэмакратычных палітыкаў хапіла розуму не падтрымаць такое стаўленне прафсаюзнага дзеяча да масмедыя і да разумення ім ролі СМІ ў грамадстве.

І, нарэшце, пра надвор'е. Спёка б'е ўсе магчымыя рэкорды: за апошнія некалькі тыдняў трыццацігpадусная адзнака тэрмометра стала такой жа звыклай з'явай, як каларадскі жук на бульбяным полі. Мазгі плавяцца разам з асфальтам. Адсутнасць дажджоў апошнімі днямі дажджоў прыводзіць да ўзгаранняў тарфянікаў, што ёсць з'явай вельмі небяспечнай і праблемнай, бо гасіць полымя на торфе — справа вельмі складаная.

Людзі, ратуючыся ад гарачыні, усё часцей кідаюцца ў ваду, як у прыстасаваных для купання месцах, так і ў незнаёмых. Пры гэтым многія ратуюцца ад спёкі ў вадаёмах, папярэдне прыняўшы на грудзі штосьці-небудзь для ўзняцця настрою. І, паводле афіцыйных дадзеных, толькі за апошні тыдзень у Беларусі патанулі 145 (!) чалавек, большасць з якіх былі ў нецвярозым стане. Гэта сталася сумным рэкордам за апошнія трыццаць год.

Але ад такой спёкі можна атрымаць асалоду, таму што нарэшце ў Беларусі лета такое, якім яно, па вялікім рахунку, і мае быць — сонечнае і вельмі цёплае. Лавіце момант, спадарства!

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ

### СЯРГЕЙ БЕЛЯЗЕКА



Грамадскага актывіста з Віцебска Сяргея Белязеку могуць абвінаваціць у абразе прэзідэнта на аснове зваротаў у Адміністрацыю прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, якія ён дасылаў. Напрыканцы 2009 года Белязека звярнуўся да кіраўніка краіны з заявай аб адмове ад грамадзянства і просьбай выслаць яго за мяжу, як у савецкія часы высылалася дысідэнты, — пішуць «Народныя навіны Віцебска». Актывіст сваю просьбу матываваў тым, што ў Беларусі парушаюцца яго грамадзянскія правы — яго некалькі разоў затрымлівалі за ўдзел у апазіцыйных акцыях, а таксама ўжо некалькі гадоў ён мае цяжкасці з працаўладкаваннем.

Ліст быў накіраваны ў МУС, адкуль начальнік Дэпартамента грамадзянства і міграцыі Аляксей Бягун адказаў, што ў заканадаўстве Беларусі не прадугледжана адмова ад беларускага грамадзянства. Пасля гэтага Сяргей Белязека накіраваў яшчэ два звароты ў Адміністрацыю прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Апошні з іх быў накіраваны ва Упраўленне ўнутраных спраў Віцебскага аблвыканкама, адкуль спадар Белязека атрымаў адказ, зварот «оставлен без рассмотрения по существу, так как в нём содержатся нецензурные слова и оскорбительные выражения».

16 ліпеня бягучага года Белязека атрымаў копію звароту з пракуратуры Віцебскай вобласці ў пракуратуру Чыгуначнага раёна горада Віцебска, у якой намеснік пракурора вобласці загадвае пракуратуры Чыгуначнага раёна Віцебска правесці праверку, ці не было ў зваротах спадара Белязекі публічнай абразы прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (артыкул 368 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь).

### МІХАІЛ СЯМЁНАЎ І АЛЯКСАНДР КІКІНЕЎ





Беларускія барацьбіты грэка-рымскага стылю Міхаіл Сямёнаў і Аляксандр Кікінеў сталі бронзавымі прызёрамі фіналу Залатога Гран-пры, які праходзіў 16–18 ліпеня ў сталіцы Азербайджана Баку.

Міхаіл Сямёнаў (вагавая катэгорыя да 66 кг) у спаборніцтве за бронзу перамог японца Юджы Акамота, а Аляксандр Кікінеў (74 кг) узяў верх над грузінам Манучарам Квіркелія.

У 2008 годзе Міхаіл Сямёнаў заваяваў бронзавы медаль Алімпійскіх гульняў у Пекіне ў катэгорыі да 66 кг. А беларускі барацьбіт Аляксандр Кікінеў сёлета стаў чэмпіёнам Еўропы па грэка-рымскай барацьбе ў вагавай катэгорыі да 74 кг.

У дзесятку мацнейшых патрапілі таксама беларускія барацьбіты Іосіф Чугашвілі (120 кг), які заняў 7-е месца, і Уладзімір Бердчік (120 кг), што ўладкаваўся на 10-й пазіцыі.

У камандным заліку беларускія грэка-рымляне з 21 балам занялі 8-е месца сярод 21 каманды. У прызавую тройку ўвайшлі Азербайджан — 67 балаў, Іран — 48 і Грузія — 41.

Ніхто з прадстаўніц жаночай зборнай Беларусі ў фінал Залатога Гран-пры не прабіўся. У камандным заліку тут лепшымі сталі спартсменкі Польшчы, Казахстана і Японіі.

### УЛАДЗІМІР НЯКЛЯЕЎ



Photo.ByMedia.Net

Лідэр кампаніі «Гавары праўду» мае намер паўтарыць палітычны досвед экс-кандыдата на пасаду прэзідэнта Аляксандра Казуліна. Уладзімір Някляеў плануе вылучацца ў дэпутаты Усебеларускага народнага сходу. Бліжэйшым часам пачнецца збор подпісаў за яго кандыдатуру. У маі гэтага года Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ аб правядзенні чацвёртага Усебеларускага народнага сходу. Дата яго не прызначаная, але мяркуецца, што мерапрыемства адбудзецца перад прэзідэнцкімі выбарамі.

Як перадае прэсавая служба кампаніі «Гавары праўду», Уладзімір Някляеў мае намер прыняць у яе абмеркаванні актыўны ўдзел. Дэпутаты Усебеларускага народнага сходу вылучаюцца «знізу». Кожны кандыдат з'яўляецца прадстаўніком не менш як дзвюх тысяч чалавек. Уладзімір Някляеў мае намер сабраць не меней за 20 тысяч подпісаў, каб зрабіць сваю кандыдатуру бясспрэчнай.

У 2006 годзе кандыдат у прэзідэнты Аляксандр Казулін таксама спрабаваў прайсці на Усебеларускі народны сход. Але быў збіты і затрыманы супрацоўнікамі спецслужбаў у цывільным. Разам з палітыкам тады пацярпелі некалькі членаў яго выбарчага штаба, а таксама журналісты, якія асвятлялі падзею.

АЗБУКА ПСІХАЛОГІІ

# ШТО ЗАМІНАЕ ПАЛІТЫЧНЫМ ТАНЦОРАМ?

Сяргей НІКАЛЮК

**Учынкі чалавека вызначаюцца яго індывідуальнымі асаблівасцямі і знешнімі акалічнасцямі. На думку сацыяльных псіхолагаў, усе мы схільныя недаацэньваць фактар абставін.**



Дрэннаму танцору ўвесь час штосьці замінае, але галоўная крыніца перашкод, здавалася б, усім добра вядомая, і таму няма сэнсу на ёй прыпыняцца. Аднак тое, што на побытавым узроўні здаецца відавочным, на ўзроўні «Азбукі сацыяльнай псіхалогіі» патрабуе сур'ёзнага асэнсавання.

Мы знаходзім прычыны там, дзе іх шукаем. Калі мы спрабуем растлумачыць уласныя ўчынкі, то ў першую чаргу бачым знешнія абставіны. Калі ж мы назіраем за дзеяннямі іншага, то ў цэнтр нашай увагі патрапляе сам чалавек, а знешнія акалічнасці робяцца адносна нябачнымі. У выніку ўзнікае адчуванне, што наша асяроддзе амаль цалкам складаецца з дрэнных танцораў, якія да таго ж апраўдваюць свае нязграбныя танцавальныя па спасылкамі на знешнія абставіны. На мове сацыяльнай псіхалогіі такая дваістасць пры ацэнцы сябе і навакольных называецца «фундаментальнай памылкай атрыбуцыі» (ад лац. «attributio» — «прыпісванне» — механізм тлумачэння прычын паводзін іншага чалавека).

## «Тэфлонавы» рэйтынг

Разгледзім праз прызму фундаментальнай памылкі атрыбуцыі гісторыю расійскіх прэзідэнтаў — Ельцына і Пуціна. За кропку адліку палітычнай кар'еры Ельцына возьмем яго абранне народным дэпутатам СССР у 1989 годзе. Супрацьстаяў яму тады генеральны дырэктар ЗІЛа, якога падтрымлівала ўлада. Аднак разжалаваны партыйны функцыянер Ельцын, які не меў ні каманды, ні грошай, атрымаў 90 працэнтаў галасоў масквічоў. У 1991 годзе ён упэўнена перамог на першых прэзідэнцкіх выбарах, пасля чаго даволі хутка пачаў губляць сваю папулярнасць.

| ДЫНАМІКА ЭЛЕКТАРАЛЬНАГА РЭЙТЫНГУ ЛУКАШЭНКІ З ВЕРАСНЯ 2008 г., % | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 09'08 | 12'08 | 03'09 | 06'09 | 09'09 | 12'09 | 03'10 | 06'10 |
| 42,5 | 40,2 | 39,2 | 40,9 | 39,4 | 42,5 | 42,7 | 45,6 |

Паводле НІСЭПД

Пераемнік Ельцына Пуцін увайшоў у вялікую палітыку неяк незаўважна. «*Молчалин на должности национального лидера*», — так ахарактарызаваў яго ў свой час сацыёлаг Леў Гудкоў. Узлёт папулярнасці Пуціна пачаўся ў верасні 1999 года пасля ўзрыву дамоў у Маскве, калі Уладзімір Уладзіміравіч прапанаваў мачыць тэрарыстаў у сарціры. З тых часоў прайшло больш за 10 гадоў. Калі б выбары прэзідэнта Расіі адбыліся ў чэрвені, то тройка лідэраў, паводле дадзеных Левада-Цэнтра, выглядала б наступным чынам: Пуцін — 37%, Мядзведзеў — 17% і Зюганаў — 6%.

Рэйтынг Пуціна сацыёлагі называюць «тэфлонавым». Да яго нічога «не прыліпае», г. зн. ад учынкаў Пуціна ён не залежыць. Адбываецца, да прыкладу, трагедыя з падводнай лодкай «Курск». Замест таго, каб выступіць са зваротам да нацыі, прэзідэнт знікае з экранаў тэлевізараў на некалькі дзён. У любой дэмакратычнай краіне такія паводзіны палітыка каштавалі б яму кар'еры, але рэйтынг Пуціна нават не завагаўся.

У агарод Ельцына камні сёння не кідае хіба што гультай. Ельцын — асноўная прычына ўсіх расійскіх бедаў. Мабыць, нават больш істотная, чым дрэнныя дарогі і дурні. Пуцін жа для рускіх ператварыўся ў «наша ўсё». І гэта прытым, што ўявіць былога кэдэбэшніка ў крытычную хвіліну на танку, на якім так натуральна падчас путчу глядзеўся Ельцын, немагчыма ў прынцыпе!

Але колькі б мы ні ўглядаліся ў палітычных танцораў, растлумачыць, зыходзячы з іх асабістых якасцяў, чаму першы апынуўся дрэнным, а другі ўсё яшчэ працягвае радаваць публіку, у нас не атрымаецца. Таму ад аналізу асоб пяройдзем да аналізу сітуацый, на фоне якіх танчылі свае сольныя партыі Ельцын і Пуцін.

Ельцын быў абраны прэзідэнтам у 1991 годзе, калі негатыўныя працэсы ў эканоміцы, звязаныя з развалам СССР, толькі набіралі абарот. Старая эканамічная сістэма ўжо не працавала, а новая яшчэ не сфармавалася. Каб атрымаць поўную карціну, варта дадаць нізкі кошт нафты, і тады непазбежнасць падзення ўзроўню жыцця насельніцтва стане асабліва відавочнай. Да канца 90-х гадоў этап пераходу ад савецкай планавай эканомікі да рынкавай быў завершаны. У Расіі пачаўся эканамічны рост. Але папулярнасці Ельцына ён дапамагчы ўжо не мог. Занадта вялікай была незадаволенасць насельніцтва, якое падманулася ў сваіх чаканнях. Крыніцай гэтых чаканняў быў Ельцын, яму ж давялося ўзяць на сябе і ролю «казла адпушчэння».

У адрозненне ад Ельцына, яго палітычны пратэжэ апынуўся ў патрэбны час у патрэбным месцы. У галовах абывацеляў імя другога прэзідэнта было звязана з ростам прыбыткаў і ўстаноўкай парадку ў Расіі з кален. Пра тое, які ўнёсак у гэта ўставанне зрабілі высокія кошты на нафту, абывацелі не думалі. У круг іх паўсядзённых абавязкаў аналіз макраэканамічных паказчыкаў не ўваходзіць.




## Унікальная асоба

Аднак перанясемся на родную зямлю, якая вось ужо семнаццаты год прыгажае пад кіраўніцтвам «адзінага беларускага палітыка». З рэйтынгам у яго праблем няма — у чэрвені нават падрос (глядзі табліцу).

У чым сакрэт палітычнага даўгалецця Лукашэнкі? На думку акадэміка Рубінава, яго варта шукаць ва ўнікальнай асобе кіраўніка дзяржавы. Цытую: «...наш прэзідэнт, які выйшаў з гушчы народа і арганічна ўвабраў у сябе яго патрэбы і надзеі, будуе сваю палітыку, адштурхваючыся ад зямлі, ад жыцця, а не ад якіх-небудзь тэарэтычных схем і абстрактных лагічных пабудоў. Менавіта гэта зберагае нас ад крайнасцяў, ад спакусы хуткіх і радыкальных рашэнняў, ад хуткаспелых рэформаў, забяспечваючы тым самым эвалюцыйнае, паступальнае развіццё грамадства без шоку і ўзрушэнняў».

Хай і не ў такіх вобразных выразах, але большасць незалежных аналітыкаў з тэорыяй унікальнай асобы згодныя. Яны любяць разважаць пра харызму, пра звышнатуральныя здольнасці, набыць якія праз навучанне нельга. Адсутнасцю харызматычнага лідэра тлумачыцца, дарэчы, асноўная прычына шматгадовых няўдач апазіцыі.

Я не адмаўляю, што ў Лукашэнкі ёсць пэўныя здольнасці, але на адной харызме далёка не паедзеш. Няўжо Ельцын не валодаў харызмай? А Гарбачоў? Спадзяюся, людзі старэйшага пакалення яшчэ памятаюць, як уся краіна замірала перад тэлевізарамі падчас выступу генсека. Толькі — у поўнай адпаведнасці са здагадкай Макса Вебера, аўтара паняцця «харызма», — такое захопленае замірание доўжылася нядоўга. Любая харызма патрабуе пацвярджэння практычнымі вынікамі.

Лукашэнка быў абраны прэзідэнтам на тры гады пазней за Ельцына. У кампактнай Беларусі, у адрозненне ад неабсяжнай Расіі, трансфармацыйныя працэсы да моманту яго абрання былі блізкія да завяршэння. Гэта не ён «запусціў заводы», а тысячы безыменных кіраўнікоў на месцах. Кінутыя не па сваёй волі ў бездань рынку, яны апынуліся перад дылемай: навучыцца плаваць або патануць. Большасць з іх плаваць навучылася, хай і не класічным рынкавым спосабам, а «па-сабачы». Безумоўна, такім стылем на міжнародныя рынкі не заплывеш, але дырэктарам дзяржпрадпрыемстваў гэтага і не патрэбна. Ім цалкам хапіла расійскага рынку, дзе мясцовыя плаўцы аддаюць перавагу аналагічнаму стылю.

Першым і другім не патануць дапамагла прыродная рэнта. Рускім — свая, беларусам — расійская. Нагадаем, што з моманту здабыцця незалежнасці аб'ем расійскіх прэферэнцый для Беларусі ў выглядзе льготных коштаў на сыравінныя рэсурсы перавысіў 50 мільярдаў долараў. Без гэтай «зеляніны» ад харызмы Лукашэнкі мала б што засталося.

## У заганным крузе

І на заканчэнне звернем свой погляд на апазіцыйных танцораў. Іх нязадольнасць уплываць на працэсы, што адбываюцца ў рэспубліцы, відавочная. Але што ім замінае? У рамках выкладзенай вышэй тэорыі прапаную звярнуць увагу не на саміх танцораў, а на грамадства. І тут нас чакае сюрпрыз, таму што грамадства ў сучасным разуменні ў нас няма. У нас — насельніцтва.

Грамадства, калі звярнуцца да падручніка сацыялогіі, — гэта сістэмы «ўстойлівых сувязяў, заснаваных на салідарнасці, узаемных каштоўнасцях, пачуцці далучанасці і ўзаемных інтарэсах». Пры жаданні ўсе пералічаныя кампаненты ў нас можна адшукаць, аднак у колькасцях, недастатковых для стварэння якасці, што адпавядае заходнім стандартам.

Возьмем, напрыклад, інтарэсы. Яны ў беларусаў ёсць, вось толькі не ўзаемныя. Адсюль папулярнасць асабістых сувязяў (блату). Калі ў беларуса ўзнікаюць праблемы, то ён не шукае таварышаў па няшчасці, каб з імі аб'яднацца. Ён шукае выхад на патрэбнага чыноўніка. Калі з пошукам такога ўзнікаюць праблемы, то беларус піша скаргу.

Такая тэхналогія рэалізацыі асабістых інтарэсаў дапамагае прыстасавацца да сітуацыі, якая задаецца, як правіла, дзяржавай, але не змяніць яе. Для змянення сітуацыі неабходныя салідарнасць і пэўны ўзровень даверу адно да аднаго. Аднак давер можа паўстаць толькі падчас адстойвання ўзаемных інтарэсаў. Так узнікае заганны круг.

Са свайго боку Улада прымае мэтанакіраваныя высілкі, каб гэты заганны круг не разарваўся. Самы эфектыўны сродак — стварэнне перашкод для функцыянавання структур грамадзянскай супольнасці. Бо апошнія для таго і ствараюцца грамадзянамі, каб фармаваць і абараняць узаемныя інтарэсы.

Усяляк ухваляецца і падача скарг, але толькі індывідуальных. Магчыма, чытачы «НЧ» не чулі, але з чэрвеня сіламі Адміністрацыі прэзідэнта праводзіцца маштабная праверка працы мясцовых уладаў з насельніцтвам. У рамках праверкі чыноўнікі адміністрацыі выязджаюць на месцы, дзе праводзяць прыём грамадзян па асабістых пытаннях.

Праца са скаргамі — важны элемент нацыянальнага варыянту дэмакратыі. Праілюструю цытатай з «СБ»: «Можна колькі заўгодна размаўляць пра «дэмакратыю», але галоўнай прыкметай дэмакратыі з'яўляецца ўсё ж здольнасць улады адэкватна і сумленна рэагаваць на патрэбы і запыты грамадзян. У канчатковым рахунку ў тых, хто каментуе сацыяльную палітыку ў Беларусі, здзіўленне выклікае зусім не «чысціня вуліц», а тое, што калі сярэдністатыстычны беларус звяртаецца з матываванай просьбай у дзяржаўны орган, мясцовую ўладу, рэдакцыю СМІ, то да яго звароту абавязаныя паставіцца з усёй адказнасцю і грунтоўнасцю».

Выдатнае прызнанне. У дзяцінстве мяне вучылі, што слова «дэмакратыя» азначае «ўлада народа». Беларускі ж варыянт дэмакратыі прадугледжвае аддзяленне народа ад улады — гэтак жа, як мух аддзяляюць ад катлет. Максімум, што дазволена народу, гэта звяртацца ў дзяржаўныя органы з матываванымі просьбамі, чым народ актыўна і займаецца.

Вось на фоне такіх знешніх акалічнасцяў і спрабуюць апазіцыйныя танцоры выканаць свой пераможны танец. Справа за шаноўнай публікай, за яе жаданнем сабраца на плошчы і паапладзіраваць.

КРУГЛЫ СТОЛ

# СМІ І ПАЛІТЫКІ ПЕРАД ВЫБАРАМІ

Генадзь КЕСНЕР

**Мінулым тыднем у Мінску прайшоў круглы стол «Сітуацыя ў медыяпрасторы Беларусі напярэдадні прэзідэнцкай кампаніі: рэаліі і перспектывы», зладжаны Аналітычным цэнтрам «Стратэгія» і Нацыянальным камітэтам Аб'яднаных дэмакратычных сілаў (АДС). У дыскусіі прымалі ўдзел кіраўнікі ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў», вядомыя беларускія палітыкі, прадстаўнікі грамадскіх аб'яднанняў, праваабаронцы.**



Мадэратар круглага стала Анатоль Лябедзька



Старшыня БАЖ Жанна Літвіна



Журналісты Аляксандр Коктыш, Аляксандр Класкоўскі, Аляксандр Фядута

Адзін з мадэратараў «круглага стала», сустаршыня прэзідыума Палітсавета АДС Анатоль Лябедзька адзначыў, што «сёння сітуацыя ў беларускай медыйнай прасторы надзвычай складаная».

«З іншага боку, мы стаім напярэдадні прэзідэнцкай кампаніі, і ёсць агульная цікавасць да таго, якія будуць інфармацыйныя плыні, якія магчымасці інфармацыі падчас кампаніі. Гэта інтарэс усіх палітычных груп у Беларусі, — падкрэсліў старшыня Аб'яднанай грамадзянскай партыі. — Да таго ж, мы адчуваем, што да гэтай праблемы ёсць няштучная цікавасць з боку саміх журналістаў, у якіх умовах яны будуць працаваць. Гэта больш чым актуальна. І гэта дадатковая цікавасць да тэмы з боку праваабаронцаў… Таму галоўная задача, якую мы перад сабой ставім, — паспрабаваць, каб гэтыя тры групы (палітычная, журналісцкая і праваабарончая) абмеркавалі, якая сёння склалася сітуацыя ў масмедыя, каб мы зрабілі прагноз, чаго можна чакаць падчас прэзідэнцкай кампаніі, і самае галоўнае, каб мы напрацавалі план канкрэтных супольных дзеянняў».

Як адзначыла ў сваім выступе старшыня ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў» (БАЖ) Жанна Літвіна, на сённяшні дзень незалежныя журналісты змаглі сфармуляваць сваё месца і ролю ў выбарчай кампаніі. «У першую чаргу, мы абавязаны даць інфармацыю выбаршчыкам, каб людзі, калі апынуцца на выбарчых участках, маглі рабіць свядомы выбар. Мы абавязаны стаць форумам, пляцоўкай, платформай для палітычнай канкурэнцыі, для абмеркавання праграмаў, з якімі ідуць на выбары прадстаўнікі розных плыняў грамадства, — падкрэсліла кіраўнік БАЖ. — Мы павінны даваць больш шырокую інфармацыю, якая адрозніваецца ад чыстай прапаганды. І самае галоўнае — мы папросту абавязаныя выкарыстаць гэту выбарчую кампанію для наладжвання дыялогу ўнутры краіны».

Па словах Жанны Літвіной, беларуская незалежная журналістыка мае багаты досвед, звязаны з выбарчымі кампаніямі: «2001 год. Мы падыходзілі да выбарчай кампаніі, маючы больш за 50 незалежных грамадска-палітычных выданняў. Пасля той выбарчай кампаніі агульная колькасць гэтых выданняў за два гады скарацілася ў два разы. Па-другое, у дачыненні да незалежных журналістаў — гэта Віктар Івашкевіч, у той час галоўны рэдактар газеты «Рабочы», а таксама Мікалай Маркевіч і Павел Мажэйка з гродзенскай газеты «Пагоня» — былі прыменены артыкулы Крымінальнага кодэкса, у выніку чаго гэтыя нашы калегі былі пакараныя абмежаваннем волі. Выбарчая кампанія 2006 года — зноў тыя ўнушальныя страты, якія немагчыма аднавіць. Напярэдадні той кампаніі з сістэмы распаўсюду былі выкінутыя 19 газет, з якімі ў аднабаковым парадку былі скасаваны дамовы на распаўсюд».

Адным з асноўных момантаў круглага стала было абмеркаванне стасункаў паміж СМІ і палітыкамі. «У прэсы і ў палітыкаў розныя інтарэсы, — падкрэсліла старшыня БАЖ. — Падчас выбарчых кампаніяў гэтыя інтарэсы часткова супадаюць у некаторых момантах, але мы вельмі розныя. Партыі ідуць да ўлады, ім важна абнавіць палітычную сістэму і ў дадзеным выпадку мець доступ да дзяржаўных СМІ. І на гэтым шляху палітычным лідэрам патрэбны станоўчы, пазітыўны імідж, вобраз і гэтак далей. І тут пачынаецца першая зона непаразуменняў. Журналісты не абавязаны абслугоўваць палітычных лідэраў, канкрэтныя рухі».

Жанна Літвіна выступіла з патрабаваннем, каб у выбарчых праграмах дэмакратычных кандыдатаў абавязкова быў пункт з патрабаваннем рэфармавання медыясферы.

Па словах старшыні БАЖ, сёння вельмі патрэбная стратэгія ўзаемадзеяння. «Адзін з вельмі важных накірункаў гэтай стратэгіі — праца прэс-службаў… Неабходна таксама мець агульную праграму бяспекі… Супольным жа нашым інтарэсам з'яўляецца наладжванне дыялогу ўнутры краіны», — падкрэсліла Жанна Літвіна.

Паводле словаў сябры Праўлення БАЖ Аляксандра Коктыша, усведамляючы рознасць інтарэсаў журналістаў і палітыкаў, журналісцкая супольнасць, тым не менш, не адмаўляецца ад падтрымкі палітычных партыяў, рухаў і кааліцый. Аляксандр Коктыш прапанаваў ад імя БАЖ аказаць дапамогу прэс-службам партыяў, навучыць іх працы з журналістамі і сродкамі масавай інфармацыі, балазе пэўны досвед у гэтай галіне Беларуская асацыяцыя журналістаў ужо мае.

Да таго ж, Аляксандр Коктыш падаў ідэю стварэння палітыка-журналісцкага дыскусійнага клуба, і гэта ідэя знайшла падтрымку ў прысутных.

Свае меркаванні наконт сітуацыі ў медыя-прасторы Беларусі выказалі старшыня РПГА «Беларускі Хельсінскі камітэт» Алег Гулак, праваабаронцы Алена Танкачова і Сяргей Сыс, а таксама прадстаўнікі розных палітычных партыяў, журналісты. Пры канцы мерапрыемства было прынята рашэнне ў рабочым парадку стварыць групу з палітыкаў, журналістаў і праваабаронцаў, якая б падсумавала вынікі сустрэчы і афарміла іх для прадстаўлення шырокай грамадскасці.

ПОГЛЯД

# ПАДРЫХТОЎКА ДА ВЫБАРЧАЙ КАМПАНІІ

Вольга ХВОІН

**Пад шум інфармацыйнай вайны з Расіяй Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ аб скліканні 7 верасня пятай пазачарговай сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу. Эксперты мяркуюць, што на пасяджэнні парламентарыі могуць зацвердзіць дату чарговых прэзідэнцкіх выбараў.**

У парадку дня пазачарговай сесіі пяць пунктаў: «Аб рэспубліканскім бюджэце на 2011 год» і «Аб бюджэце дзяржаўнага пазабюджэтнага Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь на 2011 год», папраўкі ў Падатковы і Бюджэтны кодэксы. Таксама на сесіі могуць быць разгледжаныя «іншыя пытанні», пад якія і можа патрапіць прызначэнне прэзідэнцкіх выбараў.

Сакратар ЦВК Мікалай Лазавік сказаў, што ніякіх навінаў пра тэрмін правядзення выбараў няма. Максімальна позняй датай правядзення выбараў з'яўляецца 6 лютага 2011 года. Але магчымы і больш ранні тэрмін — напрыклад, канец гэтага года. Эксперты мяркуюць, што тое найбольш выгодна для дзеючага кіраўніцтва, у тым ліку з гледзішча расійска-беларускіх адносін.

Дзеючы кіраўнік Беларусі Аляксандр Лукашэнка відавочна ўжо рыхтуе сабе перадвыбарчую глебу. Так, ён падпісаў указ аб павелічэнні працоўных пенсій (пенсіянеры — ці не асноўны электарат Лукашэнкі). Ужо ў жніўні памер усіх відаў працоўных пенсій у Беларусі вырасце на 12,5%. Такім чынам, сярэдняя пенсія павялічыцца на 58 600 рублёў і складзе 528,3 тысячы рублёў.

Лукашэнка таксама паабяцаў палепшыць дабрабыт настаўнікаў, лекараў, вяскоўцаў. Падчас паездкі па Гомельскай вобласці кіраўнік Беларусі заявіў, што заробак гэтых катэгорыяў працаўнікоў у наступным годзе мусіць вырасці ўдвая, а сярэдні заробак па краіне да канца года складзе 500 долараў у эквіваленце. «Я нават не думаю аб тым, што мы можам 10–20 долараў не дацягнуць. Пастаўленая задача, і мы павінны яе дасягнуць, — зазначыў кіраўнік дзяржавы. — Настаўнікаў, лекараў, нянечак, выхавацеляў у дзіцячым садку трэба «падцягваць». І калі мы ў наступным годзе ў два разы павялічым ім заробак, і вырасце сярэдні заробак па краіне, тады ў людзей і настрой будзе лепшы».

Палітолаг Андрэй Ляховіч мяркуе, ёсць вялікая верагоднасць таго, што на вераснёўскім пазачарговым пасяджэнні парламенту будзе прызначана дата выбараў. Разам з тым эксперт зазначае: паводле геапалітычнай сітуацыі няма падстаў думаць, што Расія будзе вылучаць свайго кандыдата на наступных прэзідэнцкіх выбарах у Беларусі.

«У Расіі пераканаліся, што любыя траты, фінансавая падтрымка не прывядуць да магчымасці паўплываць на сітуацыю. Банальна ствараецца інтрыга непрызнання нашых выбараў Расіяй, — разважае Андрэй Ляховіч. — І інфармацыйная вайна з боку Расіі — гэта толькі сігнал, што яна можа не прызнаць прэзідэнцкія выбары. Дастаткова праанілізаваць словы расійскіх палітыкаў. Але думаю, што такім чынам ладзіцца шантаж Лукашэнкі. Насамрэч у Расіі няма выбару, бо іншы чалавек з верагодных сёння кандыдатаў на пасаду кіраўніка дзяржавы яшчэ менш адпавядае расійскім нацыянальным інтарэсам. У Маскве разумеюць, што альтэрнатыўны палітык можа зрабіць больш крокаў да паляпшэння адносінаў з Захадам, а гэта значна большая пагроза для Расіі, чым Лукашэнка з антырасійскімі тэзамі. Ён выглядае цяпер як найменшае зло».

Палітолаг гаворыць, інфармацыйная вайна — гэта нацягнутая гульня з боку Расіі, якая грунтуецца на спадзеве, што Лукашэнка раптам усё ж не вытрымае ціску ды здасць пазіцыі. А войны (цукровыя, малочныя, газавыя, інфармацыйныя) Беларусі з Расіяй цяпер — з'ява сталая і зразумелая, а аргументы (спыніць транзіт, супрацоўніцтва ў галіне СПА, вывесці ваенныя расійскія базы з нашай тэрыторыі ды іншае) — прадказальныя.

Рэальныя ж інструменты ўціску на Лукашэнку з'явяцца пасля заканчэння будаўніцтва нафта- і газаправодаў у абыход Беларусі, што адбудзецца пасля бліжэйшых прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі. «Выбары будуць прызначаныя ў кантэксце гульні з Захадам, манеўру, які мае на мэце палепшыць адносіны з Захадам. Лукашэнка хоча, каб выбары прайшлі ціха, ён зацікаўлены, каб для кантролю за сітуацыяй не трэба было прымяняць сілу. Думаю, што выбары прызначаць на 7 лютага, тады значная частка кампаніі будзе прыходзіцца на навагоднія святы і апазіцыйным кандыдатам будзе цяжка мабілізаваць людзей да працы. Таму гэтая дата найбольш зручная», — падагульняе Ляховіч.

Праўда, ёсць і альтэрнатыўныя меркаванні: рэжыму Лукашэнкі найбольш выгодна праводзіць выбары напрыканцы бягучага года, што абумоўлена фінансавым станам у краіне, абяцанкамі павялічыць заробкі (але не забываем, што грошай у бюджэце аб'ектыўна цяпер малавата для стварэння доўгатэрміновай ілюзіі стабільнага і забяспечанага жыцця), ды пакуль дзейсным кантрактам на пастаўку расійскага газу. Бо чарговыя газавыя войны з Расіяй усё ж не граюць на руку палітыку.

▸ РОЗДУМ

# ПАМЫЛКА РОЯ МЯДЗВЕДЗЕВА

Канстанцін СКУРАТОВІЧ

**Апошнім часам Аляксандр Лукашэнка ўсё часцей прымярае на сябе ролю мудрага і адначасова прагматычнага палітычнага дзеяча. Сапраўднага гаспадара зямлі беларускай.**




Імідж руплівца за народнае дабро Лукашэнка пачаў ствараць з дапамогай БТ з першага дня свайго існавання ва ўладзе. І пры гэтым кожная прыдатная акалічнасць выкарыстоўвалася яго іміджмэйкерамі для замацавання гэтага ўражання сярод народа. Узяць хоць бы прыдуманы студэнтамі анекдот, як прэзідэнт па тэлефоне бульбу перабіраў. І смешна, і пазітыўна.

Такія, як кажуць зараз, мэсіджы асабліва ўздзейнічаюць на людзей не надта дасведчаных, але часам кранаюць за душу нават вядомых і прынцыповых іншадумцаў. Прыкладам, усім добра вядомага Роя Мядзведзева. Яго кампліментарныя Лукашэнку высновы ахвотна цытуюцца беларускімі СМІ. Літаральна гэтымі днямі БелТА паведаміла з прэс-канферэнцыі, якую вядомы расійскі гісторык даў Маскве: «Беларусь з'яўляецца краінай, якая па ўсіх эканамічных паказчыках займае першыя месцы ў СНД. Яна першая, пачынаючы з узроўню прадукцыйнасці працы і завяршаючы сельскай гаспадаркай».

Мядзведзеў, як бачым, застаўся сацыялістам па сваіх меркаваннях і дысідэнтам па паводзінах. Бо як, як паведамляе БелТА, высока ацэньвае факт захавання Беларуссю савецкай эканамічнай спадчыны, якая не была разбурана, а, наадварот, істотна ўмацавана. І таму, па яго дадзеных, у Беларусі рэальны сектар эканомікі на 80 працэнтаў перавышае паказчыкі 1990 года, у той час як Расія да гэтага часу не дасягнула ўзроўню 1990 года. Увогуле, усе паказчыкі ў Беларусі, на здзіўленне, лепшыя, чым у Расіі.

Мы ж адзначым, што дадзеныя, на якія спасылаецца паважаны гісторык, не яго, не здабытыя коштам уласнага навуковага аналізу, а ўзятыя з дадзеных афіцыйнай беларускай статыстыкі. Што тычыцца высноў, то яны, мусіць, належаць самому Мядзведзеву, слыннаму гісторыку, але недасведчанаму эканамісту.

Беларусы кажуць: возьмеш у рукі — рэч маеш. А спадар Мядзведзеў не звярнуў ніякай увагі на тое, што сярэдні заробак у Беларусі склаў па выніках мінулага года 351 долар, а ў Расіі — 630 долараў. І гэта пры тым, што паказчык сярэдняга заробку для такой агромністай па тэрыторыі, насельніцтву, рэгіянальных, прыродных, культурных ды эканамічных асаблівасцях краіны, якой ёсць Расія, з'яўляецца паняццем у вышэйшай ступені абстрактным. Да таго ж, на думку Мядзведзева, Расія — эканамічна адсталая ў параўнанні з Беларуссю краіна. Таму нашы сярэднія заробкі трэба параўноўваць з тымі адносна кампактнымі расійскім рэгіёнамі, якія па эканамічнаму ўзроўню больш-менш адпавядаць дасягнутаму Беларуссю. Гэта, мусіць, Маскоўская ды Ленінградская вобласці, калі ж гаворка пра Мінск — то тыя ж Масква і Пецярбург. З нафтагаззаздабываючымі правінцыямі Цюменню і Сургутам параўноўваць не будзем, бо на думку Роя Аляксандравіча, яны ў прамысловым сэнсе з'яўляюцца недаразвітымі.

Тое ж самае робіць і Белстат. Прыкладам, ён бесперапынна «маніторыць» кошты харчовых тавараў у Маскве і Мінску, але ніколі не параўноўвае заробкі.

Масква, зразумела, пры ўсіх сваіх дасягненнях значна далей ад Парыжу і значна бліжэй да якога-небудзь Лагоса, але ўжо даўно сярэдні заробак гараджан перавысіў 1000 долараў. Мінгарвыканкам толькі днямі рапартаваў, што ў беларускай сталіцы ўдалося выйсці на заробак у 500 долараў, які Лукашэнка абяцаў да канца года выплачваць па ўсёй краіне. Калі будуць грошы, ён, безумоўна, так і зробіць. А грошы будуць, калі хто-небудзь дасць пазыку, бо сама беларуская эканоміка зарабляць іх у такой колькасці, каб усім хапала, не можа.

Магчыма, з гэтай высновай хтосьці не пагодзіцца, таму патлумачым. Рой Мядзведзеў сказаў, і гэта вельмі спадабалася прыхільнікам рэжыму, што Беларусь сёння (трэба разумець, і раней) з'яўляецца эканамічным лідэрам СНД. Але ж межамі гэтага палітычнага наватварэння ўсё лідэрства і абмяжоўваецца. Таму на зробленую ў Беларусі (адносна якасную, адносна танную і г.д. прадукцыю, акрамя прадуктаў нафтаперапрацоўкі) прамысловую прадукцыю можна знайсці пакупнікоў толькі ў гэтым самым СНД. І хоць не факт, што яны знойдуцца ў дастатковай колькасці, але відавочна, што з кожным годам іх становіцца меней. Бо якой бы таннай ні была беларуская прадукцыя, ёй наканавана быць даражэйшай за кітайскую, а што тычыцца адносна лепшай якасці, то яна ўжо нават у параўнанні з кітайскай часцяком выглядае малаякаснай.

А эканомікі ў Расіі, Казахстане ды іншых былых суседзяў па савецкай камуналцы капіталістычныя. Урады гэтых краін не захочуць (а галоўнае — не змогуць) змусіць прыватных пакупнікоў ды фірмы купляць беларускае на той падставе, што нейкі там расійскі гісторык высока цэніць стан беларускай эканомікі.

Іншая справа, калі б аднавіўся Савецкі Саюз, калі б усталяваўся адзіны цэнтральны ўрад, ён бы аднавіў дзяржаўную манаполію і прымусіў усіх спажываць выключна толькі сваё.

Што б сказала жонка мужу, калі б ён дзень і ноч круціўся на працы, а дадому вяртаўся з пустымі кішэнямі, здагадацца проста. Такая, на жаль, пабытавая сітуацыя стала звычайнай для ўсёй беларускай эканомікі з лета 1994 года. А зараз яна яшчэ пагоршылася. Як сведчаць дадзеныя Белстата, у першым квартале 2010 года — у параўнанні з мінулым (крызісным!) — выдаткі на вытворчасць у бягучых цэнах павысіліся амаль на чвэрць. Пры гэтым больш за ўсё павысіліся матэрыяльныя выдаткі, тэмп росту якіх адпавядаў тэмпу росту коштаў паліва і энергіі, але кошты сыравіны і камплектуючых павялічваліся яшчэ хутчэй.

У выніку ў росце адставалі сацыяльныя артыкулы — выдаткі на аплату працы і адлічэнні на сацыяльныя патрэбы. Праўда, падвышэнне рэальных заробкаў статыстка зафіксавала, але яе ўдзельная вага ў структуры сабекошту вытворчасці зменшылася з 15,5% да 14,1%.

Такім чынам, грошай на падвышэнне заробкаў няма.

Што можа быць горай? Горай можа быць тое, што ўзровень залежнасці беларускай эканомікі ад пастаўшчыкоў сыравіны і камплектуючых яшчэ больш павялічыўся. Удзельная вага імпартнай сыравіны ў вытворчых выдатках прамысловасці павысілася з 32,4% да 41,6% (у матэрыяльных выдатках — з 43,7% да 54,5%).

Адначасова выдаткі на 1000 выробленай прадукцыі павялічыліся з 914 да 926 рублёў. Вось гэтыя 74 рублі з кожнай выробленай тысячы і ёсць новая вартасць, якую ствярае беларуская прамысловасць. А ў сельскай гаспадарцы ўвогуле на 1000 рублёў валавой прадукцыі выпадае 1171 рубель выдаткаў.

Такім чынам, кожны вучань чацвёртага класа, ведаючы памеры валавой вытворчасці, зможа вызначыць суму страт, якую прыносіць Беларусі яе сельская гаспадарка. Каб іх пакрыць, трэба браць грошы ад прамысловасці, а на рахунку прадпрыемстваў хоць шарам пакаці.

Добры ж вучань заўважыць, што велічыня агульных эканамічных страт Беларусі наўпрост залежыць ад памераў гаспадарчай дзейнасці. А гэта сведчыць не столькі пра росквіт эканомікі, колькі пра яе фактычнае банкрутва.

▸ ФІНАНСЫ

# АДКУЛЬ БРАЦЬ ГРОШЫ?

**Нацбанк можа ўключыць друкарскі станок, каб пагасіць кароткатэрміновыя абавязацельствы перад крэдыторамі. Такое меркаванне выказаў эканаміст Яраслаў Раманчук.**

Паводле яго слоў, кароткатэрміновыя абавязацельствы Беларусі, куды ўваходзяць даўгі дзяржавы, банкаў, прадпрыемстваў, сёлета, паводле звестак Сусветнага банка, складаюць 9,9 мільярда долараў.

«У мінулым годзе памер абавязацельстваў быў ніжэйшы. Але летась ён быў закрыты з дапамогай знешніх пазычанняў. Сёлета пакуль незразумела, адкуль браць грошы. Так, банкі штосьці возьмуць, прадпрыемствы, але дэфіцыт складзе каля 7 мільярдаў долараў», — адзначаў Раманчук.

Эканаміст заявіў, што ўжо ў чэрвені рэзка павялічыліся тэмпы росту грашовай масы. «У чэрвені мы назіралі тое, што было восенню мінулага года. Цяпер з'явілася неабходнасць дадрукоўваць грошы», — сказаў Раманчук.

Яшчэ адным варыянтам закрыцця «дзіркі» па кароткатэрміновых абавязацельствах можа стаць продаж «Беларуськалія». «Думаю, улады будуць спрабаваць рэалізаваць абодва варыянты — і прадаць гэтае прадпрыемства, і надрукаваць грошай. Таму што адно толькі ўключэнне друкарскага станка прывядзе да падзення курсу рубля і скачка інфляцыі», — адзначыў эканаміст.

Таксама Раманчук мяркуе, што запланаваны сталічнымі ўладамі вынас магутнасцяў шэрагу прамысловых прадпрыемстваў прадыктаваны жаданнем чыноўнікаў «прыхватызаваць» вызваленую ўласнасць. «Я на 90% упэўнены, што прычына ў гэтым», — заявіў ён.

Раманчук адзначыў, што летась не было адмашкі зверху на прыватызацыю і лібералізацыю. «Але цяпер гэтыя працэсы набралі ход, і чыноўнікам, у якіх ёсць дастаткова капітал, трэба варушыцца, каб выгадна ўкласці сродкі. Лепш за ўсё «прыхватызаваць» уласнасць, якая будзе штомесяц прыносіць 50–100 тысяч долараў даходу», — лічыць эксперт.

А тым часам Нацбанк разлічвае да канца года ўтрымаць курс валютнага кошыка ў калідоры плюс-мінус 2–3% Пра гэта заявіў старшыня праўлення Нацбанка Пётр Пракаповіч 19 ліпеня падчас даклада Аляксандру Лукашэнку аб выкананні Асноўных кірункаў грашова-крэдытнай палітыкі ў першым паўгоддзі 2010 года.

«Як быў праінфармаваны прэзідэнт, усе задачы, пастаўленыя Асноўнымі кірункамі грашова-крэдытнай палітыкі, у першым паўгоддзі забяспечаны ў поўным аб'ёме», — гаворыцца ў паведамленні прэс-службы беларускага кіраўніка.

Як заявіў Пракаповіч, у банкаўскай сістэме ёсць усе неабходныя рэсурсы, каб забяспечыць далейшае крэдытаванне эканомікі. За шэсць месяцаў працэнтныя стаўкі па крэдытах зніжаныя для юрыдычных асоб больш чым на 5 працэнтных пунктаў. Пракаповіч падкрэсліў, што «работа па зніжэнні працэнтных ставак будзе працягвацца ў трэцім і чацвёртым кварталах».

Старшыня Нацбанка выказаў надзею, што ў найбліжэйшы час «узрасце актыўнасць прадпрыемстваў, якія стануць больш прад'яўляць эфектыўных праектаў, і крэдытаванне ў другім паўгоддзі будзе ісці больш хуткімі тэмпамі, чым у першым».

**Паводле БелаПАН**

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



## 28 ЛІПЕНЯ, СЕРАДА

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтарэсаў.
**09.05** Камедыйны серыял «Участак».
**10.00** Серыял «Заўсёды кажы «заўсёды»-3».
**10.50** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**11.40** Відэафільм АТН «Глыбоччына» цыкла «Зямля беларуская».
**12.10** Любоўная драма «Кіпень» (Расія).
**14.10** Дак. фільм «Іван Васільевіч змяняе прафесію». Невядомая версія» (Украіна).
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** VII Нацыянальны фэст беларускіх фільмаў (г. Брэст).
**16.15** Моладзевы серыял «Маладыя і шчаслівыя» (Расія). 3-я серыя.
**17.05** Серыял «Заўсёды кажы «заўсёды»-3».
**17.55** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**18.50, 00.45** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.25** «Спортлата 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**19.30** «КЕНА».
**19.35** «Зямельнае пытанне».
**20.00** Камедыйны серыял «Участак».
**21.00** Панарама.
**21.50** «Новая хваля-2010». Дзённік.
**22.00** «Новая хваля-2010». Адкрыццё конкурсу.
**00.50** Дзень спорту.

**06.00, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**10.00** «Выклік-4». Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Мае сябры. Тыгруля і Віні».
**11.30** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**12.00** «Малахаў +».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.45** «Кантрольны закуп».
**15.30** «Хачу ведаць» з Міхаілам Шырвіндтам.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальнае кальцо». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Хай кажуць» з Андрэем Малахавым.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Ермолавы». Шматсерыйны фільм.
**22.10** Прэм'ера. «Выклік-4». Шматсерыйны фільм. Заключная серыя.
**23.10** Нашы навіны.
**23.25** Навіны спорту.
**23.30** Прэм'ера. Фільм Эдварда Радзінскага «Прарок і нячысцікі». 3-я серыя.
**00.25** «Размаўляючая са зданямі».
**01.10** Нашы навіны.
**01.25** Навіны спорту.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавела.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Мачаха». Серыял.
**13.50** «Дэтэктыўныя гісторыі».
**14.40** «Next 2». Серыял.
**15.35** «Черкізона. Аднаразовыя людзі» Серыял.
**16.50** «Новыя вандраванні дылетанта».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Мачаха». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Прэм'ера! «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**21.30** Прэм'ера! «Черкізона. Аднаразовыя людзі» Серыял.
**22.55** «Калі ласка, скардзіцеся».
**23.20** «Брыгада». Серыял.

**07.00** Добрая раніца.
**08.00** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**08.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.30** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.30** Дэтэктыў «Той, хто памнажае смутак» (Расія). 2-я серыя.
**11.30** Спорт-кадр.
**12.00** Прыгодніцкі фільм «Бронзавая птушка» («Беларусьфільм»). 2-я серыя.
**13.05** Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**13.50** Серыял «Пакахай мяне зноў».
**14.50** Пазакласная гадзіна.
**15.00** Простыя практыкаванні з Ю.Афанасьевым (Расія).
**15.35** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**16.20** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.20** Медычныя таямніцы з доктарам А.Цярэшчанкам.
**17.55** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**18.55** Футбол. Ліга чэмпіёнаў. 3-і адборачны раўнд. Прамая трансляцыя.
**21.00** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы. Дзень 2-і.
**00.00** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**00.30** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**10.10** «Гарэм». Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.30** «Тэрыторыя прыгажосці». Тэлесерыял.
**12.25** Алена Якаўлева ў тэлесерыяле «Каменская».
**13.20** «Кулагін і партнёры».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Аб самім галоўным». Ток-шоў.
**15.20** Мастацкі фільм «Ісаеў».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.15** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Прэм'ера. «Карменіта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**20.30** Тэлевізійны мастацкі фільм «Ісаеў».
**22.20** Тэлесерыял «Дворык».
**22.55** Алена Якаўлева ў тэлесерыяле «Каменская».
**23.50** Навіны - Беларусь.
**00.00** «Весткі.ru».
**00.15** «Гала-канцэрт «Гукавая дарожка «МК».

### НТВ

**07.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.25** Сёння.
**07.05** Інфармацыйны канал «Сёння раніцай».
**08.25** Вострасюжэтны серыял «Таксіст».
**09.15** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**10.20** «Дачны адказ».
**11.20** «Следства вялі…».
**12.05** Серыял «Крымінальнае відэа».
**13.30** Крымінальны дэтэктыў «Мужы».
**15.05** «Прафесія-рэпарцёр».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Прэм'ера. Вострасюжэтны серыял «Сталіца граху».
**21.35** Максім Аверын і Дзяніс Ражкоў у дэтэктыўным серыяле «Глушэц».
**23.50** Моладзевы серыял «Школа».
**00.20** «Масквічы».

### EUROSPORT

**09.00** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы. Барселона (Іспанія). Дзень 2.
**14.15** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы. Барселона (Іспанія). Дзень 1.
**15.30** Футбол. Чэмпіянат Еўропы да 19 гадоў. Францыя. 1/2 фіналу.
**16.30** Футбол. Чэмпіянат Еўропы да 19 гадоў. Францыя. 1/2 фіналу.
**17.20** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**17.30** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы. Барселона (Іспанія). Дзень 1.
**19.00** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы. Барселона (Іспанія). Дзень 2.
**23.30** Лёгкая атлетыка. Фотафініш. Барселона (Іспанія). Часопіс.
**00.00** Футбол. Чэмпіянат Еўропы да 19 гадоў. Францыя. 1/2 фіналу.
**01.00** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы. Барселона (Іспанія). Дзень 2.
**02.00** Лёгкая атлетыка. Фотафініш. Барселона (Іспанія). Часопіс.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** Праект «Будучыня».
**07.50** Госць «Белсату»: Алесь Белакоз, ч. 1 «Для Беларусі ніколі не было спрыяльных часоў».
**08.05** Дакументальная гадзіна: «Легенда Грунвальду», дак. фільм, 2010 г., Польшча.
**09.00** «Апошні сезон», серыял: 7 серыя.
**09.55** «Папялушка», тэлесерыял: 34 серыя.
**10.20** Жаўтуха (сатырычная праграма).
**10.50** «Не кажы маме, што нянька памерла» 1991 г., ЗША.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Папялушка», тэлесерыял: 35 серыя.
**17.30** «Апошні сезон», серыял: 7 серыя.
**18.30** Невядомая Беларусь: «Распавяду вам пра вайну», дак. фільм, Беларусь.
**19.15** Героі не нашага часу: Сяргей Картэс: Аўтаномія асобы.
**19.35** «Надзвычай прыгодніцкія падарожжы Цюхці», мультсерыял.
**19.45** На колах (паўтор).
**20.15** Прыватная калекцыя (паўтор).
**20.30** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**20.40** Побач з намі (тэлечасопіс) (паўтор.)
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** «Ніжэй за лінію Казярога, маст. фільм.
**23.00** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма).
**23.10** Аб'ектыў (паўтор).

## 29 ЛІПЕНЯ, ЧАЦВЕР

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** «Зямельнае пытанне».
**09.05** Камедыйны серыял «Участак».
**10.05** Серыял «Заўсёды кажы «заўсёды»-3».
**10.55** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**11.35** «OFF STAGE LIFE» з Веранікай Гардзіеўскай.
**12.10** Дэтэктыўная меладрама «Кахаю цябе да смерці» (Украіна).
**13.50** Дакументальны цыкл «Фартыфікацыя» (Беларусь).
**14.30** Хранікальна-дакументальны цыкл «Гарачыя кропкі» (Беларусь).
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Уласны персанаж.
**16.10** Моладзевы серыял «Маладыя і шчаслівыя» (Расія). 4-я серыя.
**17.05** Серыял «Заўсёды кажы «заўсёды»-3».
**17.55** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**18.50, 00.45** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.25** «КЕНА».
**19.30** Сфера інтарэсаў.
**19.55** Камедыйны серыял «Участак».
**21.00** Панарама.
**21.35** «Актуальнае інтэрв'ю».
**21.50** «Новая хваля-2010». Дзённік.
**22.00** «Новая хваля-2010». Конкурс. Дзень першы.
**00.50** Дзень спорту.

**06.00, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**10.00** «Выклік-4». Шматсерыйны фільм. Заключная серыя.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Мае сябры. Тыгруля і Віні».
**11.30** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**12.00** «Малахаў +».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.45** «Кантрольны закуп».
**15.30** «Хачу ведаць» з Міхаілам Шырвіндтам.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальнае кальцо». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Хай кажуць» з Андрэем Малахавым.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Ермолавы». Шматсерыйны фільм. Заключная серыя.
**23.10** Нашы навіны.
**23.25** Навіны спорту.
**23.30** «Што цячэ з крана?».
**00.25** «Размаўляючая са зданямі».
**01.10** Нашы навіны.
**01.25** Навіны спорту.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**09.30** «Я-вандроўца».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавела.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Мачаха». Серыял.
**13.50** «Фантастычныя гісторыі».
**14.40** «Next 2». Серыял.
**15.35** «Черкізона. Аднаразовыя людзі» Серыял.
**16.50** «Дабрыдзень, доктар!».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Мачаха». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Прэм'ера! «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**21.30** Прэм'ера! «Черкізона. Аднаразовыя людзі» Серыял.
**22.55** «Аўтапанарама».
**23.20** «Брыгада». Серыял.

**07.00** Добрая раніца.
**08.00** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**08.25** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.25** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.30** Дакументальны фільм (Францыя).
**11.30** Прыгодніцкі фільм «Бронзавая птушка». 3-я серыя, заключная.
**12.50** Жывы гук.
**13.30** Меладраматычны серыял «Пакахай мяне зноў» (Мексіка).
**14.30** Мультсерыял «Доктар Дог».
**14.55** Пазакласная гадзіна.
**15.05** Простыя практыкаванні з Ю.Афанасьевым (Расія).
**15.40** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**16.25** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.25** Медычныя таямніцы з доктарам А.Цярэшчанкам.
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.05** Дэтэктыў «Той, хто памнажае смутак» (Расія). 3-я серыя.
**20.10** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы. Дзень 2-й. Прамая трансляцыя.
**23.00** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**23.30** Час футбола.
**23.55** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне». Расія, 2008 г.
**10.10** «Забойства на Кутузаўскім. Зоя Фёдарава». Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.30** «Тэрыторыя прыгажосці». Тэлесерыял.
**12.25** Алена Якаўлева ў тэлесерыяле «Каменская».
**13.20** «Кулагін і партнёры».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Аб самім галоўным». Ток-шоу.
**15.20** Мастацкі фільм «Ісаеў».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.15** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Прэм'ера. «Карменіта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Прэм'ера. Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне». Расія, 2008 г.
**20.30** Тэлевізійны мастацкі фільм «Ісаеў».
**22.20** Тэлесерыял «Дворык».
**22.55** Алена Якаўлева ў тэлесерыяле «Каменская».
**23.50** Навіны - Беларусь.
**00.00** «Весткі.ru».
**00.15** «Канцэрт Л. Агуціна і А. Варум «Ты і я»

### НТВ

**07.00** Сёння.
**07.05** Інфармацыйны канал «Сёння раніцай».
**08.25** Вострасюжэтны серыял «Таксіст».
**09.15** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**10.00** Сёння.
**10.25** «І зноў добры дзень!».
**11.10** «Крамлёўскія жонкі».
**12.05** Дэтэктыўны серыял «Крымінальнае відэа».
**13.00** Сёння.
**13.30** Крымінальны дэтэктыў «Мужы».
**15.05** «Прафесія-рэпарцёр».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Прэм'ера. Вострасюжэтны серыял «Сталіца граху».
**21.35** Максім Аверын і Дзяніс Ражкоў у дэтэктыўным серыяле «Глушэц».
**23.25** Сёння.
**23.50** Моладзевы серыял «Школа».
**00.20** «Масквічы».

### EUROSPORT

**09.30** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы. Барселона (Іспанія). Дзень 2.
**11.00** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы. Барселона (Іспанія). Дзень 3.
**16.30** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. Германія. 1/2 фіналу.
**17.15** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**17.25** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. Германія. 1/2 фіналу.
**18.30** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы. Барселона (Іспанія). Дзень 3.
**23.00** Лёгкая атлетыка. Фотафініш. Барселона (Іспанія). Часопіс.
**23.30** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
**00.30** Пра рэстлінг. Агляд WWE (World Wrestling Entertainment).
**01.00** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы. Барселона (Іспанія). Дзень 3.
**02.00** Лёгкая атлетыка. Фотафініш. Барселона (Іспанія). Часопіс.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**07.50** Побач з намі (тэлечасопіс).
**08.05** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма).
**08.15** Прыватная калекцыя (агляд культурных падзеяў).
**08.35** Невядомая Беларусь: «Распавяду вам пра вайну», дак. фільм, рэж. Сяргей Ісакаў, 2009 г., Беларусь.
**08.50** Невядомая Беларусь: «Кіпіць Нямігa», дак. фільм, рэж. Уладзімір Самойлаў, 2009 г., Беларусь.
**09.20** Героі не нашага часу: Сяргей Картэс: Аўтаномія асобы.
**09.35** «Апошні сезон», серыял: 7 серыя.
**10.25** «Папялушка», тэлесерыял: 35 серыя.
**10.55** «Ніжэй за лінію Казярога», маст. фільм 2 серыя.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Папялушка», тэлесерыял: 36 серыя.
**17.30** «Вясельныя клопаты», маст. фільм.
**19.10** YoLife! (моладзевая праграма)
**19.30** «Надзвычай прыгодніцкія падарожжы Цюхці», мультсерыял.
**19.40** Праект «Будучыня».
**20.05** «Урок беларускай мовы», дак. фільм, рэж. Міраслаў Дэмбінскі, 2006 г., Польшча.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** «Зграя», сенсацыйны серыял: 8 серыя.
**22.15** «У пошуку ідышу», дак. фільм, рэж. Юрый Хашчавацкі, 2008 г., Беларусь.
**23.45** Аб'ектыў (паўтор).

# ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ

Выпуск №7 (45) (ліпень)

www.litbel.org www. novychas.gmail.com

Культурна-асветніцкі праект Грамадскага аб'яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў» і «Новага часу»


**Анонс**


«НАВІНЫ»: асноўныя падзеі літаратурнага жыцця месяца ..... 2
«ПАЭЗІЯ»: «Балада берага» — новыя вершы Алеся КАСКО ..... 3
«БЫЛІЦЫ»: фельетон Іллі РАСОЛАВА ..... 4
«ПАЭЗІЯ»: «У горадзе скрадзеных сноў» Анатоля ІВАШЧАНКІ ..... 5
«ПРОЗА»: «салёная» быліца ад Паўла ЛЯХНОВІЧА ..... 6
«ПАЭЗІЯ»: паэма Уладзіміра ДУБОЎКІ ..... 7
«ПРОЗА»: «сакраментальныя» аповеды Галіны БАГДАНАВАЙ ..... 8, 9
«СУСВЕТ»: пераклады вершаў Элізабэт ДЖЭНІНГС і згадка пра Уладзіміра САСЮРУ ..... 10
«ФРАГМЕНТЫ»: «Апошні тэлесюжэт» ад Тацяны МЯДЗВЕДЗЕВАЙ ... 11
«ПУБЛІЦЫСТЫКА»: артыкул «Пілот ля разбітага чоўна?» Віктара ХУРСІКА ..... 12
«ПАМЯЦЬ»: успамін Уладзіміра ВАСЬКО пра Уладзіміра БЫКАВА .. 13
«АСОБЫ»: роздум Генрыха ДАЛІДОВІЧА пра Генадзя КІСЯЛЁВА 14, 15
«КНІГАПІС»: новая рубрыка Асі ПАПЛАЎСКАЙ «Пачытаем?», акцыя, конкурс ..... 16


**АКТУАЛ**

## ЖЫЦЦЁ ПАВОДЛЕ БРЭГА

**Кастусь ТРАВЕНЬ**

**Рана ці позна, хоча чалавек ці не хоча, а будзе вымушаны пачаць жыць паводле Брэга ці Мантыньяка, Нішы або Маі Гагулан. А гэта значыць, каб жыць далей іназіраць вір жыцця, ён, гэты чалавек, павінен перастаць есці.**




Калі быць дакладным, то спачатку ён павінен кінуць паліць, затым перастаць піць гарэлку, каньяк, віскі, самагонку, «Сандадары» і процьму розных «Агдамаў» і партвейнаў. Вы помніце дзіўны партвейн пад назвай «Тры сямёркі»? Калі вы помніце гэны дзівосны напой, то можна смела зазначыць, што вашае жыццё, дружа, не прапала дарма. Колькі незвычайных імгненняў вы перажылі, спажываючы гэты чароўны нектар, колькі ўзнёслых мрояў, летуценняў пранеслася ў вашым уяўленні за гады вясны вашага жыцця.

Мой знаёмы лекар, да якога я звярнуўся, адчуўшы сябе кепска пасля бурліва пражытых гадоў, паслухаў стук майго сэрца, паглядзеў мутныя сікі, што я прынёс у слоічку з-пад маянэза, доўга ўглядаўся ў мой язык, мераў ціск, мацаў вантробы, кратаў чэлесы, глядзеў у розныя месцы, дзюркі, адтуліны і нарэшце зацвердзіў:

— Хочаш жыць, Мікола, — перастань жэрці.

Паколькі паводле ягоных меркаванняў раней я ўжо кінуў паліць, а затым перастаў і выпіваць, і пасля ўсяго гэтага ўсё яшчэ заставаўся жыць, то і гэтая незвычайная парада прымусіла мяне яго паслухацца.

— Месяц не еш, а праз месяц прыйдзеш да мяне, там пабачым, — прамовіў мой знаёмы кардыёлаг, уролаг, практолаг, нарколаг ды фельчар Лявон і, крутнуўшыся на крэсле-круцялі да кампутара, даў нырца ў віртуальную рэчаіснасць.

З наступнага дня я фактычна перастаў есці, бо тую траву, розныя напоі, гародніну і садавіну, арэхі і семкі сапраўдны мужчына ежай прызнаць не можа. Пасля першых дзён галадавання я адчуў лёгкае кружэнне ў рэчаіснасці. Асяроддзе пачало размывацца. Звыклая рэчаіснасць плыла ў маіх вачох лёгкім хісткім туманам. Розныя маленькія і вялікія думкі, і нават глабальныя стратэгічныя дзяржаўныя меркаванні і распрацоўкі, наконт якіх я нават хацеў па электроннай пошце звярнуцца да Ягонай Вялікасці пана Прэзідэнта, каб пасобіць яму ў кіраванні дзяржавай, — дык вось, гэныя думкі і меркаванні сплылі некуды ўбок і больш мяне не турбавалі.

**Я нават хацеў па электроннай пошце звярнуцца да Ягонай Вялікасці пана Прэзідэнта, каб пасобіць яму ў кіраванні дзяржавай**

Адзіная думка пра ежу цяпер сядзела ў маёй галаве, як жалезны трактар у дрыгве, і не было аніякай магчымасці ад яе выратавацца. Мары аб розных спажытых мной некалі стравах узнікалі ў маёй галаве штохвілінна. Я мроіў аб смажаным на патэльні скрылі мяса з сальцам, якое падсмажваецца з абодвух бакоў так, што паміж двума краямі застаецца тая дзівосная пекная шкварачка, якая так чароўна растае ў тваім роце, і аб цыбульцы, смажанай разам з скрылёчкамі мяска, і аб бульбачцы ў вялізным рондалі, і аб цэлым слупе пары, якая ўзносіцца да столі. А квашаная капустачка з журавінамі, і ўсё гэта пад чарачку жытнёвай… І размовы, дзіўныя мужчынскія размовы пра розныя гераічныя выпадкі, загадкавае і таемнае каханне, незвычайныя здарэнні, рэдкую ўдачу…

А вось калі яшчэ ўзяць злоўленых узімку шчупачкоў, ды лінёў, ды ёршыкаў, ды ўсё гэта ўмеючы згатаваць у кіпені ў вялікім металёвым рондалі, ды некалькі разоў закласці ў кіпень свежых шчупачкоў з лінямі, то выходзіць такая юха, такая юха, якую затым можна сёрбаць драўлянымі лыжкамі, а можна піць малянкоўскімі шкляначкамі, ды пад лусту смажанага мяска, ды пад жытнёвую… Ба-ба-ба… «Я люблю тебя, жизнь, и надеюсь, что это взаимно»…

Сучасная яда таксама мроілася ў мяне ўваччу…

У канцы тыдня, выпіўшы травянога напою і заеўшы жменяй семак, я рухаўся па абшарах існавання з вялікай цяжкасцю. Калі я праходзіў у двары каля кантэйнера са смеццем, мой абвостраны нюх сярод мноства смярдзючых пахаў вылушчваў дзівосны пах вэнджанай скумбрыі, падкісленага чорнага хлеба, непараўнальны да магутнага — аж валіў з ног — пах маянэза, грудзінкі, сыру і кілбасы. Гэтыя пахі прымусілі мяне насілу амаль на карачках адысці ад сметніцы на бяспечную адлегласць.

На сваіх родных, калег па працы, знаёмых і незнаёмых людзей, што ўвесь час жэрлі розныя смачныя стравы, я ўжо звыкла пачаў пазіраць, як на сваіх заклятых асабістых ворагаў. Гэта пачуццё неяк нечакана ўзнялося аднекуль знутры мяне і заняло трывалае месца ў маёй свядомасці. У канцы другога тыдня я ператварыўся ў дзвюхногага ваўка, небяспечнага для ўсіх, хто меў нейкае дачыненне да ежы. Хоць знаёмыя, сябры і блізкія ў адзін голас цвердзілі пра дзівоснае маладзенне майго аблічча, ніхто не ведаў, што пад гэтым аблiччам гадуецца драпежнік.

Харчовыя крамы сталі для мяне тэрыторыямі, да якіх я не мог нават наблізіцца. Я ўбачыў раптам, што горад перанасычаны харчовымі прадпрыемствамі — крамамі, шапікамі, кавярнямі, дзе людзі толькі і рабілі, што куплялі, елі, жавалі, церабілі, жэрлі ежу. Горад быў перагружаны ежай і людзьмі, якія елі і елі. Разумовае жыццё займала мізэрныя прамежкі часу паміж ядой, гатаваннем страваў, транспарціроўкай харчоў, вырошчваннем усяго таго, з чаго гатавалася яда, — усіх гэтых емяў і емін. І яшчэ: рэчаіснасць была насычаная размовамі пра яду — хто, дзе, калі, учора ці сёння, у Менску ці ў Вільні, каго і што еў і есць.

На трэцім тыдні мая істота канчаткова пачала ператварацца ў сапраўднага дзвюхногага ваўка з усімі звычкамі і пераканаваннямі жыццёвай канцэпты гэтых істот. Я пачаў вучыцца хаваць сваё неўтаймаванае і палкае імкненне да мэты, навучыўся лагодна ўсміхацца, хаваць драпежны бляск вачэй, быць ветлівым. Усе людзі сталі ўсведамляцца мной як «яны», якія супрацьстаяць майму аўтаномнаму асабістаму «Я». Калі нехта пачынаў казаць пра духоўнае, узнёслае, я ўнутры сябе ўсміхаўся і не верыў ніводнаму слову суразмоўніка. Я разумеў, што гэта такі самы, але больш дасканалы і вытанчаны дзвюхногі ваўчыла.

За тыдзень да заканчэння тэрміну я зайшоў да знаёмага ўролага, практолага, нарколага, венеролага і акушэра Лявона. Проста так, бо ў ягоных парадах я ўжо не меў патрэбы.

— Прывітанне, Мікола, ты яшчэ не склеіў ласты? Не даў дуба? Малайчына! —закрычаў ён, моцна здзіўлены, убачыўшы мяне.

— Скажы ты, стары пярдун, — прамовіў я ў адказ, — навошта ты мяне пазбавіў ілюзій наконт чалавецтва? Знішчыў веру ў ідэалы, у асвету, адукацыю, прагрэс чалавецтва, у каханне, у сэнс існавання, у асваенне касмічнай прасторы?..

— Прыходзь праз тыдзень. Праз ты-дзе-нь! Цыкл яшчэ не скончаны, — Лявон ізноў крутнуўся на крэсле-круцялі і даў нырца ў віртуальную кампутарную рэчаіснасць.

Праз тыдзень я нарэшце закончыў цыкл і, саспеўшы, ужо не пайшоў да Лявона, бо ператварыўся ў дасканалага і вытанчанага хцівага дзвюхногага драпежніка. Ежа для мяне перастала быць асноўнай дамінантай жыцця і страціла нада мной уладу.

Цяпер звыклым дасведчаным позіркам я пазнаю страваманаў — іх, як заўсёды, большасць, і, як толькі мне патрэбна іхная прыхільнасць ці апекаванне, ці нейкая патрэбная мне пастанова, я не шкадую грошай, бо ведаю: яны ў палоне мамоны. І гэтага дастаткова для дасягнення любых маіх драпежных мэтаў.

Дарэчы, знаёмы інтэлектуал нядаўна вярнуўся са Штатаў, дзе праходзіў паскораныя курсы вывучэння асноў дэмакратыі, лібералізму і свабоды, — дык вось, ён умацаваў маё меркаванне. З разгубленым і збянтэжаным выглядам ён шчыра пацвердзіў маю тэзу тым чыннікам, што Штаты перапоўненыя таўстунамі. Народ там жарэ яшчэ больш, чым у нас. Вось вам і ўся іхная хвалёная свабода і дэмакратыя — і ўсё дзеля таго, каб як мага болей есці.

Быццам цвік, забіты ў скроню, апошнім часам адна думка турбуе мяне: пры гэткіх апетытах можна ж урэшце зжэрці ўсе планетарныя рэсурсы…

▸ КОНАДНІ

# ВУЛІЦА ГЕНІЮШ У ЗЭЛЬВЕ… НЯМА

**Улады Зэльвы адмаўляюцца назваць вуліцу Савецкая імем выдатнай беларускай паэтэсы Ларысы Геніюш.**

Немэтазгоднасць намеснік старшыні райвыканкама па ідэалогіі патлумачыў тым, што «для большасці жыхароў слова «Савецкая» з'яўляецца важным гістарычным паняццем, асацыюецца з іх маладосцю і ўпэўненасцю ў заўтрашнім дні» (патлумачыў, вядома ж, па-расійску).

Такі адказ з райвыканкама атрымаў мясцовы актывіст Яўген Скрабутан. Адказ падпісаў намеснік старшыні па ідэалогіі Валянцін Семяняка.

Са слоў Яўгена Скрабутана, ліст з просьбаю перайменаваць вуліцу, на якой жыла Ларыса Геніюш, ён дасылаў у Міністэрства культуры і Палату прадстаўнікоў у сувязі са 100-гадовым юбілеем пісьменніцы, які будзе адзначацца 9 жніўня.

Гэты ліст быў перанакіраваны з Міністэрства культуры ў Зэльвенскі райвыканкам, адкуль Яўген Скрабутан і атрымаў адмову.

Актывіст кажа, што абураны такім адказам, бо ўлады самі збіраюцца браць удзел у святкаваннях 100-гадовага юбілею пісьменніцы.

Спадзяванні ў актывіста засталіся яшчэ, з яго слоў, на кіраўніцтва Гарадзенскага аблвыканкама, бо з Палаты прадстаўнікоў ягоны ліст быў накіраваны на рэагаванне менавіта туды — і адказу Яўген Скрабутан дагэтуль не атрымаў.

Са слоў Яўгена Скрабутана, зараз ён з іншымі зэльвенскімі актывістамі збірае подпісы за тое, каб у Зэльве з'явілася вуліца Ларысы Геніюш.

Яго здзіўляе яшчэ і той факт, што раённыя ўлады наагул не зацікаўленыя, каб у Зэльве з'явілася вуліца імя знакамітай беларускай пісьменніцы — пры тым, што адну з новых вуліцаў у горадзе назвалі вуліцай Знака. Што гэта азначае і дзеля чаго такая назва, са слоў актывіста, у горадзе ніхто не можа зразумець.

**Міхал Карневіч**

# СЛОВА ГЕНІЮШ У РАКАВЕ

**Музычна-паэтычная вечарына, прысвечаная 100-годдзю Ларысы Геніюш, адбылася ў Ракаве Валожынскага раёна Мінскай вобласці.**



Кнігу Л. Геніюш «Ад родных ніў» і сувеніры ад кампаніі «Будзьма беларусамі!» Міхась Скобла (злева) уручае студэнтцы Вользе Няфёдавай. Справа — Алесь Камоцкі.

На сустрэчу прыехалі намеснік старшыні СБП, паэт і даследчык творчасці Ларысы Геніюш Міхась Скобла, паэт і бард Алесь Камоцкі і літаратуразнаўца Язэп Янушкевіч. Творчая вечарына адбылася ў межах кампаніі «Будзьма беларусамі!».

«Дом культуры быў запоўнены пераважна студэнцкай моладдзю, хоць у Ракаве — мястэчку знаным, з багатай гісторыяй, — свайго ўніверсітэта пакуль няма, — сказаў Міхась Скобла. — Аказалася, гэта былі студэнты гістфака Гродзенскага ўніверсітэта імя Янкі Купалы, якія на двух аўтобусах вандравалі па мястэчках Заходняй Беларусі».

Міхась Скобла распавёў пра нядаўнюю ўсебеларускую талаку ў Жлобаўцах — на радзіме паэткі, пачытаў прысвечаныя ёй вершы і падараваў студэнтам кнігі Ларысы Геніюш.

Алесь Камоцкі выканаў некалькі песняў на геніюшаўскія вершы, расказаў аб працы над новым альбомам.

Язэп Янушкевіч падзяліўся сваімі літаратурнымі знаходкамі ў архівах Кракава і Вільні, прыгадаў свае сустрэчы ў Ракаве з Уладзімірам Караткевічам.

**budzma.org**

▸ СУСТРЭЧЫ

# Мінск–Чарнігаў: ТВОРЧАЕ ТУРНЭ БЕЛАРУСКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ

**Завяршылася двухдзённае турнэ па Чарнігаўшчыне дэлегацыі Саюза беларускіх пісьменнікаў.**



Фота С.Сыса

«Творчы дэсант» складалі Барыс Пятровіч, Анатоль Бутэвіч, Валер Стралко, Віталь Рыжкоў, Галіна Дубянецкая, Сяржук Сыс і Мікола Кандратаў. Ідэя і ажыццяўленне даволі яркай і насычанай праграмы паездкі належыць Амбасадзе Украіны ў Беларусі, упраўленню культуры Чарнігаўскай абласной дзяржадміністрацыі і нястомнаму літаратурнаму пасярэдніку паміж дзвюма літаратурамі Валерыю Стралко.

29 чэрвеня ў Чарнігаўскім літаратурна-мемарыяльным музеі М. Кацюбінскага адбылася творчая сустрэча з пісьменнікамі Чарнігаўшчыны. Першы намеснік старшыні СБП і галоўны рэдактар часопіса «Дзеяслоў» Барыс Пятровіч зрабіў агляд сучаснага стану беларускай літаратуры, спыніўся на найбольш актуальных праблемах дзейнасці творчага саюза, распавёў пра сітуацыю з беларускай моваю і цяжкасці з выданнем і распаўсюдам мастацкіх твораў. Са словаў намесніцы старшыні Чарнігаўскага аддзялення Нацыянальнага Саюза Пісьменнікаў Украіны Ганны Баран, украінскі бок сёння выглядае больш забяспечаным, паколькі адчувае падтрымку дзяржавы, кнігі паэтаў і празаікаў паступаюць у бібліятэкі, дзяржадміністрацыя аказвае дапамогу ў іх выданні, хаця праблемаў хапае таксама.

Пад час дыскусіі закраналіся самыя разнастайныя пытанні, у тым ліку і аб пашырэнні творчых кантактаў, больш актыўнаму супрацоўніцтву ў галіне літаратурных перакладаў з дзвюх моў. Барыс Пятровіч прывёў такі факт: за 6 гадоў выдання ў часопісе «Дзеяслоў» было надрукавана больш за 30 украінскіх аўтараў у перакладзе на беларускую мову.

Пад час сустрэчы чыталіся вершы на ўкраінскай і беларускай мовах. Галіна Дубянецкая прачытала творы Івана Франка на мове арыгінала і ў перакладзе. Сяржук Сыс агучыў свае пераклады чарнігаўскіх паэтаў Станіслава Рэп'яха і Пятра Куцэнкі. Галоўны рэдактар часопіса «Літаратурная Чарнігаўшчына» Міхась Ткач прапанаваў зрабіць узаемныя прадстаўленні двух літаратурных выданняў для азнаямлення з літаратурным жыццём Беларусі і Чарнігаўскай вобласці.

Пасля сустрэчы адбылася экскурсія па Северскаму краю. Беларускія літаратары наведалі гістарычныя і памятныя мясціны Чарнігава, нацыянальны гісторыка-культурны запаведнік «Качанаўка» ў Ічнянскім раёне, «Гетманскую сталіцу» ў Батурыне, мемарыяльны комплекс «Памяці герояў» у Крутах Барзнянскага раёна. Пад час экскурсій адбыліся сустрэчы з кіраўнікамі раённых адміністрацый, адказнымі работнікамі аддзелаў культуры Ічнянскага, Бахмачскага і Барзнянскага раёнаў. Абмяркоўвалася сітуацыя з захаваннем культурнай і гістарычнай спадчыны, функцыянаванне беларускай і ўкраінскай моў, магчымасці пашырэння творчых сувязяў паміж двума народамі.

Разнастайная і насычаная праграма візіту беларускіх пісьменнікаў была з густам распрацаваная намеснікам начальніка культуры і турызму Чарнігаўскай аблдзяржадміністрацыі Леанідам Смаляком, які пад час развітання запрасіў часцей наведваць гасцінны чарнігаўскі край. Беларусы ў сваю чаргу падзякавалі яму за цікавую ды змястоўную праграму.

**Сяржук СЫС**

▸ РОЗГАЛАС

# «СТАЛІН — ВЕРНЫ ЛЕНІНЕЦ, А ЛЕНІН — НАЙРЭДКІ МЯРЗОТНІК»

**Выйшла ў свет кніга Анатоля Тараса і Аляксандра Грыцанава «Навуковы антыкамунізм і антыфашызм». Падчас прэзентацыі аўтары распавялі, чаму яны ненавідзяць камуністаў, прадставілі Сталіна як «паэта-садыста» і растлумачылі, чаму нашым народам кіруюць ненармальныя.**

У назве кнігі аўтары абыгралі тэрмін «навуковы камунізм» — курс, які вывучаўся ва ўсіх ВНУ СССР аж да 1991 года. Аднак, на іх думку, у гэтага выдання ёсць больш падстаў на тэрмін «навуковы», паколькі яно грунтуецца на даследаваннях цэлай кагорты сучасных навукоўцаў з розных краінаў.

—Думаю, што такой кнігі яшчэ не было, — адзначыў Анатоль Тарас. — У постсавецкіх краінах дагэтуль ніхто не казаў выразна, што такое сталінізм. Мы звычайна звыклі чуць, што Сталін сказіў добрае вучэнне Леніна, распачаў рэпрэсіі, пастраляў народ. У гэтай жа кнізе паказана, што Сталін — верны ленінец, а Ленін — найрэдкі мярзотнік.

Кніга знаёміць з перадгісторыяй таталітарнай ідэалогіі, паказваючы, што гэтыя «праект» вельмі старажытны.

— Бальшавікі нічога не прыдумалі. Яшчэ ў Старажытнай Грэцыі разумелі, што такое камунізм, што гэта ўтварэнне, куды людзей заганяюць сілай і ўтрымліваюць там, абмяжоўваючы доступ да інфармацыі аб тым, як жывуць у іншых дзяржавах.

Асноўная ўвага ў кнізе нададзена гісторыі ўзнікнення і аналізу таталітарнай арганізацыі ў яе асноўных версіях: камуністычнай (СССР), фашысцкай (Італія) і нацыянал-сацыялістычнай (Нямеччына).

— Гэтая кніга для шырокага кола чытачоў, — прызнаўся Аляксандр Грыцанаў. — У ёй нарэшце ліквідаваныя ўсе непаразумелкі са словам «фашызм». Гітлер жа ніколі не ўжываў гэтага тэрміна ў дачыненні да немцаў, называючы сваіх прыхільнікаў нацыянал-сацыялістамі. Мусаліні быў абсалютна спакойным і ніколі не труціў італьянцаў. У СССР усё было нашмат горш. Такой злачыннай гісторыі з такімі зверствамі не было ніколі. Гэта была добра арганізаваная сістэма, у якой мярзоцце-дзяржаўнікі выдатна сябе адчувалі, дзякуючы мярзотнікам-выканаўцам. Сталін, мабыць, быў адзіным бяссрэбранікам. Ён быў проста, так сказаць, «паэт-садыст»...

Па меркаванні аўтараў, фашызм — гэта недаразвіты камунізм.

**Анастасія ЗЕЛЯНКОВА, Gazetaby.com**

ВЕРШЫ

# БАЛАДА БЕРАГА

Алесь КАСКО



* * *

*Чалавек дасюль яшчэ ў зародку,*
*ва ўлонні матухны-прыроды,*
*у пукатым чэраве Зямлі;*
*ён толькі-толькі знакі падае —*
*памкненнем імпульсіўным цела,*
*успышкамі пачуццяў сумятлівых*
*ды роспачных здагадак*
*пра акаліпсісы ў свеце і ў сабе.*
*Рэнтгенна — гэта мятлік,*
*што бязгучна б'еццa ў сценкі*
*замкнёнае няўмольнае прасторы;*
*калі ж і прарывае абалонку —*
*«Чалавек сягнуў у Космас!»,*
*«Чалавек ступіў на Месяц!» —*
*па неадцятай пупавіне*
*вяртаецца пакорліва назад.*
*Але зародак выспець мусіць:*
*у ім глыбінная ёсць памяць*
*пра шлях крыжовы да Любові,*
*і ў ім сусветная ёсць воля*
*пад сумненне ставіць непаўторнасць,*
*з якою за тысячагоддзі*
*народжаны Зямлёю векавечнай*
*адзін-адзіны Сын.*

## Не там

*Ах, з Крыма вярнуць Максіма?*
*Баімся, што пустата*
*магільна жахне: зусім не*
*яго*
*тлен вякуе там.*
*Ля Хведкавіч, прыдарожна,*
*граніт з Васілём паўстаў.*
*Нясвечаны,*
*бо — няможна:*
*ёсць чуткі — паэт не там.*
*Не «там» і Паўлюк з Крашына,*
*дый верш — не з яго ліста…*
*…Прытулкі сыноў Айчыны*
*нявёдамы,*
*як Хрыста.*

## Вандроўнік

***Памяці Міколы Купрэева***

*Кавеньку-павадыра*
*паставіць у кут з абуткам.*
*Запыленым незабудкам*
*дасць свежай вады з вядра.*
*Сарваныя ў добры час,*
*яны ажывуць, як просінь.*
*«Што ў свеце, кажы, — папросім, —*
*і што ты згубіў у нас?».*
*«Што ў свеце? — ён скажа ў такт. —*
*Прастора, краса, дарога…»*
*Бязмэтных цяпер ці многа?*
*Мы скемім: тут штосьці не так.*
*Узятыя на іспыт*
*нязэўным жыццём замкнёным,*
*зняверымся ў незнаёмым,*
*прынеслым палёў блакіт.*
*Які сёння хціввы свет,*
*якія ў ім ходзяць чуткі!..*
*Чысцюткія незабудкі*
*пакіне, між тым, паэт.*

## Забыты вулей

***Міколу Папеку***

*Скочваецца лета спелымі яблыкамі*
*па даху вулля, такога ж поўнага,*
*бы яблыкі, бы зямля гэтым летам, —*
*і цёплая ў меру, і ў меру вільготная.*
*Соты акругліліся, набухлі мёдам,*
*вось-вось рамкі свае разамкнуць,*
*вось-вось дашак, бы вечка, сарвуць*
*і расцякуцца залацістым цестам.*
*Мёду ўсё больш; ратунку ўсё менш для пчолаў,*
*народжаных не спыніцца ў працы,*
*падахвочаных ненаежным чалавекам.*
*Забыты вулей чакае яго, непамятлівага,*
*рызыкуе лопнуць распёртаю дзежкай…*
*І спаўзаюцца трутні, наталяюцца мёдам,*
*кладуцца ў пасцелі свае мядовыя*
*і чухаюць лапкамі поўныя чэравы,*
*каб зноў спахапіцца ды ўзяцца за ежу.*
*Не менее мёду між тым, і няма паратунку:*
*зацятыя пчолы не могуць спыніцца,*
*не могуць абярнуцца ў трутняў.*
*Збіраецца ўрэшце пчаліная веча,*
*гудзе і гудзе да позняга вечара,*
*а ўранку ўвесь рой (нават трутняў лянівых)*
*каралева матка збірае на пошукі*
*новага, пакуль што не занятага вулля.*
*Ды няма каму болей ускрыліцца.*
*Рух ёсць жыццё, нерухомасць — смерць.*
*Адно каб жа ведаць, а што ёсць за рухам?..*
*Мо адны толькі пчолы і ведаюць.*
*Мо толькі яны і стануць анёламі.*

## Краявід

*Чужы для бязлюднага краявіду,*
*пазіраю на попельнае поле,*
*дзе вугольчыкамі*
*тлеюць забытыя бульбінкі,*
*дзе стырчакі сланечніку*
*спрабуюць падвясіць смугу,*
*нібы ўсё яшчэ шукаюць*
*сонца… Яно*
*ўжо даўно пад імі —*
*зжоўклымі скарынкамі гарбузоў,*
*лісцем голых кустоў і яблыняў.*
*Чужы для бязлюднага краявіду,*
*заўважаю, як многа*
*пакінутых тут «крыжоў» —*
*маркотных агародных пудзілаў, —*
*і нясмела, бы ўлетку,*
*над імі кружляюць вароны.*
*Хоць бяры ды і сам*
*шырока растапырвай рукі —*
*дапасоўвайся*
*да бязлюднага краявіду.*

## Сад

*Сад восеньскі, ціхі —*
*з водарам празрыстых антонавак,*
*груш, вінаграду*
*(на белых сурвэтках),*
*з цяплінкамі арабінавых ягад*
*і кляновага лісця*
*(сям-там рассыпанага незнарок),*
*з цэлым лугам някідкіх кветак,*
*сабраных у вазы, —*
*так скупа, так мала падобны*
*да сапраўднага саду —*
*саду без згустку лекавых пахаў*
*і меланхалічных настрояў,*
*без спакусы ўтрапёнага сузірання,*
*што раптам канчаецца зрывам*
*і недарэчнай высноваю:*
*у садзе, амаль батанічным,*
*не стае толькі кветак вянковых…*
*у сценах бальнічных.*

## Нацыянальная бібліятэка

*Чым вышэй падымаюся —*
*за паверхам паверх, —*
*тым глыбей апускаюся*
*ў спраты егіпецкай пірамiды,*
*дзе стаяць саркафагамі кнігі*
*з муміямі першадрукароў і паэтаў.*
*Саркафагі — недатыкальныя*
*(ці амаль не) і таму не трухлеюць.*
*З іх, дамавінаў парадных,*
*здзьмухваюць пыл маладзенькія жрыцы,*
*безуважныя да наведнікаў:*
*вобмаль тых, хто запыніцца і папросіць*
*вечка падняць для агляду.*
*Я з «тых», і я ў полі зроку:*
*цікаўныя дзівяцца мне, нібыта*
*я мумія, што ажыла ўвачавідкі,*
*спапавелая без доступу свежага подыху,*
*з тленам роднага слова на вуснах.*
*Са мною спрабуюць завесці гаворку,*
*але спахапляюцца бездапаможна:*
*у іх брак досведу ў дагістарычнай мове.*
*І толькі адзін егіпцянін*
*як свой пачуваецца — трэба яму*
*папрактыкавацца ў маўленні, каб зразумець*
*наш вопыт айчынны: дзеля чаго*
*ствараем маўклівыя пірамiды і саркафагі?*
*У яго ёсць задума як навукоўца —*
*агучыць муміі рамзэсаў і тутанхамонаў;*
*яму — у адрозненне! — мала надпісаў*
*на дамавінах,*
*яму — у адрозненне! — трэба родная*
*мова жывая.*

## Усходнія суседзі

*1*
*Яны выйшлі з варагаў,*
*перамяшаліся з чынгісханамі,*
*спарадзілі жахлівых, ермакоў, пугачовых.*
*У ботах пятроўскіх,*
*папыхваючы каўказскаю піпкаю,*
*прайшлі паўшара Зямнога.*
*Што край мой на іхняй карце?*
*Абшару малюсенькі ўскраек.*
*Яшчэ не ўтаптаны ў дарогу хлеба акраец.*

*2*
*Далятаюць весткі —*
*зноў яны ў паходзе,*
*спадкаемцы неўтаймоўных ваяроў, —*
*гэтак часта,*
*што бянтэжымся: на ўсходзе*
*ці зара,*
*ці зноўку зарыва і кроў?*

## З кутка Нямеччыны

*Тут, у Нямеччыне,*
*у цесным кутку Гельмштэта,*
*я дыхаў свабодаю;*
*бяру я адсюль па жменьцы*
*паветра і сонечных промняў,*
*усмешак і слоў —*
*каб там, куды вяртаюся,*
*відушчай зірнулася*
*і сказалася годна: годзе —*
*годзе жыць з перакручаным горлам*
*там, на радзіме,*
*адкуль у вандроўку не ўзяў*
*свабоды ні жменькі.*

## Сакрэт пастаянства

*У цішу, дзе замоўк і кашаль,*
*трыбун кідаў за сказам сказ:*
*— Стабільнасць у краіне нашай,*
*бы ў гэтай зале, сярод вас.*
*Раптоўна ўскінуўся, як вецер,*
*дзяцюк са шрамам на шчацэ:*
*— З турмы нядаўна я; там, верце,*
*стабільнасць большая яшчэ!*

## Сухмень

*Стаяць ля транзістара, млеюць касцы.*
*Пра добрыя змены ім кажа сталіца*
*ды зноў пра надвор'е вястуе ў канцы:*
*не сёння, дык заўтра пале навальніца.*
*А травы зрыжэлі; бы порах — аўсы.*
*І сплюнуў брыгадны, і зморшчыў міжброўе:*
*— Урад калі хлусіць, дык хлусіць ва ўсім,*
*няхай бы хоць праўду сказаў пра надвор'е.*

## Апатыя

*Сягне радок у сон твой душны*
*і змусіць сэрца затрымцець,*
*і ўзбудзіць кроў, і горла здушыць,*
*але — не дужа, не насмерць.*
*Для заваконня ён — не ў знаку:*
*там час глухі, ці плач, ці спеў…*
*З душы сарвеш яго, вужаку,*
*каб без надзеі не шчымеў.*
*Не ўважыш, што ён схоў, ахова,*
*што, бы акрaец жабраку,*
*шанц акрыяць дарue мова*
*ў табой адпрэчаным радку.*
*Ён скурчыцца, спадзе бязгучна*
*па той бок чыстага ліста —*
*тады спаўе і стане мучыць*
*паўзучым гадам пустата.*
*Дарма пачнеш вышукваць словы,*
*душу і розум тармасіць:*
*верш незалежны, выпадковы*
*сябе не дасць уваскрасіць.*

## Балада берага

*Бераг мой у смузе… Хоць аднойчы б даплысць,*
*каб здрадліўцаў не мець,*
*каб здрадліўцам не быць.*
*Быць самім па сабе, быць сабою самім,*
*нежаданым для ўсіх, непатрэбным зусім.*
*Там, у краі чужым, там, на краі зямлі,*
*толькі птушкі жывуць, матылі ды чмялі.*
*Там, на сцежках глухіх, толькі звера сляды,*
*там будуюць мурашкі свае гарады.*
*І рашаюся я — і бягу праз траву,*
*і кідаюся ў хвалі — плыву і плыву*
*дзень і ноч, ноч і дзень, знемагаю — але*
*адыходзіць той бераг далей і далей.*
*Выбіваюся з сіл і на волю ракі*
*аддаюся… «Слімак, ты не першы такі!»*
*Я на беразе гэтым; ляжу на пяску*
*і цалую я ногі свайму рыбаку.*

* * *

*За паўвеку ўжо далёка чалавеку,*
*а да веку ці дайсці яму? —*
*уваходзіць у калеку, недарэку…*
*Дай жа чалавека абдыму.*
*Мне самому меней не намнога,*
*і міжволі хочацца гадаць:*
*знойдзецца каму ў канцы дарогі*
*не руку мне, дык хоць кій падаць?*
*Там, за рысай, і вальней і годней,*
*свеціць там нябесная крыло.*
*Першасней, аднак, і неабходней,*
*каб цяпло зямное абняло.*
*А пра большае —*
*дык толькі верыць, марыць,*
*трэба, вось, адолець жыццявір:*
*двое цягнемся праз вуліцу —*
*ён, стараc,*
*побач я, пакуль што павадыр.*

## Карабель

*Вецер у спіну не вецер.*
*Хваля не хваля,*
*што кошкаю трэцца аб бераг.*
*Дый бераг не бераг,*
*калі ён без стромы...*
*Зведаў я вецер сустрэчны,*
*раз'юшанасць хвалі,*
*паўставаў небасхілам мне бераг,*
*куды не даплыў я,*
*куды не даплысць ніколі.*
*Суцешна ў стыхіі!*
*Мне радасна ведаць:*
*яна не сцішэе, не скончыцца,*
*не зьнікне разам са мною —*
*па-за маёю вечнасцю.*
*Іду на бяздоннае дно*
*і расстайна ківаю мачтаю*
*таму караблю ацалеламу,*
*які, аб мой борт ледзь паранены,*
*спяшаецца стлець на якары.*

## Спроба запозненага ліста

*Хай не ліст, дык каб паўліста,*
*і каб не заплакаць…*
*О, які ж я чуллівы стаў,*
*рыхтык мякаць.*
*У акне слата і ў душы,*
*там і там бязлюдна.*
*Я маўклівасцю адграшый*
*сябелюбна.*
*Які ж трэба быў груз віны*
*для разгадкі простай:*
*боль ад аркушнай белізны —*
*кошт за ростань.*
*Ліст бясслоўны — як першы крок*
*з-пад свайго ж дыктату;*
*бачу старасць, і блізкі змрок*
*ясніць страту.*
*Дык з нуля? Але дзе той нуль:*
*дзе край-свет маячыць?..*
*Напішу табе ліст адтуль,*
*там не плачуць.*

ФЕЛЬЕТОН

# ПРЫНЦЫП АДНАГО АКНА І ДВАЦЦАЦІ ПЯЦІ ДЗВЯРЭЙ

Ілля РАСОЛАЎ

Аляксандр Парфір'евіч Кузякін, службовец па адмысловых даручэннях заняпалага міністэрства, адкрыў тэчку з апошнімі цыркулярамі і пачаў разглядваць дырэктыўныя ўказанні высокага начальства. Дайшоўшы да трэцяй старонкі, Кузякін раззявіў рот і нечакана для сябе пазяхнуў. Ён перагарнуў яшчэ старонку, на чым пазяханне не спынілася. Павярнуўся да століка, дзе стаялі тэлефоны спецсувязі, націснуў кнопку на апараце і па звычцы закудахтаў кудысьці ўверх: «Лена... мне... кава». Фраза была дзяжурнай і азначала, што занядбалы службовец заняпалага міністэрства знаходзіцца ў разумовым тупіку і не ведае, што яму рабіць далей. Чытво дырэктыўных указанняў працягвалася яшчэ каля паўгадзіны ўжо ў паўголаса і пад каву ды прывяло да таго, што пазяханне толькі пачасцілася. Падступіла дрымота. «Што такое? — падумаў Кузякін. — Дзіўны дзень. Ды і трэба б даведацца, ці доўгая чарга просьбітаў?».

Чарга была як заўсёды вялікая. Людзі тоўпіліся перад дзвярыма прыёмнай, у калідоры, а сама людская чарада заварочвала аж да сходаў.

— Прасі каго-небудзь тамака, — закамандаваў Кузякін сакратарцы.

У кабінет зайшоў пажылы мужчына ў шэрым пінжаку ды пажаваным гальштуку і, не вітаючыся, накіраваўся адразу да стала.

— Дабрыдзень, Аляксандр Парфір'евіч, — пачаў зáйшла. — Вось, прынёс. Да апошняга ўчора збіраў і вырашыў прама да вас.

— Дабрыдзень, — суха вымавіў Кузякін. — У чым справа?

— Прынёс, — суха паўтарыў просьбіт.

— Можа быць, для пачатку вы прадставіцеся і скажаце, чаго прыйшлі?

— Я ніколі б не адважыўся турбаваць, Аляксандр Парфір'евіч... — са шкадаваннем у голасе вымавіў наведвальнік. — Але мая жонка, Вольга Пятроўна Шчукіна, сказала, што вы дапаможаце ў маёй просьбе. Яна была ў вас па справе Прахіндзеева пазалетась, і вы ёй дапамаглі. З раніцы папярэдзіла, каб я прыйшоў менавіта да вас.

— Наколькі я здагадаўся, ваша прозвішча Шчукін?

— Так-с.

— Дык што вам патрэбна?

— Хачу атрымаць пенсію. І калі магчыма — у паскораным парадку.

— Пачакайце. Як жа? — з дзіўнай інтанацыяй у голасе вымавіў Кузякін. — Я нічога толкам не разумею. Наша ведамства не займаецца пенсіямі, мы, ці ведаеце, самавітае міністэрства, а не пенсійны фонд. Вам трэба пайсці... — Кузякін прыўстаў, зазірнуў у нататнік.– На вуліцу Жытная, дзе вам аформяць патрэбнае накіраванне. Вы, васпане, не туды патрапілі. Ваша просьба зусім не да нас.

— А як жа апошні цыркуляр? — з недаверам у голасе вымавіў Шчукін.

— Вы пра што?

— Учора па ўсіх тэлевізійных каналах круцілі, тлумачылі, што да чаго...

Кузякін ужо даўно не глядзеў ніякіх каналаў. Ён са здзіўленнем утарапіўся на Шчукіна. Шчукін з не меншым здзіўленнем вытарашчыўся на Кузякіна.

— Прынцып аднаго вакна, — ціха прабурчаў просьбіт.

— Аднаго вакна? — няўпэўнена перапытаў службовец. — І ў ягонай галаве прастукала фраза яшчэ раз. — Так-так... Узгадваю.

— Я ўжо пачаў сумнявацца ў вашай добранадзейнасці... — сарамліва вымавіў Шчукін.

— Як жа, як жа. Цыркуляр ёсць цыркуляр. Дакументы высокага начальства — для нас, выканаўцаў, як закон, — закудахтаў службовец заняпалага міністэрства. І расплыўся ва ўсмешцы. — Добра. Зробім. Перадамо дакументы куды належыць, — адрапартаваў Кузякін.

— Я б прасіў паскорыць справу. Ці ведаеце, у мяне паважлівая прычына...

— Добра, добра. Буду спрыяць, — нервова паабяцаў Кузякін, спрабуючы хутчэй выправадзіць госця за дзверы.

Пасля таго прыняўся шукаць дзіўны цыркуляр. Знайшоўшы патрэбную паперу, доўга яе круціў, потым уважліва перачытаў. Цыркуляр высокага начальства сапраўды ўяўляў сабой шэдэўр дакументазнаўства. «Усё лепшае для народа, нават чарга...» — з такіх слоў пачынаўся важны прэзідэнцкі цыркуляр. Ён загадваў службоўцу прымаць справы і скаргі наведвальнікаў па-за залежнасцю ад таго, да якога ведамства яны тычыліся. А затым ужо самім спрыяць рашэнню справы. Каб не ствараць натоўп просьбітаў, службовец мог зачыняць на ключ дзверы ўласнага кабінета, але абавязкова пакідаць ключ у дзвярах, каб кожны мог зайсці і ўзяць патрэбны дакумент. Калі ж чарга наведвальнікаў была вялікай, то службовец абавязаны быў карміць просьбітаў сняданкам, абедам і вячэрай, а іншагародніх уладкоўваць на начлег. У асобным раздзеле цыркуляра была апісаная працэдура, якім чынам службоўцу самому запісацца да сябе на прыём. Ён жа таксама павінен быў вырашаць свае ўласныя праблемы...

На наступны дзень да Кузякіна сабралася яшчэ большая чарга наведвальнікаў. Людзі стаялі да яго — хто аформіць шлюб, хто завяшчанне, хто атрымаць ордэр на кватэру. Не дапамагалі Кузякіну і навыкі, атрыманыя ў дыпламатычнай акадэміі. Напрыклад, у адным з вучэбных класаў ім паказвалі адмысловы тэлефон, па якім можна было патэлефанаваць міністру замежных спраў любой краіны і адпрацаваць навыкі культурных зносінаў. Вось бярэ трубку студэнт і на ветлівае «Хэло» на тым канцы провада радасна адказвае: «Хрэн табе ў хайло!». «Гэта пяць...» — з гонарам тлумачыў Сашку Кузякіну выкладчык. Дарэчы, шматлікія акадэмікі дагэтуль з замілаваннем успамінаюць віхрастага хлапчука Сярожку Лаўрушкіна, які працуе цяпер, па чутках, дзесьці ў МЗСе, і яго любімую прыказку: «Ды хто ты, б..., такі, каб мне лекцыі чытаць?!», адрасаваную навуковаму сакратару акадэміі. На чацвёртым курсе ўсе без выключэння будучыя дыпламаты, і Кузякін у тым ліку, праходзілі практыку на шахце і на будоўлі. Там, з «апусканнем» у моўнае асяроддзе, яны замацоўвалі навыкі цяжкага навучання.

Але вернемся да нашай праўдзівай і павучальнай гісторыі. З часам Кузякін ужо пачаў паволі траціць розум. Яму трызнілася і па начах снілася яго ранейшае спакойнае жыццё ў заняпалым міністэрстве. Цяпер ён не знаходзіў месца нават ва ўласным кабінеце. Аляксандр Парфір'евіч прымаў нейкія дакументы, рэгістраваў іх, ставіў пячаткі і абяцаў уладкаваць справы...

Напрыканцы студзеня ў кабінет Кузякіна нягучна пастукалі.

Увайшоў мужчына несамавітага выгляду ў шэрым пацёртым гарнітурчыку і скрыўленым тварам. У руцэ ён трымаў вялікую валізку, з адной кішэні яго штаноў тырчаў развадны ключ, а з другой — драўляная ручка вантуза.

— Таварыш Кузякін? — упэўнена спытаў зáйшла.

— Так, слухаю. Вы дзяжурны слесар-вадаправоднік? — са здзіўленнем спытаў гаспадар кабінета.

— Не, я прафесар Экімаў. З Баранавіцкага ўніверсітэта. Гума — гэта легендацыя. — І наведвальнік пакрывіўся на адтапыраную кішэню. — Запомніце, мае ініцыялы — А. І. Што значыць Анісім Іванавіч. Я ад Уладзіміра Лапаціна.

— Нічога не разумею. Гэта таксама прафесар?

— Не, ён якраз вадаправоднік, хоць таксама мае навуковую ступень.

— І што вам заўгодна? — спытаў здзіўлены Аляксандр Парфір'евіч.

— Буду з вамі адкрыты. Спадзяюся, наша гутарка застанецца выключна паміж намі. Мы з Лапаціным людзі занятыя і акрамя таго, што лічымся ў розных дробязных канторах, займаемся выкарчоўваннем усяго гнюснага і нядобранадзейнага. Прызначэнне, ага, — ганарліва вымавіў Экімаў.

— І... — з недаверам працягнуў Кузякін.

— Я асабіста навучыў гэтай добрай справе сорак восем сваіх вучняў, і ўсе яны шчасліва абаранілі дысертацыі. Трое з іх — доктары навук, і працуюць у высокіх кабінетах.

— Цікава, — закрываючы тэчку з дакументамі і збіраючыся спыніць бескарысную гутарку з відавочна нездаровым чалавекам, сказаў Кузякін.

— Не спяшайцеся! — цвёрда адрэагаваў на тое Экімаў. — Я толькі пачаў гэтую важную гутарку. Вось гэты таксама ў свой час спяшаўся, — тыкаючы маленькім, ледзь сагнутым пальцам, убок партрэта галоўнакамандуючага, працягваў няпрошаны прафесар. — А цяпер стаў Вярхоўным. Мой любімчык. А калі б я яго граматна пісаць у розныя канцы нашай неабсяжнай не навучыў, сядзеў бы сабе дагэтуль ва ўніверсітэце, з плота ногі ўніз звесіўшы. Але то быў іншы час, а цяпер моладзь пайшла несвядомая, няма на іх ніякай управы. Пішуць усякія фельетоны, публікуюць усялякую з'едлівую гадасць. Ніякіх у іх прынцыпаў. Прадалі матухну радзіму за паўкошта. Наце, вось, самі пачытайце...

— Навошта мне гэта? Для якой мэты? Еду да міністра. Іншым разам прыходзьце, — адмовіўся Кузякін.

— Прыйдзецца! — камандным тонам вымавіў Экімаў. — Мы вунь тут вам накідалі ўсёй нашай камандай і падпісалі. Я, Лапацін, Крэйд ды Двурушнік. Самыя надзейныя людзі, надзейней не бывае. Можаце распытаць, хоць бы Раскрапыхайлава.

Пры згадванні гэтага прозвішча ў Кузякіна выпрасталася спіна і пабарвовеў твар. Раскрапыхайлаў пасля прызначэння намміністра ўжо паўгода пісаў даносы на ўсіх запар у міністэрства смуроднасці, нават на міністра Вырыймагілкіна. Усе службоўцы аб тым ведалі. Хадзілі чуткі, што ён вось-вось пойдзе на павышэнне ў Раду Бяспекі. Настолькі якасна Раскрапыхайлаў пачаў пісаць!

— У нас самыя добрыя пісьмовыя рэкамендацыі. Краіна павінна ведаць сваіх герояў! — нечакана выгукнуў наведвальнік. У гэты момант яго твар яшчэ больш перакасіўся. Прафесар акуратна, як нованароджанае дзіцё, паклаў важкую тэчку на стол Аляксандра Парфір'евіча. — Сам прынёс, хоць мог бы паслаць аспіранта. Прыкмета маёй павагі да вас, таварыш Кузякін. Буду з вамі шчырым, таварыш. Хоць са мной гэта здараецца вельмі рэдка. Павінен прызнацца, што Лапацін на вас аж тры скаргі напісаў у пракуратуру, і ўсе яны вярнуліся назад. Усюды стаіць рэзалюцыя высокага начальства аб тым, што вы чалавек добранадзейны, як гаворыцца, у дошку наш чалавек.

«Дык вось якая набрыдзь мне спаць не давала», — прамільгнула ў галаве ў Кузякіна.

— Праверка ёсць праверка, — затакаваў Экімаў. — Выбачайце, але гэта тэхнічная неабходнасць. Зараз мы ўсе ў адной запрэжцы, у тройцы. Цьфу... — сплюнуў убок прафесар. — Гэта значыць у камандзе.

Экімаў пацягнуў тэчку за вяроўку, расчыніў.

— Гэта вам, тут ёсць на ўсіх. Прынцып аднаго вакна, чулі? — І расплыўся ў лагоднай усмешцы.

Прыходзіў Экімаў і на наступны дзень, і праз тыдзень, і нават у выходны.




Пішуць усякія фельетоны, публікуюць усялякую з'едлівую гадасць. Ніякіх у іх прынцыпаў. Прадалі матухну радзіму за паўкошта

ВЕРШЫ

# У ГОРАДЗЕ СКРАДЗЕНЫХ СНОЎ

Анатоль ІВАШЧАНКА



Фота Т.Сушчэўскай

***

*я не паэта*
*о крый мяне... матам*
*паэзія гэта спорт*
*паэзія гэта эстрада*
*паэзія гэта пот*
*і нясвежыя швэдры*
*не ведаю як каму*
*а мне тут бракуе паветра*
*скокі й пырсканне сліней*
*пад чэргі забойных тырадаў*
*яна ўсё болей нагадвае*
*танную клаўнаду*
*паэзія гэта понт*
*публіка ставіць балы*
*перамагае мацнейшы*
*з трэскам парваўшы залу*
*традыцыю годна прадоўжыць*
*новае пакаленне*
*хай пераможа ўжо ж*
*той у каго даўжэйшы...*

*паэзія шоў і свята*
*спорт з клаўнадай гэта*
*даруйце я не паэта*
*з такімі раскладамі...*

## Нарадзіць радок

*можа любы,*
*незалежна ад полу і ўзросту.*
*Нарадзіўшы радок,*
*хтосьці гадуе яго,*
*выношвае з яго верш,*
*а можа, — паэму,*
*з таксікозам, спохваткамі,*
*усім астатнім.*
*Хтосьці, нарадзіўшы верш,*
*трымае яго пры сабе,*
*як маці ці бацька-адзіночка, —*
*у сваіх галаве, шуфлядзе*
*ці на хард-дыску.*
*Большасць паэтаў*
*смела выпускае*
*ўласных вершанятаў*
*у вялікі свет*
*(хаця, бывае,*
*пасля вусьцішна просячы: «Вярніце,*
*вярніце мне мае вершыкі...»).*
*Некаторыя,*
*нарадзіўшы радок,*
*пакідаюць кволенькае*
*скрываўленае цельца*
*бездапаможна курчыцца на паперы,*
*канвульсіўна дрыгаць ножкамі*
*й ручкамі,*
*каб пасля,*
*разграбаючы архівы,*
*натрапіць на аркуш-прасціраdla*
*і адчуць сябе на імгненне*
*дзіцезабойцам.*
*Ёсць і тыя,*
*хто ўсынаўляе*
*чужыя радкі,*
*і тыя,*
*хто іх тупа крадзе.*
*Але*
*не*
*істотна*
*гэта*...*

** Апошнія чатыры словы — цытата верша Андрэя Адамовіча.*

## Братэрства

*з завязанымі вачыма*
*у адным чаравіку*
*крочыш шляхам пілігрыма*
*паўз няведання смугу*

*як народзіны — са смерці*
*так і ў гэты дзіўны шлях*
*выправіцца той хто сэрці*
*зможа ў сабе цемры знак*
*упісанае ў трохкутнік*
*рыхтык «саступі дарогу»*
*на твае глядзіць пакуты*
*перакуленае вока*

*ўсе сцяжыны пілігрымаў*
*ўрэшце сыйдуцца ў адну*
*тут без масак і без грыму*
*стрэнеш ты сваю радню...*

*блізкіх але не па веры*
*родных ды не па крыві*
*зарыпелі глуха дзверы*
*ты гатовы? то жыві!*

## Сярэдзіна

*Калі дачка нарэшце роўна задыхае*
*пад маёй далонню,*
*і я, мацюкаючы скрыпучую падлогу,*
*прадзяруся да кухні,*
*дзе мы ўдвох, —*
*я і ноч,*
*раптам з'яўляецца столькі часу!*
*І ад пачатку не ясна,*
*што з ім рабіць?*
*Тупа пайсці ў ложак?*
*Раскоша й марнатраўства.*
*Выціскаць з сябе сілаба-тоніку*
*ці, горш, дабіваць аповед?*
*Няма сілаў.*
*Застаецца сярэдзіна.*
*(І хай на ранак жонка будзе папікаць*
*здрадай з паперай...*
*Заўжды можна адказаць,*
*што з паперай лепш,*
*чым з фаташопаўскімі цёлкамі.)*
*А далей магчывыя некалькі сцэнараў:*
*1. напоўніць-кульнуць келіх*
*і паўгадзіны* ***фтыкать***
*у чысты аркуш.*
*2. напоўніць-кульнуць келіх,*
*пасля ўкалоцца дазняком хлебу з салам,*
*выключыць святло й самадастаткова*
***фтыкать*** *у бязвобразна-безметафарны*
*краявід за вакном*
*3. ты напоўніш келіх,*
*і... цябе накрые*

*Ты ізноў вернешся ў гэты горад,*
*дзе дзетак вучаць вызначаць лёс*
*па палёце пакету,*
*дзе між фатэлямі ды цэлафанам*
*засталіся пахі самых блізкіх табе*
*людзей,*
*дзе нявыказаныя словы,*
*што стварае адлегласць*
*(пры чым тут на хрэн блакітныя*
*бадхісатвы),*
*дзе шмат сноў таму*
*на рагу чырвонай і камуністычнай*
*ты сустрэнеш чалавека*
*які моўчкі спыніць цябе*
*а пасля абышоўшы яго ты сустрэнешся яшчэ з адным які падорыць табе новы зборнік вершаў паводзіць рукамі над тваёй галавой скажа штосьці пра шлях выдатна разумеючы што ўсе словы ўжо там у кнізе (якія на хрэн бусліныя крылы) кнізе-бомбе якую ты панясеш у сваёй палатнянай торбе*
*і ты знойдзеш сябе за адным столікам*
*з першым, у кавярні, што на рагу...*
*вы павітаецеся,*
*абмяняецеся кантактамі,*
*і ты здзівішся,*
*што за столькі гадоў яго нязграбны почырк*
*зусім не змяніўся...*

*Вось таму мне й падабаюцца болей*
*першыя два варыянты.*

## Восем месяцаў

***каханай жоначцы***

*восем месяцаў чакання*
*напаўшэптавых прамоў*
*вось яно — наканаванне*
*вось яно — выпрабаванне*
*трэці раз*
*усё наноў*

*ўсё наноў: трызненні сненні*
*падсвядомых прымхаў спам*
*вечаровыя маленні*
*й рытуальныя паленні*
*ў фортку*
*з ветрам напалам*

*восем месяцаў маўчання*
*(восем вершаў за ўвесь час)*
*хваляванні ад растанняў*
*я з табой маё каханне*
*покуль не пачаўся джаз*

**8 кастрычніка 2009 г.**

## Ноч... успамін...

***Ноч стушыла агні, пад акно***
***падступіла й цікуе жахліва...***
***Уладзімер Жылка***

*за акном ненажэрная ноч*
*хочаш вый*
*хочаш выкінь ёй нож*
*пад рабрыну ці проста у спіну*
*пацячэ яе кроў па лязе*
*пі нагбом*
*кубак ёсць балазе*
*а на закусь пакінь успаміны...*

*паміж намі сто крокаў імжы*
*не парушыць ніхто*
*той мяжы*
*што аднойчы накрэслена словам*
*расхіснутая студня душы*
*плюй смялей —*
*там даўно ледзяшы*
*прараслі праз палац мармуровы...*
*...*
*усё так добра*
*усё так дробна*
*і так раптоўна*
*пісаць грахоўна*
*і малітоўна*
*не трэба стогнаў*
*святых кароў*
*скраў кроў*
*...*
*усё так ціха*
*усё так дзіўна*
*і гэтак дзіка*
*інтуітыўна*
*пісаць навобмацак*
*good luck*

## Дзевяць чарак

*ад першае чаркі*
*адкрываюцца чакры*
*ад другое*
*дадаецца спакою*
*ад трэцяе*
*саграюся ўрэшце я*
*чацвяртая*
*вэрытас вяртае*
*пятая чарка*
*зрывае пячаткі*
*шостая — жорсткая*
*сёмая — вясёлая*
*восьмая — дзівосная*
*пасля дзевятае*
*пачынаецца свята*

## З непрачытаных лістоў містэра Блюма

***(the song — сон)***

*«Я іду па знямелым горадзе,*
*горадзе без жыхароў,*
*без аўто, трамваяў, без ровараў,*
*без сабакаў, мянтоў і катоў,*
*зазіраю ў бязлюдныя крамы,*
*сам сабе прабіваю тавар*
*пад усмешкі пластмасавых дамаў.*
*Ў горадзе страчаных мар.*

*Я брыду па вільготных рэйках,*
*я брыду й мармычу брыду.*
*На мае ссівелыя вейкі*
*неба горада лье ваду.*
*Я блукаю па звілістых вулках*
*без назоваў і без нумароў,*
*прыкладаю да бруку вуха.*
*Ў горадзе скрадзеных сноў.*

*Пасяляюся ў лепшым гатэлі*
*з добрым відам на вечны агонь,*
*у якім урачыста гарэлі*
*ўчора рэшткі ўсіх ерэтыкоў.*
*Потым горад з'ехаў за горад,*
*і няясна, ці вернецца хто.*
*Адкрываю ўрачыста корак*
*і куляю сухое шато.*

*Ён захраснуў у светлым пярэдні*
*у чаканні праклятых гасцей.*
*Горад-хамелеон ці пярэвараценъ,*
*горад закатаваных надзей.*
*Прыляцела зялёная муза*
*(чорт, паблытаў на клаве «з» з «х»),*
*прагудзела на вуха тры блюзы*
*і сімфонію ў стылі ска.*

*Я патрапіў сюды не знянацку,*
*адгарнуўшы старонку пяць,*
*а калі дачытаў да пятнаццатай,*
*зразумеў: трэба выйсце шукаць.*
*І шукаю яго без толку,*
*бы на Марс эсэмэскі шлю.*
*Калі зможаш, пакінь візітоўку*
*на Reception. Твой,*
*містэр Блюм».*

БЫЛІЦА

# АДНО ТОЛЬКІ СЛОВА

Павел ЛЯХНОВІЧ



Ішоў па прычальнай сценцы Кацярынінскай гавані начпо і думаў аб вялікай і магутнай расійскай мове. Вось, напрыклад, слова «в...бацьь». Гэта і аб'явіць спагнанне, і правесці выхаваўчую працу з падначаленым, і вылаяць за якіясьці хібы ў форме адзення, у дысцыпліне... ды за што заўгодна. Не кажучы ўжо пра асноўны, так бы мовіць, спракавечны сэнс.

А пра што яшчэ думаць палітработніку? Не пра міжпаходавы ж рамонт, ці там пра заняткі па спецыяльнасці. Палітработнік — асоба тонкая, гуманітарная. Думае пра высокае, не ўсім даступнае.

Адно толькі слова, а якая безліч нюансаў, значэнняў, тонаўпаўтонаў!

Вось злавілі, напрыклад, матроса ў самаволцы і арыштавалі, і на гаўптвахту пасадзілі. Адседзеў, вярнуўся — як ён пра здарэнне браткам-маракам распавядзе? Скажа — «в...балі». Або застукаў яго камандзір баявой часці ў час прыборкі за нейкай іншай справай і разнос устроіў. «Не вымаючы». Зноў скажа: «бычок в...баў».

Як мінаў караблі ОВРа, выскачыў з бліжэйшага СКРа матросік чарнявы. Усё правільна зрабіў: загадзя на страявы крок перайшоў, руку да бесказыркі ўскінуў, і з моцным акцэнтам нешта прагергетаў. З усяго толькі і зразумеў контр-адмірал, што «...дазвольце звярнуцца...». Спыніўся: «Ну, што табе, сынок?» — Няправільна гэта, парушае прынцып адзінаначалля, але што возьмеш з неадукаванага сына гор... Ці можа якіх там пустынь...

«Сынок» зноў загергетаў, і выдзеліў слых начпо некалькі ключавых словаў — «прыборка», «камандзір» і «в...бе».

«Гэта ж трэба! Толькі што пра гэта думаў, і — на табе! Відаць, кепска прыборку зрабіў, і за гэта камандзір ці спагнанне аб'явіў, ці можа аблаяў», — падумаў палітработнік, унутрана сцепануўшыся. Непрыемна, калі матрос пры адмірале такія словы ўжывае. Больш натуральна, калі наадварот. Але што тут казаць? Тлумачыць яму, што з такімі пытаннямі да адміралаў не звяртаюцца, што ён увогуле павінен звяртацца толькі да камандзіра аддзялення, бессэнсоўна».

А матрос стаяў і чакаў. Чаго чакаў? Відаць, справядлівасці. Можа, чакаў, што адмірал зараз жа выкліча ягонага крыўдзіцеля-камандзіра і на шматкі падзярэ? «Як Бобік грэлку...» — прыйшла недарэчы адміралу показка, і ён нечакана для сябе заўсміхаўся. Добра так заўсміхаўся. Па-бацькоўску. Не, нават па-дзядоўску, бо па гадох якраз у дзяды гэтаму чарняваму азіятку падыходзіў.

— Сынок! Ты ж прысягу даваў! Даваў жа? — Зрабіў паўзу і востра ўперыўся ў матроса. — Даваў?

— Прысяга... э-э...даваў. — Згадзіўся матрос.

— Вось! — Узрадаваўся начпо. Ён то ведаў, што матрос прысягаў, але не быў упэўнены, што той зразумее сэнс ягонага пытання, і тады іхняя гутарка пяройдзе ў гутарку двух глухіх. — Даваў! А там што запісана? Што там запісана? (Чорт, ці не вельмі складана я выражаюся?)

— Што запісана? — Паўтарыў матрос.

— А там запісана так: «стойка пераносіць усе нягоды і цяжар ваеннай службы»! — Адмірал выпрастаў спіну і падняў угору па-старэчаму крываваты ўказальны палец. — Стойка! Пераносіць! Нягоды! А тое, што цябе камандзір...э-э...(А-а! А то не зразумее.)...в...баў! Ха! Плюнь! Гэта і ёсць тыя самыя нягоды!

— Нэ запісана. — Сказаў матрос.

— Ты-ы... гэт-та... вось што... Ты са мной не спрачайся. Ты колькі служыш?

— Я колькі служыш?

— Ну вядома, ты! Я ўжо трыццаць шосты год служу...

— Я — карась. Паўгода служыш.

— Дык ты са мной не спрачайся. Значыць так: перадасі камандзіру, што я загадаў яму ў цябе залік тэксту прысягі прыняць. І хай мне далажыць. Зразумеў? Паўтары!

— Камандыру мая прысяга казаць, камандыр адміралу казаць...

— Правільна! Толькі ты без крыўды. Гэта ж служба, сынок. А тое, што цябе камандзір в...баў, ты і ў галаву не бяры. Гэта служба! Яна такая! Цябе в...балі, а ты страпянуўся — і служыш, быццам нічога не здарылася. Эх! Мне б твае гады!...

Памаўчаў.

— Ты што думаеш, сынок — твайго камандзіра ніхто не ...бе? Ха! Каб жа так! Проста вам, матросам, гэта невядома. А насамрэч... Як твайго камандзіра прозвішча? Ягораў? О-хо-хо! Твайго Ягорава камандзір дывізіёна кожны дзень так на каракалку надзяе, ажно працїна ўздымаецца! — Адмірал разышоўся. Бачыў даверлівыя шчылінкі вачанятаў матроса і імкнуўся ў даступнай форме данесці тое, у чым быў перакананы. І можа нават выклікаць якіясьці добрыя да сябе пачуцці. — Я твайго Ягорава ведаю. Летась на парткамісіі мы яго так ...балі, так... .

Альбо возьмем камандзіра дывізіёна... Думаеш, яго ніхто не ...бе? Памыляешся, сынок, калі так думаеш! Не часта, не. Але хоць раз на тыдзень, камандуючы...

Па-сакрэту скажу, сынок. Раз на месяц я ў Североморску бываю ў начальніка Палітупраўлення. І мяне там так, бывае, ...! Ты не ўяўляеш! Але вы...уць, я зраблю пэўныя высновы, вярнуся сюды, ...бу падначаленых... Глядзіш, праз пэўны час і заўвагаў у мой адрас меней. А галоўнае, сынок, галоўнае — не прымаць блізка да сэрца гэта ўсё. Памятаць прысягу і стойка пераносіць... Ты зразумеў, сынок? Цярпі. Прывыкнеш пакрысе. Ды што гэтыя твае тры гады? Бліс — і дадому. З пачуццём гонару...

Зноў памаўчаў. Матросік чакальна, з надзеяй пазіраў яму ў твар. Што яму яшчэ сказаць? Здаецца, добра ўжо сказаў. Правёў выхаваўчую працу.

— Ну, добра. Ідзі ўжо. Не забудзься камандзіру пра прысягу дакласці.

Матросік крутануўся — далонь ля бесказыркі — кругом. Пайшоў на карабель.

І контр-адмірал пасунуўся на сопку, да сябе ў палітаддзел. Ішоў і злаваўся: «Бач ты, тры словы ведае, з якіх адно не для друку, а мне пярэчыць будзе!» Але нешта трывожыла. Прыйшоў у кабінет, пакорпаўся па кніжных паліцах, знайшоў запыленую кніжку «Агульнавайсковыя статуты Узброеных Сілаў СССР». Памятаў — там недзе знутры на вокладцы тэкст прысягі павінен быць. Ага. Вось. Прабег вачыма: «Я, грамадзянін...та-та-та...камандзіраў і начальнікаў.

Я клянуся...та-та-та-та... і Савецкаму ўраду.

Я заўжды гатовы...мужна...тата-та...і самаго жыцця... — Ёркінк літар! — Калі ж я нарушу...!» Няма пра нягоды і цяжар! Я ж гэтыя словы як сваю маму памятую! Дзе ж? Ага! Так і ёсць — пераблытаў. Пра нягоды — гэта ў другім артыкуле «Статута ўнутранай службы». Некалі ў ваеннай палітвучэльні прымушалі напамяць — вось і засела, ёксель-моксель! Ну, ды і хрэн з ім, з тым матросам. Усёроўна ён, відаць, нічога з той прамовы не зразумеў.

Зразумеў. А паколькі па маладосці заступаў на дзяжурства амаль штодня, то ўперадзе была цэлая ноч. Прыстроіўся пад лямпачкай на скрынцы з ЗІПам, і на аркушы з вучнёўскага сшытка ў клетку напісаў ліст. Да дзядзькі ў Маскву.

«Ас-салом алейкум, Юльчыакя! Хай Алах, усемагутны і справядлівы, пашле табе, тваёй сям'і здароўе, доўгі век, хай твой дом будзе як поўная піяла...

...Юльчы-акя, я не турбаваў бы цябе, але тое, што я маю паведаміць, я магу даверыць толькі табе. Ты — мой дзядзька і разумееш, што апрача цябе пра гэта не павінны даведацца нашы... Ніхто з землякоў, а асабліва са сваякоў...

...Я служу на СКРы, служыць цяжка ў тым сэнсе, што вельмі мала даводзіцца спаць. Тут усталяваны такі парадак, што маладыя матросы, а нават і маладыя афіцэры маюць мала правоў. Вось і мне прыходзіцца амаль кожны дзень заступаць на дзяжурства. Гэта калі карабель наш стаіць ля прычала. У моры лягчэй.

А яшчэ я паводле раскладу па прыборках з'яўляюся прыборшчыкам каюты камандзіра. Гэта значыць тры разы на дзень, па камандзе, я павінен з'явіцца ў тую каюту, вымыць там палубу, пераборкі, подвалак, выцерці пыл, саставіць акуратна кніжкі на паліцы. Увогуле працы няшмат, бо каюта маленькая. Але справа нават не ў прыборцы.

Нават не ведаю, як табе распавесці... Сорамна.

...Карацей — камандзір наш, як я прыходжу на прыборку, зачыняе каюту на ключ і... Ну, ты разумееш, Юльчы-акя? Мне сорамна і балюча, і страшна — ён можа зрабіць са мной што заўгодна. Напрыклад, шапнуць «гадкам», і мяне могуць выкінуць у моры за борт. Тут вельмі злыя «гадкі» — гэта матросы, якія заканчваюць службу. Камандзір ім спрыяе ва ўсім, а яны гатовы выканаць любое яго даручэнне.

Сёння па прычальнай сценцы ішоў вялікі начальнік, адмірал. Я рызыкнуў, збег на сценку і распавёў яму пра тое, што камандзір СКРа мяне амаль кожны дзень гвалціць. І ты ведаеш, што ён мне адказаў? Ён адказаў, што на флоце ўсе знаходзяцца ў палавых адносінах. Што нават з ім (я ледзьве не разрагатаўся, калі ён мне пад вялікім сакрэтам гэта паведаміў — ён зусім стары, і я не ўяўляю, што хтосьці на яго можа паквапіцца) раз на месяц нейкі ягоны начальнік робіць тое ж, што са мной камандзір.

Юльчы-акя, ты жывеш у Маскве і маеш сувязі. Зрабі, каб мяне перавялі на іншы карабель. Інакш мне не жыць...»

***

— Юльчы-мульчы... — незадаволена перадражніў асабіст, разгарнуўшы аркушык у клетку. — Набяруць на флот чурбаноў, а ты правярай, што яны тут панапісалі... Глядзі вось, — сунуў аркуш суседу, — гэта якая мова? Узбецкая, туркменская? Можа азербайджанская? У Маскву піша, Багіраву Юльчы. Сваяку, відаць... Паўсюль распаўзліся...

— Не, гэта, відаць, фарсі... А можа і не... Халера яго ведае! Паслухай, ну якія сакрэты можа гэты чурка напісаць? Што, з-за гэтага аркушыка будзеш перакладчыка шукаць? Невядома з якой мовы?

— Ну, паколькі мы выбарачна правяраем, будзем лічыць, што гэты ліст да мяне не трапляў. Так? Не наптукаеш?

— Кінь дурное...

...Юльчы аказаўся сапраўды з сувязямі. Праз тыдзень на Паўночны флот выправілася камісія. Ажно з ЦК КПСС. Яшчэ два тыдні флот стаяў ракам. Разабраліся з кім папала. І в...блі. У харошым сэнсе, спагнанні аб'явілі. Камандзіра таго пасадзілі. Матросіка перавялі. Сакрэтны загад «Аб выпадках гомасексуалізму на Паўночным флоце» выдалі. Над ім рыдаў са смеху ўвесь ВМФ...

***

Калі продкі сучасных рускіх былі яшчэ цюркамі і вызнавалі паганства, быў у іхным пантэоне бажок, які адказваў за рост насельніцтва. Зваўся «Бацьь». Потым частка цюркаў ад сваёй цюркскасці адракліся і падалася ў славяны, але слова гэтае і вытворныя ад яго перайшлі ў мову, якую «Ламаносаў прыдумаў». А яшчэ пазней, як рускія ў канцы васямнаццатага стагоддзя Літву захапілі і Беларуссю назвалі, тыя цюркізмы і да нас трапілі. След двухсотгадовай каланіяльнай залежнасці.

...Адно толькі слова, а якая безліч нюансаў!



▸ СКРЫЖАЛЬ

# ПЛАЧ НАВАЛЬНІЦЫ. МЕЛОДЫІ

Уладзімір ДУБОЎКА

**15 ліпеня ў беларускай літаратуры юбілейная дата: 110 гадоў з дня нараджэння выдатнага паэта і патрыёта Уладзіміра Дубоўкі, арфейнага лірыка, якога сталінскія апрычнікі змусілі 28 гадоў правесці ў няволі.**

**«Літаратурная Беларусь» палічыла за лепшае апублікаваць не традыцыйны юбілейны артыкул пра паэта, а змясціць адну з ягоных «мелодый», якія, на жаль, мала вядомыя і чытачу XXI стагоддзя…**

## I.

*У снежных далінах, далінах бяскрайных
гарыць і палае пад ветрам паходня.
І носяцца іскры над струджаным краем,
наўсцяж і Заходняй, і Ўсходняй.*

*І песня — не песня, а плач навальніцы,
якая ўзвіецца для помсты праўдзівай.
І слёзы — не слёзы — надзея ільсніцца:
ў змаганні народзіцца дзіва.*

*На дзікім камені, на дзікім і жорсткім
шыпшына не звяла, пасцеле цвяцістасць,
і з гэтай цвяцістасці, з гэных пялёсткаў
паўстане спрадвечная існасць.*

*Даруем усё, што ў стагоддзях крышыла,
той воцат даруем, што вусны паліў нам.
А подласць вам вашу начэпім на шыю,
каб з вамі пайшла і у гліну.*

*У снежных далінах, далінах бяскрайных
гарыць і палае пад ветрам паходня.
І носяцца іскры над струджаным краем,
наўсцяж і Заходняй і Ўсходняй.*

## II.

*На блакіце — ды шэрыя плямы,
кузлаватаю воўнаю смутак.
Недзе родзіцца рэзаны лямант
і нялюдская родзіцца мука.*

*Галасеце лілова, цымбалы,
разлятайцеся з гукамі, думкі.
Груганнё тое села-пала,
і дакуль яно будзе крумкаць?*

*У блакіт кармазінавы пошчак
разам з крыўдай на лёс апантаны.
Дзень мінулы — сцюдзёны нябожчык —
сёння, заўтра — ніколі не ўстане.*

*Расплывуцца, расцягнуцца плямы,
ў іх утопіцца смутак, загіне.
Стане песняю дзікі той лямант,
што завіўся ля любай краіны.*

## III.

*А лясы шалясцяць, шалясцяць,
а вазёры гамоняць сярдзіта.
Зварухнецца аір ля трысця
і замоўкне, у млявасць спавіты.*

*Як з кадзіла, туман навакол,
каляровацю вытканы кволай.
Дзень на смутак сябе накалоў,
і галосяць, галосяць віёлы.*

*Плачуць дрэвы празрыстай расой,
а раса завіваецца ў дэсань.
Сіні, сіні такі парасон
па-над возерам і па-над лесам.*

*На палетках пясочкі-пяскі,
Можа, жыта, а можа, там бульба…
Край мой, край, над табой лёс накпіў,
а чужынцы ў нядолю абулі.*

*Ці багацця бракуе табе,
ці упартасці сціплае мала?
Тая ўпартасць і камень праб'е,
калі кінула цэлым навала.*

*Пранясуцца ў барвовасці дзей
да Дняпра аж з-пад Нарачча хвалі.
Вось цяперака цяжка глядзець,
як радзіму маю ўкрыжавалі.*

*А лясы шалясцяць, шалясцяць,
а вазёры гамоняць сярдзіта.
Адкаснецца уціск небыцця,
край нап'ецца яшчэ аквіты.*

## IV.

*На пясок на жоўты, на пясок стаптаны
я укленчу-стану, галаву схілю.
Ты пашлі, зямелька, для душы бальзамы,
ты прымі, зямелька, крыўду ўсю маю.*

*Нявыказная
катуе
скруха…
Пурпуровыя
рогаты
духу…
Пасцілаецца, сцелецца лісціна,
а бяроза не можа стагнаць.
Прападай, ліха,
хадзі над барамі,
бо тугі вялікай
кайстра не прымае.
А лісцінка з лісцінкай у вянок,
а на песню-надзею не зробяць замок.
Прападай, ліха,
хадзі над барамі,
бо тугі вялікай
кайстра не прымае.
Раскладаюць-паляць ля вазёр касцёр…
Паляцеце, песні, да вазёр, вазёр…
Нявыказная
катуе
скруха…
Пурпуровыя
рогаты
духу…
На пясок на жоўты, на пясок стаптаны
я укленчу-стану, галаву схілю.
Ты пашлі, зямелька, для душы бальзамы,
ты прымі, зямелька, крыўду ўсю маю.*

## V.

*І над лесам так жа, і над пушчай
так жа:
скрозь
дым.
Можа, ён не ўстане, можа, ён абляжа…
Гэта вораг ходзіць у сутане
і жалобай край ускрыў.
Я не веру ў літасць,
я не веру словам.
Нат гавораць пліты…
А маўчыць жывое…
Ходзіць, ходзіць спрытна гэты
новы рыцар:
што
трэ?
А ці доўга будзем моўчкі ўсё карыцца?
Смутак точыць сэрца, точыць грудзі…
Кленчым сціпла на жарсцве.
Колькі абяцанняў —
колькі подлых дзеяў!
Што, калі паўстанем, —
дзе тады вас дзенем?
І над лесам стане, і над пушчай стане:
скрозь
дым.
Гэта будзе помста, гэта будзе Ранне.
Закасуем межы, згіне Ростань.
Кон адзін: ці вы, ці мы.*

## VI.

*Колькі іх!
Гаманілі з гаем.
Гаманілі з полем.
Гаманілі з жытам каласістым.
Колькі іх!
Працавалі рана.
Працавалі позна.
Працавалі, сілу слалі лістам.
І аруды парожныя
сіратою
заўсёды,
невыходнаю госцяй
у хлебе
мякіна.
І чужынцы збіралі —
складалі
слодыч —
колькі іх! —
як і ўся краіна.
Помста йдзе!
Галасіла поле.
Галасілі стрэхі.
Галасіў чарнобыль на памежку.
Помста йдзе.
Напілося болем,
напілося рэха,
напіліся крыўдай тыя сцежкі.
І сціскалася ў вусны
невыказнае
гора,
і тапілася ў вочах
часіна
адплаты,
каб за тое за ўсё,
што сягоння
і ўчора
вогнішчамі
абшары палатаць.
Ці за тым?
Павязалі рукі,
павязалі ногі,
павязалі цела, —
дух звязаць не можна…
Ці за тым?
Завязлі на мукі,
завязлі на рогат,
завязлі на здзек чыноў вяльможных.
Гаманілі хвалі —
расхадзіўся
Нёман,
Гаманілі хмары —
неба
спахмурнела.
Гэта мы залічым,
гэта —
мы успомнім,
калі словы стануць
агнявай дзеяй.
А цяпер —
Пакрышэце косці,
пакрышэце гэтым,
пакрышэце новым невядомым.
Трэ цярпець —
вецер помсту носіць,
вецер будзіць нетры,
вецер ад усходу будзіць міліёны.
І за ўсё — за мукі
і за воцат
горкі,
І за ўкрыжаванне гэтых
і наступных, —
на Ушэсці скажа
дух нязломны горда:
— Мы пазналі радасць —
вы пазнайце смутак!
Колькі іх…
Гаманілі з гаем,
гаманілі з полем.
Гаманілі з жытам каласістым.
Колькі іх…
Працавалі рана.
Працавалі позна.
Працавалі, сілу слалі лістам.
Іх усіх іменне
святкаваць прымусім
мы рабоў вяльможных:
злосць жа іх —
ад страху.
За братоў маіх
змагарнай Беларусі
стаўлю ў песні помнік
на Усход і Захад.*

## VII.

*Неба сіняе, сіняе вельмі,
але сіньшая ў вочах туга.
Не сатканы такі йшчэ вэлюм,
каб тугу ад свету схаваць.*

*Пурпуровасць каліны, пунсовасць,
кармазінавасць дзікіх малін…
Радасць знаюць сычы і совы,
людзі радасць каму аддалі?*

*У ночы цёмнай, у засціле цмянай
знічкі гінуць на хвалях вазёр.
Зіхатлівыя, сумныя плямы
пракладаюць сцежкі ад зор.*

*Спавіваюцца хмарамі зоры:
сцежкі ёсць — не натрапіць ніяк.
Мне казаў мой таварыш учора,
што рассыпала восень мак.*

*Топчуць вельмі малое зерне,
каму толькі ахвота і час.
Вось назад гэта зерне не збераць:
гэтага — не прычакаць.*

*Ды малое яно — аж надта,
пад вялікі абцас не ідзе.
Пры вясковай хаце бахматай
узрасце і ў радасці, і ў бядзе.*

*Пурпуровасць каліны, пунсовасць,
кармазінавасць дзікіх малін.
Радасць знаюць сычы і совы,
людзі радасць каму аддалі?*

*Пазлятаюць пялёсткі з шыпшыны —
ў дзіды ўпартасць кладзе яна.
Ах вы, сцежкі роднай краіны,
пасля восені — будзе вясна!*

## VIII.

*Непакоем я сяння ускрыты,
кажуць — сумныя песні мае…
…Новыя словы, новыя рытмы
поўнай жменяй жыццё дае…*

*Сам казаў, дык няўжо забыўся?
Чаму кленчым тузе да ног?
Я пабачыў надхмарныя высі,
я пабачыў марскоe дно.*

*І знайшоў гэты смутак з фэрмато,
пакахаў, калі хочаце чуць.
Мо й загіну каняй заклятай —
краю роднаму доўг заплачу.*

*Песняры прыйдуць новыя скора
і адкінуць абоймы тугі.
Ушануюць мажорна акорды
тых, што ў мінорах ляглі.*

*Скажуць гэныя новыя песняй:
— Смутак моцнае сэрца размыў.
На парозе Вялікай Прадвесні
паніхіды складаў для зімы.*

*Ой, фэрмато, шырай і вышай,
ой, акорды, акорды — ў прастор!
Ужо дзень на дарогу выйшаў,
свае рукі над намі прасцёр.*

*Я вітаю яго, я вітаю,
заклікаю — хутчэй, хутчэй…
……………………………
Ці праклятая, ці святая
мяне раніць прадоннем вачэй…*

**18.I.1926**

АПОВЕДЫ

# САКРАМЭНТА

Галіна БАГДАНАВА

## ПРОФІЛЬ НА ПЯСКУ

*Ля вытокаў салярных знакаў*

Асляпленая сонцам. Сонцам і болем. Таму што нарадзіць дзіця не толькі прыемна, але і балюча. Доктар, што зазірнуў да нас у палату, як і мы, быў асляплены сонцам і, да таго ж, быццам аглух. Хацця, здавалася, стагналі, енчылі ад болю нават панылa-блакітныя сцены.

— Чаго вы ўсе крычыце?! — усміхаўся ён у вусы. — Сёння ж ва ўсіх вас свята. Сёння ж для кожнай з вас самы радасны і сонечны дзень. У вашых сем'ях у гэты дзень цяпер штогод будзе свята.

Свята — значыць святое. Асвечаная, спавітая хваляваннем і радасцю Таямніца. Я й цяпер да драбніцаў памятаю той сонечны дзень. Калі ў радзільнай зале, падарыўшы свету сына, я зараз жа забылася на боль, перастала адчуваць яго. Адзінае, напружана ўслухоўвалася і не чула чаканага сынава голасу. А мяне ўжо змусілі праваліцца ў бездань наркатычнага сну. Трэба было мяне падраманатаваць, каб праз год я здолела вынасіць і зноў, скрозь боль, быць асляпленай сонцам і нарадзіць яшчэ аднаго сына. Падарыць сабе і свету яшчэ адно свята. Яшчэ адну Таямніцу. Але да гэтага яшчэ далёка. Пакуль што мяне змусілі забыцца, заснуць, ператварыцца ў бязвольную знямелую субстанцыю.

Мяне паглынула бязважкасць, бяздонны калодзеж у нікуды. Ён зацягваў мяне, ці ўжо й не мяне... І там, у глыбіні, у часавай бездані я зноў была асляпленая сонцам, сонцам, якое люстравалася ў ціхай павольнай рачной плыні, награвала мяккі, амаль белы пясок, падсвечвала смарагдам росную траву, аплятала жывым, пульсуючым павуціннем бурштынавых ценяў гонкія хвоі, лашчыла мяне і ...майго сына. А ён, мой сын, ужо падлетак, таму не зусім голенькі, а, так было прынята ў нашым племені, у набедранай павязцы, нешта засяроджана маляваў на вільготным пяску.

На мне таксама была набедраная павязка, дакладней, кароценькая спаднічка з папаратніку. Даўжэйшую, з поўсцю, я пакідала на халады. На грудзях прыемна ласціліся, студзілі мяне мае любімыя бурштынавыя пацеркі, сонечныя кропелькі з татэмам племені –іклам нашага агульнага прапрашчура — сівога ваўка. Налета і майму сыну дадуць такія ж. Але ў мяне воўчы ікл асаблівы, на ім ёсць таемны малюнак — кружок з кропачкай пасярэдзіне, маленькае «вочка», сонечны знак. Ён набліжае мяне да сонца, саграе, надае сілы. Пакуль што гэты таемны сонечны знак ратуе і мяне, і майго сына. Так будзе да наступнага лета. А далей мой сын сам будзе тварыць сваё жыццё і яго будзе ахоўваць ягоны ўласны татэм. А яшчэ сілы нам з сынам надаюць зёлкі. Мяне навучыла разбірацца ў іх мая бабуля. І цяпер нават Відушчая і тая карыстаецца маімі парадамі і маімі зёлкамі. Галоўнае, сабраць і высушыць іх у пару, у самую іх пару, калі яны ўжо назапасілі і прагнуць перадаць сваю сілу.

Зараз я толькі што выйшла з лесу. І расклала на траве цэлы ахапак зёлак. Перабяру і пакладу сушыць. Больш за ўсё, як заўжды, святаянніку, мноства прамяністых, нават на дотык цёплых кветачак. Цёплых... Ці, можа, мне гэта толькі здаецца?

— Ай! — гукнула я сына.

Ён як бы і не пачуў. Што ж, я не крыўдую. Я ведаю, мілы мой Ай, калі ты пачынаеш маляваць, ляпіць ці выразаць з косці, забываешся на ўсё. Мне здаецца, што калі ты малюеш ці выразаеш звера, то наяве чуеш ягоны рык ці тупат, чуеш, як наганяюць яго паляўнічыя. А калі гэты звер не драпежнік, а які-небудзь высакародны алень, які зусім знясілеў, які задыхаецца і вось-вось упадзе... Тады ты, калі ўжо выпушчаная найлепшым нашым паляўнічым страла кранае прыгожае, гнуткае цела жывёлы, раптам, як усемагутны Стваральнік, выхопліваеш аленя з-пад стралы. З рэальнасці — у сон, у мрою. А з мроі той нараджаецца ягоны вобраз, выразаны з косці, жывы на дотык вобраз.

Тваіх касцяных і драўляных аленяў шкадуюць забіваць нават тыя, хто мусіць настроіцца на паляванне, мужчыны, якія выконваюць магічны танец і па традыцыі пускаюць стрэлы ў зробленых з косці, дрэва, ці намаляваных звяроў. Відушчая заўважыла гэта. І цяпер, калі бярэ ў рукі чурынгу, каменную пласціну, на якой высечаны зразумелыя толькі ёй рысачкі і кропкі ( паводле іх яна каменем аб камень выстуквае для ўсіх рытм), дык вось, цяпер, калі яна бярэ ў рукі чурынгу, то кладзе паляўнічым не тваіх звяроў. А тых, якіх калісьці выразаў твой бацька. Баіцца, што мужчыны пашкадуюць твае вывы, не стрэляць, не патрапяць у іх, і паляванне будзе няўдалым.

Ты, ведаю, крыўдуеш, нервуешся. А я ўпотай вельмі табой ганаруся. Стварыць тое, што спыняе стралу, значна цяжэй, чым тое, што яе прыцягвае. Забіваць у нашым племені ўмеюць усе. Шкадуюць адзінкі. Ты ж, мой сын, твае звяры, вы здолелі расчуліць усіх, нават самых жорсткіх. А калі летась цябе, Ай, дзеля выпрабавання ўпершыню ўзялі на паляванне і ты разам з усімі высачыў аленя, старэйшыя, як мне потым расказвалі, хацелі саступіць, даць табе стрэліць першаму. І ты, стаіўшыся ў кустах, ужо заклаў стралу, нацягнуў цецяву, але ў апошняе імгненне перадумаў, спыніўся і ўвогуле адкінуў стралу убок. І тады адразу стрэлілі трое з тых, хто заўжды нападатове, стрэлілі і смяротна паранілі аленя. І разам з аленем упаў на траву ты, мой Ай. Так расказвалі мне мужчыны. Ты тады ледзь не страціў прытомнасць. А потым так плакаў, кідаўся, крычаў па начах, што мне давялося адпойваць цябе зёлкамі. І наш Галоўны, Важак, паглядаючы на цябе, толькі ківаў галавою:

— Нічога не паробіш, будзе, як бацька, мастаком.

А мы, жанчыны, даўно ведалі, што ты не такі, як усе, што ты незвычайны. Можна было і не браць цябе на паляванне, не правярацаь. Нарадзіўся ты, абкручаны пупавінай, і цябе ледзь уратавалі, ледзь прымусілі падаць голас, закрычаць. І ты не крычаў, як усе, доўга і нудна «Аааа-аааа-ааа!», не агукаў, ты крыкнуў гучна і раз усяго:»Ай!».

Відушчая, кажуць, як толькі дазналася пра тое, як ты нарадзіўся, адразу сказала, што ты будзеш не такі, як усе. Што вялікі дар табе будзе дадзены: дар лячыць або маляваць. А я цябе так і назвала — Ай.

Ты з'явіўся на свет на самым пачатку лета, калі сонца заткала зямлю зялёнінай і кветкамі, калі ўсё навокал, вітаючы тваё з'яўленне, спявала і танчыла. І дзіўны салодкі кветкавы водар кружыў мне галаў, хмяліў да самазабыцця.

Але ж усе ведаюць: важна не толькі, як і калі чалавек быў народжаны, але і як, калі быў зачаты. Мы з бацькам прадвырашылі тваё з'яўленне ўвосень. Цёпла было, цёпла і парна. Грыбоў — не сабраць. Баравікі. Белыя, чорнагаловікі. Тыя, што растуць пад дубамі і ў хваёвым бары. Сярод грыбоў траплялiся і тыя, якія можна есці не варыўшы. Мы з тваім бацькам мелі кожны свае грыбныя мясціны, і цягалі грыбы кашамі. Ды толькі не спяшаліся браць. Любаваліся. І там, у лесе. І потым, калі перабіралі. Кожны ж грыбок непаўторны. Кожны грыбок — адкрыццё. Адкрыццё прыгажосці. Мяккі вільготны мох, а ў ім моцная, пругкая ножка, гладзенькі капялюшык... І нашыя пацалункі там, у засланым цёплым туманам, росным, засыпанным апалаю лістотай, іглiцай восеньскім лесе, тыя пацалункі таксама былі для нас адкрыццём, якое вяло да разгадкі таямніцы зачацця, тваёго зачацця, Ай. Так дождж лашчыць зямлю, каб узгадаваць кінутае ў яе зерне. Колер зярнятка, колер семені, колер малака. Наш колер. Ён ёсць небеснае святло, нашая повязь з небам...

Твой бацька ляпіў, выразаў, выбіваў з каменю жанчын, якіх мы завем — Маці або Рода. Ты шмат разоў бачыў іх, яны стаяць ці ляжаць амаль у кожнай хаце, на невялікім узвышэнні. З нашаю Родай ты, калі быў малы, нават гуляўся. А ў Відушчай захоўваецца самая вялікая Рода. Яе таксама выбіў з каменю наш бацька. У яе крутыя клубы, круглы, як гарбуз, зад, чэрава, у якім зручна будзе дзіцятку. Грудзі — кожная па яблыку. Усё самае сакральнае ясна пазначана. Нашая Рода, тая, што ляжыць у нас, касцяная, крыху меншая. Але ў яе таксама вялікі акруглы зад і грудзі па яблычку. Аднойчы, ты яшчэ малы быў, патрымаў яе ў руках, пагладзіў і запытаўся:

— А чаму ў яе няма вачэй? Твару зусім няма. Уся галава — і ззаду, і спераду — рысачкі, рысачкі, кропачкі. Ізноў рысачкі.

— Твар, Ай, пазначаць нельга, — паспрабавала я патлумачыць. — Твар, вочы ёсць толькі ў жывых. Так казаў твой тата. А яму пра тое сказалі наш Галоўны і Відушчая. Гэтыя жанчыны, Роды — знак, сімвал урадлівасці, знак плоднасці. Каб у каласках было шмат зярнятак, а на яблыні — яблычкаў. І ў цябе, Ай, з'явіліся брацікі і сястрычкі. Вялікае чэрава ў яе для таго, каб вынасіць дзіця, а вялікія грудзі, каб потым выкарміць.

— Але ж ты не такая, — сказаў ты, Ай, і зірнуў на мяне...

Так, як калісьці ў цёплым грыбным восеньскім лесе глядзеў на мяне твой тата. У цябе, як і ў яго, вялікія шэра-блакітныя вочы. Але не, нават па колеру яны ў цябе цяплейшыя. Не як сцюдзёная крынічная вада, а як мяккая павольная рачная плынь. І гэтая плынь лашчыць мяне, люляе. Заваражвае... Аднойчы, калі я прыбірала ў хаце і, узяўшы ў рукі Роду, пра нешта задумалася, ты раптам сказаў:

— Калі я вырасту, абавязкова намалюю ці не, выражу твой твар, мама.

Ты ўсміхнуўся, а я спужалася. Паклала Роду на месца. Добра, што ў хаце нікога не было. Усе пайшлі на паляванне. А каб хто пачуў, нават за словы маглі пакараць. Рода мусіць быць без твару. Яна — толькі пасудзіна, змясцілішча нябеснага, сонечнага святла. У яе не можа быць твару. Гэтая наша Рода — апошняя з тых, што паспеў выразаць твой бацька тою сцюдзёнаю зімою, калі я насіла цябе, мой Ай, у сабе. Маё цела было для цябе надзейнаю хованкай і ад холаду, і ад голаду. Тою зімою маё цела было для цябе, як сонца, сонечнае святло для ўсіх нас. Яно таксама аберагае нас, ахоўвае.

Ты, пэўна, ніколі не звяртаў на тое ўвагі, але сёння я абавязкова табе гэта пакажу. У нашай Роды не проста пупок — кропачка, абкружаная лініяй. Сонечны знак. Такі самы, як на іклы Сівога ваўка, які я заўжды нашу на грудзях. Бацька пакінуў нам Роду з гэтым знакам наўмысна. Каб сонца бараніла нас.

Я памятаю, як твой бацька выразаў гэты знак. Выразаў і паказаў на мой жывот, дзе ўжо раз-пораз ты тупаўся, латашыў ножкамі. Дзіця ў чэраве маці, як усе мы пад покрывам сонечнага цяпла. Бацька любіў усё пазначаць такімі сонечнымі знакамі. А аднойчы ён такі кружок з кропачкай намаляваў палачкай на снезе. А да яго дадаў галоўку, ручкі-ножкі — і на мяне паказвае, маўляў, я цяжарная, падобная на сонца. Для цябе, да нараджэння, сонцам, ахоўнаю абалонкай была я, твая мама.

Прыйшла вясна, пацяплела. Снег сыйшоў. І твой бацька па загадзе галоўнага і Відушчай, пакуль мужчыны ўзаралі, а потым разам з жанчынамі засеялі поле, мусіў вылепіць з гліны, самай тлустай глебы, — Роду, як заўжды з крутымі гладкімі клубамі і грудзьмі па яблыку. І... Сёння, Ай, увечары, ля вогнішча, калі ўсе лягуць спаць, я адкрыю табе адну таямніцу. Бацька тою вясною парушыў табу, зрабіў тое, што цяпер, я адчуваю, па вачах тваіх бачу, задумаў зрабіць ты... Ён тады вылепіў Роду з тварам, маім тварам. І яна, я праз яе перадала сілу свайго цела зямлі. Каб і яна, зямля, радзіла. Дождж амыў зямлю. І з двух маіх зярнятак-вачэй таксама выраслі каласкі. Мне дасюль не дае спакою тое, што з маіх, пазначаных зярняткамі вачэй выраслі каласкі.

Калі ты з'явіўся на свет, сонца яшчэ не паспела ім перадаць свой залаты колер, але яны, убіраючы нябесную і зямную вільгаць і сонечнае цяпло, набывалі малочную спеласць і зелянелі, як... мае вочы. А побач красавалі васількі. Не яркія, светла-блакітныя, халаднаватыя. Жывыя. Як бацькавы вочы.

Ніхто мне так і не паказаў, дзе ягоная магіла. Спачатку мне сказалі, што твой тата выконвае нейкае таемнае даручэнне і яго нельга трывожыць. Калі ты нарадзіўся, я папрасіла Відушчую паклікаць твайго тату, а яна строга папярэдзіла:

— Забудзься на яго. Ён парушыў табу. Пакуль ты была



цяжарная, мы не хацелі цябе трывожыць. А цяпер ведай: ён вылепіў Роду з тваім тварам і тваімі вачыма. І яго ніколі больш не будзе ў нашым племені.

Ні слёзы мае, ні просьбы паказаць хаця б, дзе яго магіла, нічога не далі.

— Ён пайшоў да сонца, — сказала Відушчая.

З таго часу нашае племя жыве без мастака. У нас змяніліся тры Галоўных, Відушчая з моцнай жанчыны ператварылася ў нямоглую старую. Аслепла. У нашага племені цяпер сляпая Відушчая. А мастака так і няма. Відушчая ўпэўнена, што ты хутка зможаш стаць нашым мастаком. Толькі для гэтага табе трэба навучыцца выразаць аленяў, ад якіх не будуць адварочвацца стрэлы, якіх не будуць шкадаваць, якіх з лёгкім сэрцам заб'юць паляўнічыя падчас рытуальнага танца, каб потым паўтарыць усё на паляванні. Толькі ж хіба можна забіваць з лёгкім сэрцам?

— Ма!

Я злякнулася. Я забылася, што перабіраючы зёлкі, гавару, шапчуся сама з сабою...

— Ай, ты клікаў мяне?

— Хадзі сюды, нешта пакажу!

Пакінуўшы зёлкі, я пайшла бліжэй да ракі. Пясок яшчэ вільготны, пругкі, несыпучы, зацалаваны сонцам, ужо пацяплеў. Але на ім заставаліся сляды. І на гэтым светлым, амаль белым пяску аднымі лініямі, тонкімі, лёгкімі, як птушыныя пёркі лініямі быў выпісаны жаночы твар, так, як калі на жанчыну глядзець збоку. Высокі лоб, глыбока пасаджаныя вялікія вочы. Прамы, з ледзь заўважнаю горбінкай нос, тонкія вусны, мяккі падбародак. Даўгая лебядзіная шыя. Партрэт быў яшчэ няскончаны, яшчэ імклівымі лёгкімі хвалямі клаліся, набягаючы, даўгія, зблытаныя мае валасы. Але не пазнаць было немагчыма.

Занадта доўга разглядала я сябе сёння ў вадзе, калі купалася. І вось так, бокам, таксама станавілася. Так меней зморшчынак, чысцейшая лінія. Так прыгажэй.

З хваляваннем, не, маё хваляванне адразу сталася трывогай, жахам, з трывогай і жахам я зноў падышла да ракі, зайшла ў ваду. Нахінулася, прыгледзелася і... патанула ў сваім адбітку, у імклівай плыні часу.

...– Група крыві! Якая ў яе група крыві?! — даляцела да мяне аднекуль зверху.

І я чыста інстынктыўна адразу адрэагавала, азвалася:

— Першая! Чуеце, першая! — закрычала, як мне падалося, закрычала я на ўсю моц, так, што рэха аглушыла мяне.

Але наяве мяне не пачулі. Бо, як потым казалі дактары, гэта быў нават не шэпт, а ўздых. Давялося сабраць усе свае сілы, вынырнуць, пераадольваючы зямное прыцягненне, узляцець, выбрацца з бяздоннага калодзежу часу.

— Першая!

Толькі цяпер яны, здаецца, мяне пачулі. Яны, гэтыя людзі ў белых халатах урэшце рэшт пачулі мой голас, мой крык, які наяве стаўся шэптам.

На твары маім ужо не было маскі з наркозам. І я, аблізнуўшы засмяглыя вусны, спыталася:

— А чаму ён не крычыць?

І акушорка з усяе сілы ляпнула малога па кволенькаму заду.

— Ай! — азваўся мой сын, мой першынец. — Ай! Ай!

Мы ж з ім так і не паспелі сцерці, затаптаць малюнак. Там, у глыбіні, па той бок калодзежу часу, ля ракі, на вільготным, нагрэтым сонцам пяску засталіся нашыя з сынам сляды, застаўся мой профіль. І сонечны знак. Я паспела намаляваць яго дзеля перасцярогі. Ці, можа, гэта зрабіў мой сын... Кружок з кропачкай. Пуп сусвету. Зярнятка.

Дзіцятка ў космасе майго цела.

## ЗАГАДКА ЛЕАНАРДА

***Дыялог праз люстэрка***

— І бачу я: дрэвы і кусты вялікіх лясоў пераўтворацца ў попел... Дрэвы і кусты вялікіх лясоў ператворацца ў попел... Колькі разоў трэба паўтарыць гэтую загадку, каб нарэшце наяве ўбачыць: дрэвы — гэта дровы. Дрэвы-дровы...

Па-беларуску ўсяго адна літара. Леанарда ад гэтае слоўнае фантасмагоніі прыйшоў бы ў захапленне і абавязкова вывучыў беларускую мову. Мову, у якой ёсць гэткі просты таемны код да разгадкі. Ён абавязкова вывучыў бы беларускую мову, якая па меладычнасці не саступае яго роднай італьянскай.

Дрэвы-дровы... Адна літара — і вялікае, глабальнае, касмічнае (ахопленыя полымем дрэвы так убачыш хіба што з касмічнай вышыні) ператвараецца ў малое, мізэрнае — у попел, які можна ўзяць на далонь, дзьмухнуць — і ён разляціцца, ператворыцца ў нішто.

Хтосьці, назіраючы за пульснымі, мігатлівымі вугельчыкамі ў печы, бачыць у аксамітным паўзмроку яе ўлонне зорнае неба, космас. А нехта, гледзячы туды, як Леанарда, усведамляе, што там, у печы, дагарае лес, дрэвы, кусты вялікіх лясоў... Дрэвы-дровы. Усяго адна літара... І глабальнае пераўтварэнне.

...З гэтымі думкамі я падышла да люстэрка. Яшчэ мокрыя ад дажджу мае валасы цяпер кучаравіліся мацней, чым зранку. Цяпер зразумела, чаму сёння адзін з вучняў, калі я паказвала «Мону Лізу», спытаў: «А Вам ніхто не казаў, што Вы да шаленства падобная на Мону Лізу, на Джаконду?».

«Не... Вы будзеце першы,» — разгубіўся я. І гэтая разгубленасць дасюль рэхам стыне ў маіх вачах... А што, калі гэтыя мае кучарашкі прымацаваць як бараду. Вось так... Вадаспадам... У паўзмроку з залюстроўя на мяне раптам зірнула ўжо не Джаконда, на мяне зірнуў сам Леанарда. Не разгубленасць, ніякаватасць, а лёгкая іронія іскрылася ў ягоных зрэнках. Чыста мужчынскі рацыяналізм і скепсіс... Розум аналізуе. Душа сінтэзуе. Вобраз нараджаецца не ў галаве, у сэрцы. І душа пераўтварае яго ў рэальнасць, акрыляе яго...

Якія дзіўныя бываюць супадзенні. Той мой вучань, які ўбачыў ува мне Джаконду, можа, на сёння адзін з самых таленавітых на Беларусі юных скульптараў, цяпер, у нашым стагоддзі амаль дакладна паўтарае лёс Леанарда. Яго, як і калісьці геніяльнага Леанарда, кінула маці. І ён не ведае, дзе зараз яна блукае.І ці блукае ўвогуле...

Адзін з даследчыкаў творчасці Леанарда знайшоў запіску, дзе была ўсяго адна фраза: «Сёння памерла Кацярына». Лічыцца, што гэта ён пра маці, сваю маці, якую не бачыў шмат гадоў. Эпоха Адраджэння, якая падарыла свету ўзоры бездакорнага ўзнёслага гуманізму, наяве была і жорсткаю, і крываваю.

— Чалавек прагне дасканаласці, гармоніі, сіметрыі і паўнаты. Дзяўчынка з самага нараджэння бачыць свой люстэркавы адбітак, сваё адлюстраванне ў бацьку, бачыць, якою б яна была, каб нарадзілася мужчынам. А хлапчук — у маці. Я не памятаю, амаль зусім не памятаю сваю маці. Таму маё жыццё — вечнае блуканне ў залюстроўі. У пошуках майго другога «я», у пошуках жанчыны, якая б магла ўвабраць у сябе маю беспрытульную душу... — Калісьці я ўжо чула гэты голас. І гэтае перарывістае дыханне... Так гаворыць мой вучань, той, які сказаў, што я падобная на Джаконду...

— Я быў вельмі паслухмяным, паверце, я быў самым паслухмяным з усіх маіх братоў і сясцёр. Адзінае... Надта не любіў есці тварог... І мама, мая мама будавала мне з тварагу замкі... А потым яна пайшла і не вярнулася...

Я глядзела ў ягоныя вочы. Сумныя, самотныя зеленаватыя вочы... Цяпер я разумела, гэта былі вочы Леанарда. А ў памяць наплывалі новыя загадкі, якія сама сёння загадвала вучням. І якія так хутка разгадваў той мой вучань. І новыя, яшчэ нідзе не зафіксаваныя...

... І бачу я, як вадзяныя жывёлы паміраюць у кіпені...

— Чаму ўсе Вашыя загадкі нагадваюць сцэны страшнага суда? — спыталася я ў Леанарда.

— Які Страшны суд? — ён не ўсміхнуўся, пасміхнуўся мне з Залюстроўя... — Гэта ж рыба. Вы што, ніколі не варылі з яе, як там па-вашаму... юшку?

— Як проста...

— Усё складанае наяве проста. Толькі трэба дакладна ведаць, з якога боку да яго падступіцца...

— Вы, Леанарда, пэўна, таму так шмат паспелі ў жыцці. Паспелі, таму што ведалі, як складанае пераўтварыць у простае, а ў простым угледзець цэлы космас. Сусвет... Усе вашыя творы — гэта сама...

— Недасканаласць. Вы хацелі сказаць дасканаласць, але ўсе мае творы — сама недасканаласць. І мелі рацыю тыя, хто здзекваўся з мяне, смяяўся.

— Гэта, пэўна, былі вельмі недалёкія, тупыя людзі.

— Ды не... Сярод тых, хто смяяўся з мяне, былі нават геніі.

Леанарда адвёў, апусціў вочы. Адышоў убок. І скрозь люстэркавую смугу я ўбачыла вуліцу... На лавачцы сядзелі, нешта абмяркоўвалі некалькі маладых італьянцаў. Па іхнім адзенні я здагадалася, што яны жывуць у эпоху Леанарда. Прыслухалася.

— ...Так казаў Дантэ. Але што гэта значыць...

— Спытаемся ў Леанарда. Вунь ён кіруе сюды ад царквы Санта-Трыніта.

Лёгкаю хадою той якраз праходзіў побач. Ад просьбы сумеўся, разгубіўся. Але тут з ім параўняўся і, злёгку кіўнуўшы, пайшоў далей не хто іншы, як Мікеланджэла. Леанарда з хваляваннем гукнуў яго:

— Можа, ты патлумачыш гэтым людзям адзін урывак з Дантэ?

Мікеланджэла рэзка павярнуўся і груба кіўнуў:

— Не-не. Растлумач лепш ты, ты, які зрабіў праект бронзавага каня, але не змог адліць яго і, да сораму свайго, пакінуў яго недаробленым.

Леанарда пачырванеў. Мікеланджэла ж кіўнуў яму здаля:

— І гэтыя тупагаловыя міланцы маглі паверыць табе!

Леанарда, счырванелы, разгублены, падняў да мяне свае вочы. Я ўсё зразумела і паспрабавала суцешыць яго:

— Не трэба, не трэба нічога тлумачыць. Гісторыя ўсё расставіць на свае месцы. Я ведаю, шаноўны, дарагі Леанарда, чытала пра тое, што сталася. На ваш час, як, зрэшты, і сёння, мастакі не маглі абысціся без багатых заказчыкаў. А фларэнтыйскія банкіры Медычы любілі надуманыя творы і занадта вытанчаную, далёкую ад рэальнасці манеру. Не для Вас. І Вы вырашылі перабрацца з Фларэнцыі ў Мілан, дзе цараваў герцаг Ладавіка Мора, які даў Вам магчымасць выявіць сябе ва ўсім.

— Перш чым паехаць у Мілан, — усміхнуўся з залюстроўя Леанарда, — я напісаў герцагу ліст, у якім падрабязна пералічыў усё, што ўмею... І найперш пра тое, што датычыць ваенных вынаходніцтваў. Усе ўладары ў наш час любілі ваяваць. «Я ведаю спосаб рабіць надзвычай лёгкія масты, — пісаў я, — якія да таго ж лёгка пераносіць, і іх можна выкарыстоўваць для праследу ворагаў і для ўцёкаў ад іх...». А пра свае мастацкія здольнасці толькі ў канцы: «У мірны час я спадзяюся вытрымаць спаборніцтва з кожным у архітэктуры, у пабудове дамоў... Я таксама бяруся ў скульптуры, у мармуры, бронзе або гліне, як і ў жывапісе, выканаць усё, што магчыма, не горш за кожнага, хто жадае памерыцца са мною». Але для багатых людзей нашага часу важней былі ваенныя вынаходніцтвы...

— І Вы прыдумалі танк, падводную лодку, парашут...

— Людзям у будучым давялося ўсё вынаходзіць і называць нанова. Але для мяне гэта былі вымушаныя вынаходніцтвы. Я іх рабіў дзеля таго, каб мець магчымасць займацца мастацтвам. Кожная краіна мусіць мець моцную армію, каб пад яе аховаю мастакі і паэты маглі спакойна ствараць шэдэўры. І мне давялося выстройваць сваю лінію абароны.

— Але ж Вы, як пішуць, афармлялі святы, рабілі эскізы касцюмаў і зброі, чыталі герцагу і ягоным гасцям байкі, гралі на розных музычных інструментах...

— Самае цудоўнае, што я паспеў зрабіць у Мілане, гэта канструкцыя, якую я прыдумаў, каб увасобіць рай. Рухаліся па колу планеты, мігцелі зоркі, потым з'яўляліся знакі задыяка. Калі акцёры пачыналі чытаць вершы, здавался, яны вымаўляюць словы неба, словы самога Бога.

Леанарда зірнуў мне проста ў вочы. І ягоны позірк, падалося, апёк маю душу. І праз люстэрка апёк. Але я, імгненна змоўчаўшы, працягвала:

— А яшчэ ў Мілане Вы напісалі партрэт каханай герцага Мора Цэцыліі Галярні. А потым пачалі працаваць над помнікам у гонар яго бацькі Франчэска Сфорца, тым самым конным манументам, з якога так жорстка пакпіў Мікеланджэла. Мы можам меркаваць пра веліч Вашай задумы толькі паводле малюнкаў і невялікай групы з бронзы. Калі на пачатку XVI стагоддзя пачалося французскае нашэсце, салдаты Людовіка XII стралялі па глінянай мадэлі помніка, як па мішэні. Вы тады з'ехалі з Мілана... І, дзіўна, не затаілі крыўды на французаў. Больш за тое, свае апошнія дні пражылі пры двары французскага караля Францыска І.

— Я шукаў, дзе мяне зразумеюць... Цяпер магу сам сабе прызнацца, я быў вельмі, страшэнна няўпэўнены ў сабе чалавек. І я прывык, звыкся з няўдачамі... Але тады я з'ехаў з Мілана ў Фларэнцыю, каб там напісаць ці не самы дарагі для мяне твор. Я яго не аддаў заказчыку. Я з ім не развітваўся да самай смерці. Там, у Мілане я сустрэў...

Я чакала, што Леанарда назаве імя, але ён задумаўся і замоўк. Давялося працягваць самой:

— Вы сустрэлі Мону Лізу дзі Антоніа дзі Кольдзі Герадзіні, жонку фларэнтыйскага купца Франчэска дэль Джаконда? Або знатную неапалітанку Канстанцыю д'Авалас? Навукоўцы дасюль ніяк не вызначацца...

— Няхай гэта застанецца таямніцай. Мона Ліза, дык Мона Ліза. Ёй было 24, мне — 42.

— 24-42, — паўтарыла я і напісала лічбы на паперы, — Ізноў люстэрка. Люстэркавая сіметрыя. Нават страшна робіцца. Вы, праўда, тры гады пісалі яго, гэты партрэт?

— Так, і скончыў у 1503 годзе.

— Паўтысячагоддзя прайшло.

— І вось мы зноў сустрэліся, — сказаў Леанарда і неяк сумна ўсміхнуўся, — Цяпер не ў рэальнасці. Праз люстэрка часу. Я сам вынайшаў гэтае люстэрка. І вось з'явіліся Вы. Жанчына з будучыні. Толькі я не буду пісаць Ваш партрэт. Лепш, чым «Джаконда», я ўжо ніколі нічога не напішу.

— Вашыя сучаснікі сведчаць, што, калі яна Вам пазіравала, Вы запрашалі і музыкаў, спевакоў з лірамі, і блазнаў, каб развесяліць яе, зняць з твару меланхолію...

— І яшчэ я чытаў ёй свае вершы...

— Вершы? Вы пісалі вершы? Мы ведаем, што вершы пісалі Мікеланджэла, Рафаэль. Але Вы... Трактаты, загадкі, байкі... гэта вядома. А дзе ж яны, Вашыя вершы зніклі?

— Я іх не запісваў. Толькі чытаў. Для яе. Потым усё ж вырашыў перапісаць, не простым шрыфтам, люстэркавым. Так, каб іх можна было прачытаць толькі з дапамогай люстэрка. Падарыў ёй. А яна, напэўна ж, схавала, а можа і выкінула тыя паперкі. Каб муж не заўважыў. Але яны, тыя вершы, я ў гэтым упэўнены, засталіся ў яе чароўнай таямнічай усмешцы. Яны пульсуюць у яе жывых вачах...

— А на зямлі ўсё іначай, — міжволі прамовіла я.

— Вось-вось... Тады ў ёй я ўбачыў самога сябе. Як у люстэрку. І каб я быў птушкай, я б навучыў яе лётаць. І мы б узляцелі. І мы б адляцелі туды, дзе пануе найвышэйшая гармонія. А так... Мы проста раставалі адно ў адным. Ці гэта мне толькі здавалася...

Леанарда падняў руку і дакрануўся да шкла. Я міжволі зрабіла тое ж. І мая далонь бяссільна слізганула па люстэрку.

— Птушцы, якая ляціць супраць ветру і хоча сесці на высокім месцы, неабходна ляцець вышэй гэтага месца, а потым павярнуцца назад і без узмахаў крыламі апусціцца на вызначанае месца...

— Я занадта важкая, каб узляцець...

— Душы не маюць вагі...

ПЕРАКЛАДЫ

# УСПАМІН ПРА НЕВЯДОМЫХ

Элізабэт ДЖЭНІНГС (Elizabeth JENNINGS)

Элізабэт Джэнінгс (1926–2001) — англійская паэтэса. Нарадзілася на ўсходзе Англіі. Закончыла Оксфардскі ўніверсітэт. Лаўрэат шматлікіх літаратурных прэмій і ўзнагародаў.

Э.Джэнінгс стварала інтымную і медыятыўна-філасофскую лірыку. Адзінства пачуцця і рацыянальнасці, лёгкая аркестроўка верша, афарыстычнасць — галоўныя рысы яе паэзіі. Пісала рыфмаваным і вольным вершам.



Фота www.clantonstudios.com

## Хор

*Над пенаю прыліва і горным царствам,*
*Над пастэральным долам і лугамі,*
*Над гарадамі з цемрай іх заводаў,*
*Над землямі, дзе ‘шчэ ёсць крыху згода,*
*І над усім, што маем на планеце,*
*Пануе сіла — кароль нябесны, дзіўны.*
*Для ўсіх наіўных чалавек ёсць вернік,*
*Пакуль не спазнаў зла ён. Сіла з нябёсаў*
*Ёсць дух, што рухае ўсім на белым свеце*
*У сваіх тварэннях. Ды часам траціць сілы*
*Марна. Ён свеціць нам з нябесных даляў.*
*Так днём здаецца. Пазнаць яго ты можаш*
*У вачах злоснага тыгра, у рухах дзіцяці,*
*Што хуценька паўзе ў люльку.*
*У дакрананні,*
*У спавяданні, у надзеях, у абяцанні...*

## Успамін пра невядомых

*Цяпер у мяне няма нікога*
*Асобага, па кім гараваць, хаця*
*Ёсць многа невядомых, хто з жыцця*
*Сыйшоў, ператварыўся ў попел.*
*Ніхто не ведае, што і калі яны стваралі.*
*Смуткаваць буду. Як паміралі*

*І як жылі — зусім мне невядома,*
*Таму мой смутак вельмі чысты.*
*Быў гэта важны чалавек, ці мо антыхрыст,*
*Што адышоў адзін навечна з дому.*
*Я ўспамінаю іх — гэта мой дар,*
*Хаця не бачыла нікога з іх у твар.*

*Упаўзае сантымент. Адкідваю яго.*
*Бога прашу ім вечны даць спакой.*
*Ні эпітафіі, ні макаў, ні вянкоў*
*Ім ад мяне. Нават жадання, хоць малога,*
*Даведацца, як мо жылі і як памерлі —*
*Спалілі іх? Ці закапалі ў дол?*
*Проста яны былі людзьмі —*
*такі вось толк.*

## Адказы

*Кароткія адказы трымаю пры сабе,*
*А важныя пытанні раняць розум, але*
*Кароткія адказы бароняць у бядзе.*

*Абстракцыі заўжды хаваю ад святла.*
*Вечна любіць хачу дробныя рэчы,*
*І зоркам памагала нішчыць ноч датла.*

*Адказы доўгія ўварваліся ў жыццё.*
*Іх моцная адвага і нахабства*
*Змагаюцца за вечнае быццё.*

*Нават калі кароткія адказы*
*Памогуць ратаваць мне дух,*
*Дык доўгія адказы змагацца будуць разам,*
*Ператвараць усе высновы ў прах і пух.*

## СПЕКТАКЛЬ «ГЕНРЫ V» У СТРЭДФАРДЗЕ-НА-ЭЙВАНЕ

*Быццё нас вучыць мове зноў —*
*Сказы напамяць — прыклады з твораў.*
*Вечарам цёмным ратуюся ад ліўня*
*Ў тэатры. Зачаравана мовай Шэкспіра.*
*Генры як раз патрэбны падчас вайны*
*Ў Ірландыі і на Ўсходзе Блізкім?*
*Загадкавая правільная мова —*
*Словы пачуццяў, сэнсу, абавязкаў,*
*Надзея бачыць мэту ў «выгодах».*
*І «той, хто тут змагаецца са мной,*
*Будзе мне братам».*
*Не кажы, што састарэў*
*Патрыятызм. Няпраўда. Яшчэ не позна*
*Для зорных росаў і ног, што хуткім крокам*
*Рытмічна крочаць; усе гледачы з'ядналіся*
*Ў апладысментах. Тэатр — скарбонка,*
*Наш кабінет, класны пакой і дом наш,*
*Дзе ласка адганяе роздум*
*І выклікае музыку ў сэрцы*
*Самым нудным. Нашае права рабіць*
*Прамовы для нямых, нягеглых.*
*У Генры словы ёсць суцешыць гора,*
*Мы вучымся ў яго, як гаварыць*
*пра смерць*
*Са словам годнасці. «Усё халоднае,*
*Як камень», і мы, каму бракуе*
*Волі, вялікай ці малой, для таго свету,*
*Расцем да спосабаў і мэтаў*
*Прымаць надзеі, жорсткія, благія.*

*Іду я хутка, нада мною зоркі.*
*Эйван цячэ, як словы*
*старажытнай мовы:*
*«Заўтра, толькі заўтра». Тут словам*
*Няма стомы — адраджаюць мову,*
*Распальваюць пачуцці.*
*Рыхтуюць для жыцця.*

## У САДЗЕ

*Калі садоўнік адышоў, то сад*
*Стаяў у скрусе, чакаючы падзей.*
*Метафара Эдэма — усюды лад.*
*Ды нават лепшы, як калісь раней.*

*Ціха, па-боску, без прымусу*
*Паабяцала нешта я зрабіць.*
*На выбар аніякіх там спакусаў,*
*Аднак усё не так. Дык што рабіць?*

*І нават бук суседскі падзяліў свой*
*Цёмны цень са мной. Мо пагражаў?*
*Усё залішне чыста. Няма тут дзіва —*
*Нехта ж прыбраў. Навошта я стаяла*
*Там так доўга?*
*Пакос — пахаў і смеху сплаў.*
*Стаяла, бо бачыўся Эдэм. Хіба то мала?*

**Пераклад з ангельскай Алены ТАБОЛІЧ**

ЗГАДКА

# ПАТРЫЁТ УКРАІНЫ, ДРУГ БЕЛАРУСІ

## ШТРЫХІ ДА ПАРТРЭТА УЛАДЗІМІРА САСЮРЫ (1898–1965)

Васіль ЖУКОВІЧ

**Ён быў шчырым сябрам Беларусі, называў яе сінявокай сястрой Украіны. З вялікай сімпатыяй пісаў пра нашых творцаў, Максіма Багдановіча параўноўваў з Міхаілам Лермантавым. Часта наведваў нашую краіну, з многімі сябраваў, таму не выпадкова называў Уладзіміра Дубоўку сябрам, Андрэя Александровіча — братам. Балела яго чалавечае сэрца па Міхасю Чароту, Цішку Гартнаму, Алесю Дудару, па ўсіх ахвярах 30-х гадоў.**

Першы штрых да партрэта Уладзіміра Сасюры: ён па сваім нацыянальным паходжанні не ўкраінец: па бацьку — француз, пра што, дарэчы, сведчыць прозвішча, якое ўяўляе сабой украінізаваны варыянт французкага дэ Сасюр; маці ж яго была мад'ярка. Калі з прачытаў пра гэта, дужа здзівіўся. Але ніколькі не дзіўлюся, што ўкраінская духоўнасць выхавала ў яго асобе знанага нацыянальнага паэта і патрыёта Украіны.

Штрых другі: падчас грамадзянскай вайны У. Сасюра служыў добраахвотнікам украінскага войска на чале з Сымонам Пятлюрам, больш за тое — быў нават у асабістай ахове Пятлюры (у адным з вершаў паэт узгадвае: «...груші в Петлюри я рвав у саду»).

Трэці штрых: ён паспяхова перажыў крывавага дыктатара, які так метадычна патрабаваў вышукваць і караць «ворагаў народа», яшчэ й быў узнагароджаны яго ж прэміяй у 1948 годзе за зборнік «Каб сады шумелі» (1947).

Тады раптам пільны таталітарны рэжым «апамятаўся і пачаў бэсціць свайго лаўрэата за верш «Любіце Украіну», створаны яшчэ ў 1944-м годзе і змешчаны якраз у тым п р э м і р а в а н ы м і таму, здавалася б, недатыкальным зборніку. У звязку з вершам «Любіце Украіну» фігуравала так званая «справа Сасюры». Цікава, як у 1952-м годзе Васіль Грышко каментаваў у далёкім замежжы тыя падзеі: «...украінскі патрыятызм, нават абмежаваны толькі звычайнаю любоўю да Украіны, стаў для бальшавікоў небяспечны. Пачаўся спешны адыход назад, на старыя і сталыя пазіцыі безагляднага знішчэння ўсяго ўкраінскага. І тут прыйшла чарговая і, можа, ужо апошняя бальшавіцкая «аперацыя» сэрца Сасюры...». А верш, які трапіў у апалу, як кажуць, бяскрыўдны, такі светлы і аптымістычны, у ім нават матыў дружбы народаў прысутнічае, ды не ў той, не ў традыцыйнай па тым часе паслядоўнасці выказаныя інтэрнацыянальнае і нацыянальнае пачуцці:

*Юначе! Хай буде для неї твій сміх,*
*і сльози, і все до загину...*
*Не можна любити народів других,*
*коли ти не любиш Вкраїну!..*

А зараз — чацвёрты штрых да партрэта украінскага патрыёта: у ягоным уступе да паэмы «Мазепа» (1928) ёсць такія бязлітасныя радкі, звернутыя да той жа святыні, да роднай краіны:

*У голові твоїй — макуха!*
*Хіба ж ти можеш жить сама,*
*Російсько-польська потаскуха,*
*Малоросійская тюрма!*

Даўшы такога перцу, аўтар, пранікнёны лірык, тут жа схамянаецца: «Ах, я люблю тебе, Вкраїно, і сам не знаю, що кажу!». І ў рэшце рэшт сын, які не раз ішоў за Маці на смерць, прызнаецца: «Лиш одного я хочу, мамо, щоб ти щасливою була...». Цудоўна! Але трапіў бы гэты цуд ва ўмовах пільнага ідэалагічнага нагляду і кантролю ў «лапы» сталінскіх даносчыкаў — бяды не адвёў бы ніхто. Спагадлівы лёс У. Сасюры даў яму дажыць да хрушчоўскай «адлігі» і атрымаць у 1963-м годзе Дзяржаўную прэмію УССР імя Т.Р.Шаўчэнкі за кнігі паэзіі «Ластаўкі на сонцы» і «Шчасце сям'і працоўнай».

Пяты — апошні — штрых да неардынарнага партрэта: У. Сасюра быў камуністам з 1920 года. Ён з'яўляўся аўтарам кніжак «Чырвоная зіма» (1922) пра героіку кастрычніцкіх падзей і грамадзянскай вайны; «Днепральстан» (1930), «Новыя вершы» (1937), «Жураўлі прыляцелі» (1939) — пра будаўніцтва сацыялізму ва Украіне. Былі ў яго і кнігі пра подзвігі на Вялікай Айчыннай вайне і пра мірную працу. Была і паэма «ГПУ», былі вобразы накшталт «Цвіте Червона Украіна», публіцыстычная тарабаршчына: «Безсмертна воля ВКП», траплялiся рыфмы «Ілліч — клич» і г. д. «Прыстасаванец! Двурушнік!» — можа падумаць хтосьці. Ах, гэты паспешлівы суд!.. У хрэстаматы ўкраінскай літаратуры і літаратурнай крытыкі XX стагоддзя «Украінскае слова» (1994) можна прачытаць пра дваістасць У. Сасюры, выкліканую цяжкім унутраным канфліктам, — гаворка ідзе пра барацьбу ў асобе паэта дзвюх сілаў — свядомасці і пачуцця, розуму і сэрца; пра тую нялёгкую барацьбу не маўчыць і сам паэт:

*Рвали душу мою*
*два Володьки в бою... —*
*рвали душу мою*
*к о м у н а р*
*і*
*н а ц і о н а л і с т...*

Сучаснаму чытачу не так цікава ведаць, калі і хто ў гэтай неардынарнай асобе перамагаў — сардэчны ўкраінец з глыбокім нацыянальным пачуццём ці камуніст. Важна іншае — тое, што ў яго душы праз усё наноснае прабівалася крынічная паэзія. Запавет «Любіце Украіну» лёгка пераносіцца і на нашую рэчаіснасць. Дзякуй, сын Украіны, што выклікаеш блізкае пачуццё: любіце Беларусь!

З АПОВЕСЦІ

# АПОШНІ ТЭЛЕСЮЖЭТ

Таццяна МЯДЗВЕДЗЕВА

**На ТБ Наста адпрацавала роўна два гады — ні больш ні менш, чым трэба было па размеркаванні. Два бессэнсоўныя ганебныя гады — гэтак характарызавала яна іх для сябе, і такое слова, як «досвед», не здольнае было ўлагодзіць успамін пра іх.**

Спачатку ёй падабалася тут усё — ад антыкварнае кавярні, дзе можна было пасядзець за кавай і нават чымсьці мацнейшым поруч з «зоркамі экрану», паваротніца, так бы мовіць, у вялікім творчым варыве, — да ўнутранага адчування абранасці, чакання ад чарговага працоўнага дня новых сустрэч-сюрпрызаў, калі, сядаючы з нешматслоўным і дасціпным аператарам у танаваную «Газэль», выязджаеш на чарговае заданне... Пасля выявілася, што не ўсё так проста.

Даволі хутка Насце далі зразумець, што, па-першае, здымаць можна далёка не пра ўсё і не ўсіх. Так, некалькі яе першых сюжэтаў з літаратурных імпрэзаў альбо зусім не пабачылі свет, альбо былі ўшчэнт бесцырымонна парэзаныя. Ніякае крамолы, вядома, там не было, але сама прысутнасць у кадры пэўных «культурных герояў» рабіла выхад матэрыялу немажлівым.

Па-другое, на тэлевізіі — прынамсі ў іх рэгіянальным аддзеле навінаў — амаль цалкам адсутнічала паняцце пра аўтарскія правы (у тым ліку й перадусім — саміх супрацоўнікаў). У першыя дні загадчыца аддзела падрабязна распытала практыкантак пра іх «творчыя планы». Праз пэўны час Наста бачыла сюжэты, знятыя «масцітымі» рэпарцёрамі — паводле тых тэмаў і задумаў, якімі яна тады падзялілася. Падобны нахабны крадзеж у імя агульнае справы, як высветлілася, быў цалкам нармалёвай рэччу.

Адразу відавочным стаўся поўны брак ідэяў ды хоць якога крэатыву. І скуль ім было ўзяцца, калі тое аніякім чынам не заахвочвалася? На першым месцы было выкананне плану, якасць жа — на апошнім. Працоўны дзень тэлежурналіста пачынаўся з агляду навінавых інтэрнэт-рэсурсаў, адкуль пераважна «пазычаліся» і тэмы, а то й цэлыя кавалкі тэксту для сюжэтаў. Адзін дзвюххвілінавы матэрыял — з усімі папярэднімі дамовамі на «сінхроны», ранішнім выездам, чэргамі ў мантажку з далейшым уласнаручным мантаваннем на дагістарычнай тэхніцы, начытваннем тэксту і г.д. — выціскаў усе маладыя сокі й знішчаў мільёны нервовых клетак. А ў дзень неабходна было здаваць па два матэрыялы — да і пасля абеду. Наста пакутавала, але показка пра тое, аб чым звычайна пытаюцца ў выпускніка філфаку (правільны адказ — два чызбургеры і колу), была як ніколі актуальная...

Апошняй кропляй, ці, калі працягваць шэраг журналісцкіх штампаў, паваротным пунктам у жыцці й кар'еры Насты (а, як цяпер відно — і ў медыйным жыцці ўсёй краіны) стаўся спякотны дзень 25 чэрвеня 2003 года. Трыма днямі раней прыйшла страшная навіна. Памёр Быкаў. Наста пачула пра гэта зранку, у панядзелак 23-га, па FM...

Прыйшоўшы ў рэдакцыю, яна не заўважыла якое-колечы змены ў сваіх каляжанках (мужчынаў у іх аддзеле не было) — тое ж пустое гергетанне пра моду й показкі не вышэй за пояс. Яны, напэўна, яшчэ не ў курсе, — падумала Наста і паведаміла жалобную навіну. Не, яны ведалі. «Жаль, конечно. Бальшой был пісменнік. Глыбішча», — сказала Злата, якая нават паспела зранку надыктаваць інфу з нагоды спачувальнага ліста прэзідэнта родным пісьменніка. «Вот тормозіт меня вчера гаёвый», — вытрымаўшы паўзу, пачала звычайную бадзягу пра сваю дзьмутую звышпапулярнасць Інга...

Два дні Наста хадзіла прыплюснутая навіной. А 25-га зранку шэф выклікаў яе й суха загадаў ехаць да Дома літаратара, дзе адбывалася развітанне з пісьменнікам, — падрыхтаваць рэпартаж пра паніхіду й пахаванне. Ён не даваў ніякіх указанняў наконт таго, што здымаць і як. Маўляў, не маленькая, сама павінна ведаць. Наста, у якой якраз сканчаўся тэрмін размеркавання, разумела, што гэта праверка. І давер — здымаць вялікі загалоўны сюжэт для выніковай панарамы ёй яшчэ не даручалі.

Між іншага, да Дома літаратара накіравалі яшчэ адну здымачную групу — хлопцаў, якія зазвычай здымалі розныя раўты з удзелам самога. Пагаворвалі, што сам, які знаходзіўся з рабочай паездкай у Светлагорску, меўся прыехаць. Як Наста чула пасля, даведаўшыся пра тое, што, насуперак прысутнасці міністра культуры й спецслужбоўцаў, сын Быкава пакрыў цела бацькі бел-чырвона-белым сцягам, ён даў адмашку «ўладам» вызваліць Дом літаратара...

Ніколі, ні на якім мітынгу, Наста не бачыла столькі народу — пароўну моладзі й людзей сталага ўзросту. Дзясяткі тысячаў менчукоў і, маркуючы па надпісах на жалобных вянках, людзей з іншых гарадоў, запоўнілі вуліцу Фрунзэ ад Дома літаратара аж да прыступак метро. У многіх былі сцягі (ні ў калоне, ні падчас цырымоніі пахавання не было ніводнага «закатна-балотнага» светлафора). Няўжо будзе хапун? — няўзнак падумалася Насце. Ці ўсё ж не наважацца?..

«Ці здолее хтосьці яшчэ калінебудзь, без гвалту й разнарадак, сабраць разам столькі людзей?» — пачула Наста, як зграбненькая кабета сталага ўзросту запытваецца ў сяброўкі.

Ва ўсіх цэнтральных кветкарнях тавар быў змецены зранку — засталіся хіба толькі дарагія груваcткія архідэі. На выхадзе з метро юнакі (ліцэісты — здагадалася Наста, пазнаўшы некаторых з публікацыяў, прысвечаных абароне зачыненага сёлета гуманітарнага ліцэя) раздавалі бел-чырвона-бела-чорныя стужкі — на рукаў ці на лацкан, са шпількай. Насце з аператарам, якія ішлі ўздоўж жалобнае калоны й мелі пазнавальны лагатып на мікрафоне, таксама прапанавалі стужачку, і яна, пад выпрабавальным позіркам сімпатычнага маладзёна, прышпіліла яе да лацкана свайго вяльветавага пінжака. Аж да вяртання ў рэдакцыю, нават падчас «стэнд-апу» — свайго завяршальнага слова з усходніх могілак — яна не зняла тае стужкі (вядома, захіліўшы яе мікрафонам).



Свой рэпартаж, каб максімальна пазбегнуць журналісцкай казёншчыны, Наста зрабіла амаль што без голасу за кадрам, аддаўшы 90 адсоткаў сюжэта словам і слёзам жывых людзей, якія прыйшлі на развітанне з улюбёным пісьменнікам. Не, больш, чым пісьменнікам — Прарокам, Анёлам, сумленнем нацыі, — казалі яны.

Пачынаўся рэпартаж з самай кароткай і самай кранальнай прамовы паніхіды — выступу найбліжэйшага сябра Васіля Уладзіміравіча Рыгора Барадуліна, з якога Наста прыбрала толькі чатырохрадкоўе, што пачыналася са словаў «Нечысць на зямлю бяду наклікала». Ёй дужа хацелася, каб сюжэт выйшаў без ніякіх зменаў. Мантуючы яго, Наста, страляны верабей, пільна глядзела, каб у кадр крый Бог не трапіў ніводзін бел-чырвона-белы сцяг. На колькі гэта магчыма — бо ў паказе шэсця пазбегнуць нацыянальнай сімволікі можна было хіба здымаючы людзей не вышэй за галовы.

У завяршальным «стэнд-апе» Наста ўсё ж дазволіла сабе лішачак крамолы. Наўмысля. Інакш было немажліва: «Краіна развіталася з лепшым са сваіх сыноў. Як ні цяжка гэта вымавіць, але Васіля Быкава няма. І ўсё ж, прыгадваючы словы яшчэ аднаго нацыянальнага прарока Беларусі Янкі Купалы, — Беларусь жыве!».

Цётка з мантажнай, якая чвэрць веку адрабіла на ТБ, звычайна абыякава нешматслоўная, пусціла слязу, пабачыўшы гатовы матэрыял, і нават абняла Насту.

Дахаты вярталася позна ўвечары — высмактаная й ніякая, але ва ўрачыстым настроі. Нягледзячы на тое, што галава раскалвалася пасля дзённае спёкі, на душы было ціха й светла. Яна крадком угледалася ў твары выпадковых тралейбусных спадарожнікаў, гадаючы: пэўна, гэты быў, і во гэтая... Жалобную стужку, вышчаўшы з будынка тэлестудыі, яна адразу ж прымацавала на былое месца. Тое адчуванне еднасці, што прынесла агульнанацыянальная страта, было, як бы па-блюзнерску гэта ні гучала, дужа важным. І Настассі было радасна, што і яна нейк спрычынілася да гэтага. Сёння яна бачыла столькі... прыгожых? не, людзей з чалавечымі абліччамі — адухоўленых, амаль родных. Яна й не здагадвалася, што іх так шмат у гэтым горадзе...

Наступныя два дні прайшлі, бы ў анабіёзе. Шэф не выклікаў. Наста нават ні разу не сустрэлася з ім у калідорах. Шапталіся, што ён на сур'ёзнай нарадзе, ці не ў самога. Пытанняў па сюжэце з пахавання не было і ад загадчыцы аддзела.

У пятніцу, адразу з працы, паехала на вакзал — і ў Алёсы, да мацi. Усю дарогу, чым бліжэй тым больш, агортваў мандраж. Так Наста не хвалявалася нат падчас сваіх дэбютных рэпартажаў. Набыўшы ў сельпо торт, ледзь паспела акурат да выніковага выпуску навінаў. Пад блакітны гадзіннік, які пачаў звыклы адлік да 20-й, яны ўтрох — з мацi й бабуляй — уселіся за гарбатай перад тэлескрыняй.

Першыя сюжэты тычыліся ўборачнай і верталётным пералётам прэзідэнта-выратавальніка-жніва па краіне. Пятнаццаць хвілінаў эфіру. Не кісла. Далей, згодна з анонсам, меўся ісці сюжэт па пахаванні.

На фоне відэашэрагу з аскепкаў матэрыялу, знятага Наставым аператарам (пераважна — Быкаў у труне, плюс нарэзка чорна-белых здымкаў), дыктарка [не блытаць з доктаркай] суха паведаміла, што 25-га чэрвеня адбылося развітанне з пісьменнікам. Але (суворы позірк, метал у голасе й вачох) па некаторых тэлеканалах нібыта братняй нам краіны былі паказаныя сюжэты, якія ёсць абуральнай дэзінфармацыяй і хлуснёю (у момант, калі прамаўляліся гэтыя словы, спецкар НТБ у Беларусі пакаваў валізы, маючы ў пашпарце штамп на дэпартацыю з краіны й забарону на ўезд тэрмінам у 5 гадоў).

Далей быў уласна сюжэт — пра тое, як «насуперак нормам хрысціянскай маралі развітанне з народным пісьменнікам Беларусі Васілём Быкавым радыкальная апазіцыя ператварыла ў палітычны фарс». Кожны сказ — бы аплявуха. Бы плявок у магілу...

«Скокі па касцях», — плясь!

«Упрыгожаныя бел-чырвона-белымі сцягамі людзі, якія страцілі агульна-чалавечыя каштоўнасці, з задавальненнем пазіравалі перад відэакамерамі замежных СМІ», — у кадры нецвярозы з выгляду маладзён, загорнуты ў сцяг, пад гукі фашыстоўскага маршу.

«Труну з целам насілі па вуліцах датуль, што насуперак хрысціянскім звычаям пахаванне адбывалася ўжо познім вечарам...»

Штосьці казалася яшчэ пра несумленнасць карпункта НТБ, але Наста павольна ўстала з-за стала й рушыла ў свой пакой. «Сссукі!» — паўшэптам працадзіла яна выходзячы. «Што ты сказала, Насценька?» — перапытала бабуля.

Бруд, цэбар бруду, вёдры памыяў ліліся з афіцыйных СМІ пасля адмашкі. «Галоўнаму тэлеканалу краіны» прыйшлося найцяжэй — ён брахаў па-беларуску. А гэта — і лексічна, і стылёва — няпроста. Нязвыкла. Ужо ўвосень усё вяшчанне ТБ пэрайдзе на расійскую. Так працэй. І працэй — што без Быкава... Без Быкава канчаткова зацкавалі і Саюз пісьменнікаў, і Ліцэй, і незалежныя газеты.

Наста схільная была бачыць пачатак істэрыі менавіта з гэтага дня — з 25 чэрвеня. Калі яны пабачылі рэальны расклад і літаральна панакладалі ў порткі.

Між тым, прайшло сем гадоў, і не з'явілася таго, хто годна адказаў бы халуям...

**Наста схільная была бачыць пачатак істэрыі менавіта з гэтага дня — з 25 чэрвеня. Калі яны пабачылі рэальны расклад**

АРТЫКУЛ

# ПІЛОТ ЛЯ РАЗБІТАГА ЧОЎНА?

Віктар ХУРСІК

**Зручна пісаць пра мінулае. Куды горш — пра сучаснасць. Тут можаш і не патрапіць у кропку. Тым больш, што наш беларускі менталітэт не церпіць пракрокаў, і меркаванне пісьменніка — гэта толькі яго меркаванне, а не падсумоўка грамадскай думкі. З гэтага зыходзіў і я, калі браўся за артыкул.**



Фота Вольгі Сеўрук

Анатоль Белы на сваім падворку ў Старых Дарогах.

…Не сустракаў людзей, якія б захапляліся Анатолем Белым, узносілі яго на нябёсы, хвалілі за зробленае. Суразмоўцы заўсёды падкрэсляць яго «калючасць», яго ўласцівасць не патрапляць у такт, у ноту субяседніка. Вядомы бард і паэт Уладзімір Высоцкі пра такіх сказаў: «Он молчал невпопад и не в такт подпевал, он всегда говорил про другое...». Заканчваецца страфа тым, што гэты самы ЁН учора не вярнуўся з бою. І паэту шкада ТАГО, хто ваяваў побач з ім незаўважаным. Невядома: казалася тое пра звычайнага салдата ці пра нейкага іншага, але пра былога ваеннага лётчыка Анатоля Белага тыя словы — як у сук. Для ваенных лётчыкаў запалярнай авіяцыі 60-х гадоў не прыстала карыстацца чужымі рашэннямі і думкамі: толькі свая асабістая адказнасць і толькі сваё асабістае бачанне сітуацыі. Ад гэтага ў цывільным жыцці Анатоля Яўхімавіча ўзнікалі і ўзнікаюць розныя, часам непажаданыя, калізіі. Вядома, што ён уляпіў публічную аплявуху Станіславу Шушкевічу, паклаў шмат намаганняў на тое, каб у расійскім Яраслаўлі быў адкрыты помнік Максіму Багдановічу (на адкрыццё якога ездзіў прэзідэнт Беларусі А.Лукашэнка), стварыў грамадскі клуб «Спадчына» і, урэшце, нейкім чынам стварыў і ўтрымлівае на свае грошы «апазіцыйны» музей у бацькоўскім доме ў Старых Дарогах.

Дык хто вы, лётчык Белы?

У пачатку 90-х яго палічылі ледзь не правакатарам, «агентам КДБ» за публічную знявагу вядомага лідэра, але ён быў і застаўся патрыётам. І музей яго з тых часоў не знік, бо Белы не патрапляў ні тым, ні іншым (цяпер гэтая нацыянальная мастацкая скарбніца змяшчае звыш 5000 адзінак захоўвання). Дзве вышэйшыя адукацыі, вопыт работы загадчыкам мемарыяльнага комплексу «Хатынь», сувязі, якія захаваліся з часоў працы выкладчыкам у БДУ, дазволілі яму ператварыць вясковую сядзібу ў пантэон нацыянальнай славы. Славы, якая, на жаль, сёння нікому не патрэбная: рэчышча дзяржаўнай палітыкі ў пытаннях нацыянальнага адраджэння пакуль далёкае ад Старых Дарог, а раздробленая апазіцыя даўно ўжо не тлумачыць народу пра асобы і дзеі мінуўшчыны.

«Дык мо ўсё-такі трэба было ў палітыку, Анатоль Яўхімавіч? Глядзіш, вызначыліся б, і камунікацыі функцыянавалі б у вашым доме, як у Драздах, ці, наадварот, на вялікі грант са Штатаў, як кволы і «пакрыўджаны», збудавалі б у Старых Дарогах мураванку з байніцамі».

Усміхаецца, гэта — не яго справа, ён збіральнік і захавальнік памяці. А значыць — дзівак. І сапраўды, уздумаў прыстойна, на яго думку, уганараваць Быраса Кіта ў ягонае стагоддзе. Пры сходзе народа медалі, граматы адсылаў яму ў той час, як іншыя распавядалі толькі пра тое, колькі Кіт выпівае і наколькі моцныя ў яго органы выдалення. Самае цікавае, што гэтых, апошніх, слухалі, раскрыўшы рот, а пры з’яўленні Белага пачалі ўсміхацца, маўляў, зноў пачне вылузвацца. «Вылузвацца» — у наш час азначае весці сябе па-чалавечы, праяўляць незалежнасць думкі, тварыць на карысць народа і яго рупліўцаў. За Кіта ў Белага асаблівая крыўда: «Вось Шушкевіч дапамог Міхайлаву стварыць у свой час ЕГУ. А ці ж немагчыма было на такой пасадзе падтрымаць ідэю Кіта аб стварэнні нацыянальнага беларускага ўніверсітэта, за 20 тысяч даляраў набыць на пачатку дзевяностых пару дамкоў пад гэта? Усе кінуліся зарабляць на Кіту, друкаваць за яго кошт пра яго кніжкі замест таго, каб ажыццявіць вялікую задуму гэтага славутага чалавека».

**Можна ад Белага аддаліцца, можна не заўважаць, але ад гэтага сама з’ява не знікне. Гэтая асоба прапісалася ў гісторыі нашай культуры**

Натура лётчыка не дазваляе яму віхляць з жыццёвым маршрутам. Апошнім часам здаюць здароўе, нервы, але ён па-ранейшаму Белы — непрадказальны, узрыўны, імпульсіўны, такі, якім яго стварыла прырода. Хочацца ўзяць гэбель, зняць калючкі, падраўняць, але пад каго? Ды і не магчыма гэта.

Вось ён раскладвае на канапе свайго ложка ў кватэры па вуліцы Уральскай (якая даўно нагадвае ці то штаб, ці то музей адначасова) нядаўнюю знаходку свайго музея. Прызнацца, сенсацыя: невядомыя творы пэндзля і алоўка Галубка, твары, за якімі лёсы, спадчына мастакоў Ціхановічаў. Ён перакананы, што гэта павінна ўразіць мастацтвазнаўцаў, выклікаць буру ў прэсе. Мой скепсіс яго выводзіць з сябе. «Дык хто мы тады такія?!» — амаль крычыць ён. «Мы? А хто яго ведае. Ну, беларусы, пэўна ж, не габрэі». Анатоль Яўхімавіч узрываецца: «Ды габрэі куды больш згуртаваныя, продкаў ведаюць да сёмага калена! А ты тут...». Мацюкнуўся, відаць, зрабілася лягчэй, зноў разважаем над знаходкай. Хаця можна было падняцца ды сыйсці.

Можна ад Белага аддаліцца, можна не заўважаць, але ад гэтага сама з’ява не знікне. Гэтая асоба прапісалася ў гісторыі нашай культуры і грамадскага жыцця навечна, ды і музей у Старых Дарогах — таксама.

Дзеці ў Старых Дарогах не вельмі льнуць да яго. Адны кажуць, што гэта нейкія могілкі, бо сядзіба скрозь у помніках і бюстах (беларускім славутасцям), а тыя з падлеткаў, хто і хацеў бы заглянуць сюды, баяцца іншага: мясцовыя ўлады, у тым ліку і школа, папярэджваюць, што музей Белага — расаднік нацыяналізму, г.зн. бэнээфаўшчыны, яго наведванне — палітычная акцыя. Зрэшты, па гэтых надуманых прычынах да Белага баяцца ездзіць і дарослыя. Можна было б тут паспрачацца наконт памылковасці ўсяго гэтага, але ці трэба? Калі ў чалавека няма гена нацыянальнай годнасці, то яго не прыўеш чаранком. Кажуць, «Лінія Сталіна» прывівае патрыятызм. З гэтага пасылу і «Лінія Троцкага», створаная ў Беларусі, магла б паслужыць сродкам выхавання, бо таго таксама ледарубам бандзюгі саданулі ў галаву. А вось «лінія Белага» ну ніяк не ўпісваецца ў дзяржаўную ідэалогію. Хаця пабітых ні за што на ёй безліч, герояў, што абаранялі Бацькаўшчыну, таксама.

Яго музей — пантэон нацыянальнай славы. У любой краіне свету яго стваральніка насілі б на руках, а ў Штатах Анатоль Белы, пэўна, і дзяржаўную падтрымку атрымаў бы. Ці атрымае ў нас? Магчыма. Я не магу тут ставіць вечны пытальнік. У нас дастаткова падтрымаць маральна, прыехаць у музей не Макею, не Пяткевіч і нават не Янчэўскаму, а ўсяго толькі шаноўнаму міністру культуры, як усё стане на свае месцы. І старшыня райвыканкама запэўніць, што такі музей — дабро для раёна, і школкі раптам заўважаць, што ад Еўфрасінні Полацкай, Міндоўга ці Кіта ніякай пагрозы сучаснай дзяржаўнасці не існуе, ды і Віктар Жаўнеровіч — гэта мастак сусветнага ўзроўню, а не палітычны дзяяч, не Пазняк, адным словам…

Неяк заглянуў у Старыя Дарогі выдатны тэлежурналіст Юры Жыгамонт са сваім «Падарожжам дылетанта». Здымаць музей і сядзібу Белага яму забаранілі. А чаму — няведама. Бо калі казаць пра тыя турысцкія «Мекі», якія мясцовых кіраўнікоў безвынікова прымушаюць ствараць, то лепшага брэнда для Старадарожчыны, чым музей Белага (зразумела, пасля сусветнавядомага самагону), не адшукаць. Шкада, што старэе гэтае сховішча. Ды і сам галоўны яго захавальнік ужо ў гадах, хворы, не можа ў поўную меру рупіцца над каштоўнасцямі.

Не цікавяцца музеем і палітычныя партыі, якія некалі бралі на шчыт беларускую гісторыю. Застаецца ён, як адзін у полі музей-воін. На жаль, у полі неправавым, бо статут гэтага музея ніяк дзяржавай не вызначаны.

…Мы зноў разглядаем рарытэтную знаходку музея — графічны партрэт нейкага старога. Яго аўтар — беларускі пісьменнік, рэжысёр, акцёр, тэатральны дзеяч, мастак, першы народны артыст БССР — быў арыштаваны ў 1937 годзе. Спадчына Галубка да сёняшняга часу не даследаваная поўнасцю. Хто гэты чалавек на партрэце? Можа, Тамаш Грыб?

Пэўна, хто б ён ні быў, гэта сучаснік мастака, нераўнадушны да лёсу Бацькаўшчыны чалавек. Знаходка — агромністая тэма для мастацтвазнаўцы. А вось адзін з рэдкіх алейных твораў Галубка «У Беларусі рака Цнянка» (1927 год) — мілы сэрцу пейзаж…

Як сведчыць Анатоль Яўхімавіч, дзесьці ў Гомельскім палацы чыгуначнікаў маюцца яшчэ падобныя творы аўтара, занядбаныя і невядомыя. Хто іх выцягне на свет, каму гэта цяпер патрэбна — пытанне, якое павісае ў паветры. «Дык мо «свае» дапамогуць», — раблю я націск, добра ведаючы, што ў Белага дзве расхожыя «абразлівыя» прыналежнасці: адны кажуць, што ён яўрэй, а другія — што кадэбіст. Кажуць, праўда, за вочы, бо ведаюць, што былы лётчык можа «разбамбіць», у крыўду сябе не дасць. Зноў узрываецца, згадвае сваіх бацькоў, радню (яго родны брат Міхаіл, дарэчы, узначальваў падпольную арганізацыю ў Старых Дарогах у час Другой сусветнай вайны), а потым суцішваецца, і мы сыходзімся ў тым, што добра, калі на дзяржаўную незалежнасць і гонар краіны пачнуць працаваць усе.

Калі гэта адбудзецца?

Мо пры гэтым жыцці?



Будынак музея.

УСПАМІН

# ПАД АЎРАЙ ВАСІЛЯ БЫКАВА

Уладзімір ВАСЬКО

**…Васіль Быкаў — мая студэнцкая маладосць, мае светлыя гады. З 1960-га па 1965-ы я вучыўся ў Гродзенскім дзяржаўным педагагічным інстытуце і часта сустракаўся з Васілём Уладзіміравічам. Першы раз — на занятках літаратурнага аб'яднання пры рэдакцыі газеты «Гродзенская праўда». Восенню 1960 года. Васілю Быкаву ў той час было трыццаць шэсць гадоў, а мне — дваццаць тры.**



1969 год. Васіль Быкаў, Сяргей Панізнік і Данута Бічэль каля Каложскай царквы.

Заняткі праходзілі ў Доме Элізы Ажэшкі. Вёў іх Аляксей Карпюк. Сабралася чалавек пятнаццаць. Пачаткоўцы чыталі свае вершы, а пасля амаль усе прысутныя іх абмяркоўвалі. Дайшла чарга і да мяне. Я прачытаў каля дзесяці вершаў. Некалькі чалавек падзяліліся сваімі ўражаннямі. Калі жадаючых выступіць больш не знайшлося, Аляксей Карпюк прамовіў:

— Васіль Уладзіміравіч, што вы скажаце?

З-за століка падняўся стройны, русавалосы, з чыстым, свежым тварам чалавек, які сядзеў паміж намі ў невялікай чытальнай зале і які, як мне падалося, не намнога старэйшы за нас, студэнтаў. Ён адзначыў, што з прачытанага мною найбольш уражвае пейзажная лірыка, што ў вершах гэтага кшталту адчуваецца натуральнасць дэталей і непасрэднасць аўтара, ёсць запамінальныя радкі. Вершы ж грамадскага характару маюць патрэбу ў дапрацоўцы, у іх не адчуваецца асобы аўтара, яны ў некаторай ступені дэкларатыўныя.

У той час я не ведаў, што гэта быў Быкаў, і паціхеньку, каб ніхто не пачуў, запытаў у Шурпы, які сядзеў побач са мною і які на два курсы ішоў за мяне раней (я быў на першым).

— Быкаў, — адказаў ён. — У рэдакцыі «Гродзенскай праўды» працуе.

Ад першага разу і ён сам, і словы, вымаўленыя ім, неяк натуральна запалі мне ў душу і ў памяць. Я прыйшоў вечарам у свой студэнцкі інтэрнат і яшчэ раз удумліва, не спяшаючыся, прачытаў тыя вершы, якія выносіў на суд літаб'яднання, і сам для сябе зрабіў вывад: Быкаў сказаў праўду. Вершы грамадскага гучання падаліся мне нязграбнымі, чужымі, а ў пейзажнай лірыцы было сёе-тое ад свайго «я».

Літкансультантам на той час у «Гродзенскай праўдзе» працаваў Міхась Васілёк, а Васіль Быкаў, мабыць, — у сакратарыяце.

Неўзабаве, той жа восенню, Міхась Васілёк памёр, а рэдакцыя «Гродзенскай праўды» пераехала ў новы будынак. Літкансультантам стаў Васіль Быкаў. Неяк я сабраў свае вершы і панёс у рэдакцыю. У калідоры сустрэў незнаёмую жанчыну і спытаў:

— Каму можна паказаць свае вершы?

— Быкаву, — адказала яна. — Ідзіце па калідоры і пасля направа. У аддзеле культуры ён.

Гэта, як аказалася пазней, была Ірына Міхайлаўна Суворава — супрацоўніца ўпамянёнага аддзела, якая пасля стала жонкай Быкава.

Я зайшоў. Васіль Уладзіміравіч падняўся з-за стала і першым падаў мне руку. У яго была такая звычка: заўжды вітацца першым, — гэта, відаць, каб мы, студэнты, былыя вяскоўцы, не так губляліся. Праўда, тое падбадзёрвала нас, прыдавала духу.

Ён адабраў тое-сёе з прынесенага і паабяцаў, што прапануе ў літстаронку. Пазней вершы былі надрукаваныя. А я ўсё часцей пачаў заглядваць у рэдакцыю «Гродзенскай праўды» — калі адзін, а калі разам з сябрамі. Ні разу не прапусціў заняткаў у літаб'яднанні. Пра гэта Васіль Уладзіміравіч успамінае ў сваёй кнізе «Доўгая дарога дадому», дзе згадвае прозвішчы Уладзіміра Шурпы і маё.

Іншы раз я заходзіў у рэдакцыю і без вершаў. Бадзяюся, бадзяюся па горадзе — і раптам падумаю: дай загляну да Васіля Быкава — хоць розуму набяруся. Ішоў я да яго, як на споведзь, а выходзіў з кабінета, як з чысцілішча. Так ён уздзейнічаў не на аднаго мяне, а на ўсіх маіх сяброў, як яны ў размове прызнаваліся. Пасля сустрэчы з Быкавым, сапраўды, неяк станавілася лёгка і светла на душы, у ёй усталёўвалася святая, нерастлумачальная гармонія.

Сваімі наведваннямі рэдакцыі я, магчыма, і назаляў Васілю Уладзіміравічу, але выгляду ён не паказваў. Наадварот, пры маім з'яўленні ў яго кабінеце ён як быццам ажыўляўся і з зацікаўленасцю слухаў мае вершы. Праўда, любіў тонка і востра прыпусціць толіку гумару ў мой адрас, што Ірыну Міхайлаўну Суворару, якая сядзела з ім у адным кабінеце, і мяне здорава смяшыла (на гумар я не крыўдаваў). Аднойчы, напрыклад, ён сказаў:

— Ты, Васько, пішаш, як ідзе па вуліцы салдат, у якога на адной назе бот, а на другой — лапаць: то грукне ботам, то шлёпне лапцем. А патрэбна штО-небудзь адно: ці грукаць, ці шлёпаць. Патрэбна гармонія ў творах. Разумееш?

Сам жа Васіль Уладзіміравіч усміхаўся стрымана, з характэрнай для яго цёплай хітрынкай у вачах. Трэба сказаць, што заўвагі яго падштурхоўвалі зусім па-іншаму глядзець на свае творы. Адчуваючы высокі інтэлект і глыбіню думкі Васіля Быкава, часам я звяртаўся да яго па параду чыста жыццёвага характару. Было такое: аднойчы, знаходзячыся ў Доме адпачынку «Рось» Ваўкавыскага раёна і скачучы з трампліна на лыжах, я падкруціў сабе нагу — і яна перастала выпростацца ў калені. Адправілі мяне ў Гродна, у гарадскую бальніцу. Прафесар пры аглядзе сказаў, што прыйдзецца рабіць аперацыю, і даў мне суткі на роздум. Засмучаны, я пасядзеў крыху ў палаце, пагараваў, а пасля падумаў: «Ці не патэлефанаваць Васілю Быкаву, усё ж ён удзельнік вайны, сам не раз быў паранены. Можа, ён дасць якую параду». Я прама з бальніцы, з паста, патэлефанаваў.

— Ведаеш што, Валодзя, — прамовіў ён, — на калені даволі складаная аперацыя. Там сухажыллі. Глядзі, каб яны цябе зусім не зрабілі інвалідам. Няхай пашукаюць якія іншыя сродкі: праграванні ці гразь.

Я адмовіўся ад аперацыі і лячыўся амбулаторна: на каленны сустаў накладвалі гразь, прыкладвалі нейкія металічныя пласцінкі… Паехаў неяк у нядзелю на аўтобусе ў лясны масіў Пышкі, што туліўся да самага горада. Ішоў па вузкай, пратаптанай у снезе сцяжынцы, пазіраў на лахматыя ад снегу галінкі соснаў — і раптам у калені маім штосьці шчоўкнула і нага выпрасталася. Я перастаў кульгаць і пакрочыў нармальна, як і раней. Можаце сабе ўявіць маю радасць?! «Я не інвалід, — вырвалася ў мяне з грудзей. — Я не інвалід!».

А ў панядзелак быў у кабінеце Васіля Быкава. Удзячнасці маёй у яго адрас не было мяжы!

Помню, мы ехалі выступаць у вайсковую часць, якая размяшчалася ў лесе, далекавата ад горада. У грузавой ваеннай машыне, крытай брызентам, па адзін бок на лаўцы сядзелі Васіль Быкаў, Марк Віленскі і Уладзімір Шурпа, па другі — Данута Бічэль, Сяргей Габрусевіч і я. Была позняя халодная восень. Машыну трэсла на калдобінах і разбітых мерзляках, на каранях дрэў, якія пераразалі дарогу. У кузаве завіхурваўся сцюдзёны вецер.

Быкаў шмат жартаваў, казаў:

— Ну, усе пазіркі салдатаў будуць скіраваныя на Дануту.

— Так ужо, — адказвала яна і рассыпала па кузаве чаромхавабэзавыя смяшынкі.

Маладая, прыгожая, чарнавокая Данута Бічэль усё адбівалася словамі ад быкаўскіх кампліментаў і вельмі прывабна паружавела.

Пасля Васіль Уладзіміравіч засунуў руку за пазуху і выняў з унутранай кішэні дэмісезоннага паліто кніжку.

— Во кнігу выдалі, — прамовіў ён, — «Жураўліны крык».

Мы ўсе ахнулі. Ні ў кога з нас яшчэ не было кнігі. А тут побач сядзіць аўтар, наш старэйшы сябра. Мы па-шчыраму пазайздросцілі, парадаваліся такой важнай падзеі ў яго жыцці. І глядзець на Быкава сталі ўжо, як на Бога. Гэта была яго першая кніга. Ну, а ў салдацкім клубе ўсё было так, як Васіль Уладзіміравіч напрарочыў. Але ж і аўтара «Жураўлінага крыку» афіцэры і радавыя слухалі з затоеным дыханнем.

Пасля першай кнігі Васіль Уладзіміравіч узлятаў у зеніт сваёй славы вертыкальна. У Маскве адна за другой друкаваліся яго аповесці. Найчасцей у часопісе «Новый мир», рэдактарам якога быў Аляксандр Твардоўскі. У той час казалі, што менавіта Твардоўскі першым убачыў у асобе Васіля Быкава таленавітага празаіка і прадказаў яму зайздросную літаратурную будучыню. Так і сталася.

А ў нашым інстытуце і выкладчыкі, і студэнты адно толькі і гаварылі, што Васіля Быкава вынесла на літаратурную арбіту «Трэцяя ракета». Яго запрашалі на сустрэчы ў вышэйшыя навучальныя ўстановы, у школы, у тэхнікумы, за ім прысылалі машыны з раённых цэнтраў. Хоць, я добра ведаю, што выступаць ён не любіў і казаў:

— Няхай чытаюць творы. Навошта яшчэ сябе выстаўляць напаказ, як экпанат.

І яшчэ адзін цікавы эпізод. Сакратар абкама партыі па ідэалогіі Еўдакія Емяльянава запрасіла нас на гутарку з нагоды рэвалюцыйнага свята Кастрычніка. Папрасіла, каб мы штО-небудзь з твораў прысвяцілі гэтай даце. І згодна спісу, які ляжаў перад ёю, персанальна апытвала кожнага.

Карпюк сказаў, што піша аповесць, але тэматыка ў ёй зусім не звязаная з Кастрычнікам.

— А новую я ўжо не паспею напісаць, — расчаравана закругліў ён.

Быкаў жа прамовіў:

— У мяне ўсе аповесці ваеннага зместу. Але, калі нават я і напісаў бы новую аповесць, то пакуль яе ўключаць у план, пакуль будзе праходзіць усе інстанцыі, пакуль яе надрукуюць, дык і не адзін Кастрычнік пройдзе.

Дайшла чарга і да нас, літаратурнай галоты. Што мы маглі сказаць? Абяцалі, што будзем старацца, будзем пісаць, а атрымаецца штО-небудзь з нашых патугаў ці не — не ведаем.

Летуценнае расчараванне адбілася на твары сакратара па ідэалогіі, аднак яна развіталася з намі даволі тактоўна і шчыра.

Мы выйшлі на вуліцу. Быў цёплы, бясхмарны вераснёўскі дзянёк. На плошчы Савецкай «віравала» моладзь. Ля скверыка Карпюк развітаўся з кожным за руку і пакіраваў дадому. А мы пайшлі ўніз па Савецкай і дабраліся да вуліцы Ажэшкі. Васіль Уладзіміравіч жартаваў, пасмейваўся.

Насупраць пэдінстытута, на рагу вуліц Леніна і Ажэшкі, стаяла кавярня ці закусачная, з дахам накшталт каляровага (у палоску) парасона. Мы заглянулі туды. Якраз нікога не было. Васіль Уладзіміравіч прапанаваў апрабаваць сухое малдаўскае віно. Мы тут жа ўвішна пасунулі рукі ў свае кішэні.

— Супакойцеся, — спыніў нашыя памкненні Быкаў. — Студэнты. Бедната. Няма чаго ў вас там трэсці.

Ён заказаў тры бутэлькі і паўкілі цукерак. Пакуль разлічваўся, мы паставілі ўсё гэта на стол.

— Авансам адзначым Кастрычнік, — прамовіў Васіль Уладзіміравіч. І мы ўсе па старой завядзёнцы дружна чокнуліся. У нас на сэрцах стала ўтульна і цёпла, весела і сонечна. Ах, маладосць, маладосць, чаму ты так хутка збегла ад нас і ад нашага літаратурнага настаўніка?!

Цікава праходзілі заняткі літаб'яднання пры рэдакцыі «Гродзенскай праўды». Пры абмеркаванні твораў выказваліся амаль усе, крытыкавалі адзін аднаго, кожны даводзіў свае думкі, як хацеў. Помню, абмяркоўвалі адзін раз мае вершы. У калідоры, перад гэтым, мяне сустрэла Ірына Суворава і падбадзёрыла:

— Сёння ты імяніннік. Трымайся.

Даклад рабіў пажылы паэт, падпалкоўнік у адстаўцы Яўген Яўсцігнееў, які часта пісаў скаргі ў ЦК КПБ, чаму нідзе не друкуюць яго вершы. Найбольш ён прычапіўся да ўрыўка з маёй паэмы «Цаліна», які я даслаў, будучы там са студэнцкім будаўнічым атрадам і які ўжо быў надрукаваны ў «Гродзенскай праўдзе».

Васіль Быкаў не ўтрываў пасля крытыкі. Ён падняўся і зазначыў:

— Якраз тыя месцы, якія вы крытыкуеце, самыя моцныя ў паэме. А дэталі не прыдуманыя, не штучныя, як вы кажаце, а натуральныя, дакладныя і даюць магчымасць убачыць каларыт той мясцовасці, якую аўтар апісвае, адчуць тую абстаноўку, у якой апынуліся студэнты. Мне, напрыклад, спадабаўся ўрывак.

У 1965 годзе я скончыў інстытут і паехаў настаўнічаць на Дзятлаўшчыну. Пасля перайшоў на працу ў рэдакцыю мясцовай газеты «Перамога», затым пераехаў у Ліду, дзе таксама ладкаваўся на працу ў рэдакцыю аб'яднанай газеты «Уперад». І з Васілём Уладзіміравічам бачыўся ўсё радзей і радзей. Дакладней, адбыліся ўсяго чатыры сустрэчы: адна на Свіцязі, другая ў Лідскім Доме афіцэраў, дзе ён выступаў з Генадзем Бураўкіным, Рыгорам Барадуліным і Васілём Зуёнкам (на сцэну запрасілі і мяне), трэцяя — на пленуме Саюза пісьменнікаў у Доме літаратараў, чацвёртая — у фае гасцініцы «Ліда», дзе ён жыў падчас чарговага прыезду ў горад з Генадзем Бураўкіным і Алесем Разанавым. Гэта, аднак, былі кароткія сустрэчы і мінутныя гутаркі. Пасля я бачыў толькі фотаздымкі Васіля Быкава ў часопісах, газетах і ў яго кнігах, а самога — у тэлеперадачах…

Аднойчы я паслаў яму паштоўку, у якой павіншаваў з 60-годдзем з дня нараджэння і пажадаў напісаць узвод баявых аповесцяў. Не падлічваў, сабраўся з іх узвод ці не, але перакананы: праўдай сваёй і сілай мастацкай вартасці яны паспяхова заваёўваюць сэрцы мільёнаў людзей.

▸ РОЗДУМ

# СА СВЕТЛЫМ РОЗУМАМ

Генрых ДАЛІДОВІЧ

**...У сталіцы, у Мінску, я, хутаранін на працягу 15 гадоў, а пасля ўжо і насельнік блізкай вёскі Янковічы Стаўбцоўскага раёна, скончыўшы дзесяцігодку, заявіўся ў 1963 годзе і быў там да паловы лета 1968-га. На беларускім аддзяленні філфака Белдзяржуніверсітэта. Як і некаторыя іншыя, хто ўжо вучнем спрабаваў штосьці акеміць у паэзіі, прозе, публіцыстыцы ды сказаць і сваё слова (на пачатку ў раённай газеце).**



Зразумела, тады не толькі абсяг даўнейшай і сучаснай беларускамоўнай творчасці ва ўсіх жанрах, але і ўвогуле ў пазначаных вышуках я інтуітыўна спазнаваў найперш па савецкім школьным падручніку літаратуразнаўства і па школьнай савецкай хрэстаматыі літаратуры. Праўда, ужо ў апошніх класах дзесяцігодкі дасылаў асобнае сваё ў часопіс «Маладосць», дзе друкаваліся творы як тагачасных маладых, так і сталых пісьменнікаў. Ужо тое-сёе ведаючы ад сваёй радні, суседзяў (а яны спазналі свет пры БНР, «першых паляках», «першых саветах», «другіх паляках», «другіх саветах», пры «немцах», а таксама і пасля вывазу ў Нямеччыну ды нялёгкага звароту з яе, жыццё пасля Вялікай Перамогі), я ў тым-сім у маладосцеўскім (найперш у паказе праўды жыцця) пачаў разбірацца і сам, без дапамогі настаўнікаў. Яны, безумоўна, разумелі больш, але не ўсё, як казалі, «гэтае цяперашняе» ўхвалялі. З-за «непачцівасці да Сталіна».

Можа, і падсвядома пачаў спазнаваць: у новых мастацкіх творах закранаюцца «гутарковыя» пласты народнага жыцця, г. зн., тое, што не па радыё і ў газетах, а на вуснах у людзей цяпер, ужо пры не цалкам сталінскім ладзе. Таксама інтуітыўна пачаў адчуваць новыя інтанацыі ацэнак таго, што і як было напісана найбольш вядомымі пісьменнікамі XIX ст. Мабыць, у розніцы падыходаў да гэтых ацэнак: у школьных падручніках яны былі катэгарычна класавыя, з падкрэсліваннем паказу тымі пісьменнікамі «цяжкага сацыяльнага жыцця беларускага народа пры царызме», а вось у новых публікацыях закраналіся і іншыя матывы. У тым ліку і нацыянальныя. Адпаведна, новыя погляды былі больш шырокія, а з гэтым значна ўзбуйняліся і ўяўленні постацей творцаў.

Я чаму закранаю ў тое сваё, асабістае, нібыта зусім далёкае ў згадках пра Генадзя Кісялёва? Па-першае, яно зусім не далёкае. А па-другое, каб тады, у часы школьнай вучобы, нас скіроўвалі на чытанне не толькі школьных падручнікаў, а і новых публікацый, кніг-даследаванняў, то, канечне, уведаў бы, што з канца 1950-х свежа і ярка асвятляе грамадска-літаратурны дух мінулага стагоддзя ён, Генадзь Кісялёў, і што ў знамянальным для нас двух 1963 годзе пабачыла свет яго пасвойму ўнікальнае даследаванне «Сейбіты вечнага». Ды толькі ўжо студэнтам на лекцыях Алега Лойкі і Сцяпана Александровіча, з гутарак з крыху старэйшым, дапытлівым Рыгорам Семашкевічам захапіўся ім, пачаў усведамляць, што яно значыць.

Які тады, у 1963-м, быў час? Кіраўнік партыі і ўрада Хрушчоў прагнуў дагнаць і перагнаць ЗША, «похоронить империализм» і ўжо пры сваім жыцці ашчаслівіць любімы народ «коммунизмом» і ў сваіх здзяйсненнях-рэформах, якімі пачаў усіх змучваць, на адно з першых месц вылучыў барацьбу з рэлігіяй ды вытрасанне гістарычнай памяці. Не я адзін тады ведаў значна больш пра нейкія далёка дагістарычныя Асірыю, Урарту, не кажучы ўжо пра старажытныя Грэцыю, Егіпет і Рым, чым пра Беларусь. Не дадаў на першым курсе БДУ ведаў пра яе і лекцыямі па гісторыі Беларусі Л. Абэцэдарскі, згодна якога беларускі люд стагоддзямі быў пад уладаю Літвы і Польшчы, пакутаваў ад няволі і беднасці, жыў у цемры, таму са слязьмі шчасця ўз'яднаўся напрыканцы XVIII стагоддзя з Расіяй. Так, пацярпеў ад царызму, але дзякуючы Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі і бальшавікам набыў дзяржаўнасць і пачаў паспяхова развівацца. Не помню, каго з колішніх дзяржаўных асоб, палкаводцаў, вучоных, пісьменнікаў зямлі беларускай ён узвышаў (Скарыну — з агаворкамі, а Ефрасіння Полацкая падавалася ім як цемрашалка). Асабліва даставалася шляхце, Радзівілам і Сапегам — эксплуататары, здраднікі беларускага народа і польскія прыслужнікі, марнатраўцы, п'яніцы і г.д. Пра тое, што яны збіралі вялікія бібліятэкі, адкрывалі тэатры, музеі, школы, — толькі мімаходзь, як выключэнне. Праўда, прыязна адзначаў народных майстроў, якія плённа прадэманстравалі сваё архітэктурнае і мастацкае ўмельства ў Рускай дзяржаве. Карацей, паўтару, не я адзін тады думаў: да 1917-га ў нас мала што было значнае. Сялянскі цёмны мацярык з выражанымі жывацістымі панамі-аглаедамі!

Пазней з размоў з самім Генадзем Васільевічам даведаўся, што шлях да «Сейбітаў вечнага» ў вышэй названых умовах, што панавалі ў нас у ідэалогіі і гістарычнай навуцы, быў няпросты: ёй папярэднічалі пошукі ды карпатлівая праца ў архівах Літвы, новае асэнсаванне ролі «великого сына белорусского народа» (назва яго артыкула пра Кастуся Каліноўскага ў «Дружбе народов» за 1958 год), а таксама ролі паплечнікаў і працоўнікаў кіраўніка паўстання 1863–1864 гадоў, самога паўстання, дачынення да гэтага Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, Францішка Багушэвіча і іншых творчых асоб. Ды яшчэ трэба было літаральна пераламаць многія застарэлыя каноны на вышэйазначанае, асабліва ў галіне нацыянальнага пытання, рашуча адкінуць розныя ярлыкі, удакладніць таксама ўсялякія агаворкі, каб як мага бліжэй наблізіцца да праўдзівага адлюстравання таго, чым было XIX стагоддзе для лёсу Беларусі, што і як дзеля яе выратавання рабілі найбольш свядомыя і сумленныя яе сыны, ахвяруючы часамі за гэта і сваім жыццём. Генадзь Кісялёў не толькі ўстояў са сваімі канцэпцыямі як вучоны, але ў пэўнай ступені сцвердзіў іх у беларускім літаратуразнаўстве. Ды не толькі ў ім адным. Ён нязмушана змусіў лічыцца з імі і вучоных Расіі, Літвы, Украіны, Польшчы. Гэты змус сыходзіў не ад эмоцый альбо вострага палемічнага напалу (гэта, канечне, прысутнічала ў своеасаблівай кісялёўскай форме), а вызначаўся моцнай дакументальнай асновай і грунтоўнымі аналізам, доказамі. Да ўсяго ў добрым сэнсе, як слушна падкрэслівалі некаторыя літаратуразнаўцы, з дэтэктыўнай інтрыгаю — так падасць пэўны, здавалася б, сухі, дакументальны факт, але так удыхне ў яго жыццё, зацікавіць, што ледзь пераадолець нецярпенне: а што далей і што з гэтага выйдзе? І гэтую займальную якасць ён захавае ва ўсіх сваіх новых працах — як у навукова-папулярнай эсэістыцы, так і ў строга навукова-акадэмічных артыкулах і манаграфіях.

**Гэта ў старажытным Рыме нацыяналізм (natio) азначаў паняцце «народ», а ў СССР гэта лічылася «рэакцыйнай ідэалогіяй і палітыкай, накіраванай на распальванне нацыянальнай варожасці»**

Не часта было, ёсць і будзе, каб ужо на першую кнігу аўтара, асабліва літаратуразнаўца літаральна пасыпаліся захапляльныя водгукі і сур'ёзныя ўхвальныя рэцэнзіі. «Сейбіты вечнага» ў ліку такіх шчаслівых: у тым жа, 1963-м, яны былі ўхвалены С. Александровічам, М. Базарэвічам, М. Клышкам, А. Лойкам, А. Мальдзісам, В. Рагойшам, А. Траяноўскім і іншымі, — як цяпер бачым, людзьмі розных узростаў і прафесій, якім у многім аднолькава радасным было тое выданне. Яно ўжо не множыла не толькі ранейшыя ярлыкі, але і асобныя няўпэўненасці: куды, у які грамадска-палітычны лагер аднесці аднаго з удзельнікаў антыцарскага паўстання 1863–1864 гадоў (Антон Трусаў) і кіраўніка (Кастусь Каліноўскі), грамадскую і творчую дзейнасць Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча і Францішка Багушэвіча, якім раней прыпісвалі многія грахі містычнага «буржуазнага» або «паланізацыйнага» характару. У кнізе былі рашуча адкінутыя былыя недарэчныя, нават паклёпніцкія абвінавачванні і, бадай, упершыню ў беларускім савецкім літаратуразнаўстве была на фактах намаляваная агульная атмасфера XIX ст. у беларуска-літоўскім краі, настроі і паводзіны розных слаёў грамадства, рост змагання супраць царызму і фармаванне нацыянальнай свядомасці на грунце новага азначэння такой з'явы, як Беларусь. І тымі, хто мысліў, употай пісаў па-беларуску, і тымі, хто тварыў на іншых мовах (у большасці па-польску), але асэнсоўваў, вяртаў у памяць «тутэйшыну» — яе слаўныя ды паўзабытыя ўжо, абылганыя царскай ідэалогіяй падзеі, асобы. Найбольш з часоў Міндоўга, які прыкладна ў 1246 годзе (канцэпцыя М. Ермаловіча і іншых) дачыніўся да закладання падмурку Вялікага княства Літоўскага на беларускім грунце. Г. Кісялёў не толькі шмат чаго вяртаў у нашу памяць, але і літаральна рэабілітоўваў многія слаі нашай шляхты, найперш тых, хто не піў і не гуляў, а дбаў пра родны народ, які да 1772 года не толькі гібеў, але і меў дзяржаўнасць, высокаразвітыя навуку і культуру.

Трэба ўсё ж аддаць належнае і тагачасным настаўнікам беларускай літаратуры: не зусім на поўны голас, ды падкрэслівалі турботу сцвярджэння Беларусі, скажам, Ф. Багушэвічам, а К. Каліноўскім — чалавечай роўнасці, паляпшэння жыцця працоўнага народа (раздаць усю зямельную ўласнасць сялянам) і скасавання вялікіх прывілей дваранства (колькі за гэта Каліноўскі займеў ворагаў з асяроддзя шляхты ў роднай Беларусі, у Польшчы!) і царскіх чыноўнікаў, дзеля чаго ён развіваў ідэі сялянскай рэвалюцыі. Праўда, вучням пра тое веды даваліся павярхоўныя; сапраўдная праграма К. Каліноўскага, змест, ідэі рэдагаванай ім «Мужыцкай праўды» так і не былі як след асвечаныя, яшчэ менш — нацыянальнае пытанне: мабыць, многіх па-ранейшаму палохала яго азначэнне «маскалі». Г. Кісялёў доказна патлумачыў: пад гэтым азначэннем К. Каліноўскі меў на ўвазе царскіх чыноўнікаў, якіх натоўпамі наслалі з цэнтральных губерняў імперыі на Беларусь пасля задушэння паўстання 1830–1831 гадоў. Адпаведна, правадыр паўстання не меў антырускіх настрояў, ён жадаў для Беларусі і суседніх народаў «не падробленай, а сапраўднай» (А. Герцэн) волі, што «маскалямі» і пазнейшымі іх паслядоўнікамі (у тым ліку і некаторымі савецкімі гісторыкамі) разглядалася як антыруская пазіцыя.

Удакладніў Г. Кісялёў нацыянальнае пытанне і ў раздзеле «Сейбітаў вечнага», прысвечаным на той час малавядомаму беларускаму рэвалюцыянеру Антону Трусаву. У прыватнасці, было вельмі значна прачытаць адну мала каму вядомую вытрымку з пратаколаў допытаў захопленых удзельнікаў паўстання 1863–1864-х, дзе гаварылася, што вышэйназваны А. Трусаў настаянна напамінаў, што «ворагам сваім яны павінны лічыць не рускі народ, а рускі ўрад».

Яшчэ раз трэба напомніць: гэта можна было прачытаць у 1963-м, калі дзеля пабудовы камунізму павінны былі прынесціся ў ахвяру і... нацыянальныя мовы і культуры, а ўсеагульнай павінна была стаць руская. Адпаведна, павінна была знікнуць усялякая нацыянальная адметнасць, нацыі станавіліся насельнікамі — «савецкімі людзьмі» вялікай нарыхтоўчай канторы. Як нідзе, гэтая, мяккка кажучы, блюзнерная ідэя была падтрымана, сцягам узнесена мясцовымі «маскалямі» тут, у нас. Хто не жадаў вырываць са свядомасці, з душы карэннае з сівой даўніны, роднае, то яго залічалі ў «нацыяналісты». Гэта ў старажытным Рыме нацыяналізм (natio) азначаў паняцце «народ», а ў СССР гэта лічылася «рэакцыйнай ідэалогіяй і палітыкай, накіраванай на распальванне нацыянальнай варожасці» (па той традыцыі ў нас і дасюль падазроныя адносіны да тых, хто размаўляе па-беларуску: ты — ці пісьменнік, ці... «пазняковец»). Праўда, была і агаворка, што гэта магло быць і «рухам у прыгнечаных краінах за нацыянальную незалежнасць» — асабліва там, дзе правадыры руху, зразумела, імкнуліся пайсці па сацыялістычным шляху.

Г. Кісялёў, сканцэнтраваўшы ўвагу на нацыянальным аспекце ў антыцарскім паўстанні 1863–1864 гадоў, мо і міжволі паказаў, што з'ява сцірання нацыянальнай самабытнасці народаў зусім не новая, яна — спрадвеку. У тым ліку была даведзеная да крайнасці і ў Расійскай імперыі з яе тэорыяй народнасці, самадзяржаўя, праваслаўя і непадзельнасці. Г. Кісялёў яшчэ нібыта ілюстраваў, што нават з самым святым у душы трэба ўмець як след паводзіцца, каб не даваць зачэпак цяперашнім «інтэрнацыяналістам», якія мала чым адрозніваюцца ад былых шавіністаў: у першых і іх пераліцаваных наступнікаў адно і тое ж: прапагандысцкая і карная сіла. Але чытаючы пра пагляды, учынкі А. Трусава, К. Каліноўскага і іхніх аднадумцаў, свядомаму і сумленнаму нельга было не захапіцца: вунь як раней, у суцэльных цемрачы, гнё-

# І ДУШОЙ




**Трэба было дзеля праўды, дасведчанасці расшыфраваць і іх, своеасаблівых герастратаў — мучыцеляў і ганьбітаў нашых класікаў!**

це, бяспраўі XIX стагоддзя былі і ў нас сейбіты матчынага. Яны запалілі ад боскасці, свяшчэннага агню продкаў свечачку і неслі яе ў сцюжы, нягоды і асвятлялі шлях да праўды, высакароднасці і годнасці, да будучыні. Дык што ім ганебна здраджваць? Не толькі самаўніжацца, але і самазнішчацца? Ці быць не проста насельнікам, работнікам канторы, а паўнацэнным грамадзянінам сваёй Бацькаўшчыны, праз свае, беларускае, несці матэрыяльны і духоўны дар чалавецтву?!

Гэта — не проста сённяшні ўдзячны Кісялёву пафас. Гэта — падзячнае прызнанне таго, што ён зрабіў першай кнігай і налучыў сабе, іншым рабіць на будучае. Што датычыць мяне асабіста, то ёсць яшчэ адзін немалаважны момант, які наблізіў да Г. Кісялёва і шмат значыў, значыць для мяне. Выйшла так, што ён і я з сем'ямі прыкладна ў адзін час (на пачатку 1970-х) пераехалі ў Мінск: яны — з Вільні, мы — з Барысаўскага раёна. І не проста перабраліся, а патрапілі жыць на адну вуліцу, у адзін дом (па вуліцы Сурганава, 21) і нават на адну лесвічную пляцоўку, стаўшы, такім чынам, самымі блізкімі суседзямі.

Як часта бывае ў гарадскіх, на першым часе нашыя суседскія сустрэчы абыходзіліся толькі вітаннем. Мне здалося, што вядомы сусед (кандыдат філалагічных навук, член Саюза пісьменнікаў) не проста стрыманы для бліжэйшага знаёмства, але быццам пагледжвае на мяне, на гадоў пятнаццаць маладзейшага, яшчэ не абкніжанага, звысоку. Час паказаў, што быў я не зусім глыбокі псіхолаг, памыляўся, яшчэ асабіста не ведаючы стрыманага, сціплага, часамі нават сарамлівага характару Генадзя Васільевіча. Як пасля выявілася, ён, як я да яго, таксама прыглядаўся — як па суседстве, так і па маіх празаічных публікацыях у друку. Бадай, усё змянілася, калі там, на Сурганава, нашыя сем'і папоўніліся дочкамі. Спачатку кантакты наладзілі нашыя жонкі, якія ўжо не толькі віталіся, але, маючы шмат у чым агульныя інтарэсы, звязаныя з гісторыяй і літаратурай, разам вырашалі і многія сямейныя клопаты. Цяпер ужо і цяжка ўспомніць, колькі тады за некалькі гадоў было нашых гутарак, сумесных гасцінных вечарын: у нас — з нашымі роднымі, маімі калегамі, маладымі літаратарамі, у іх — з іхнімі сваякамі, з сябрамі-навукоўцамі, з сем'ямі Караткевічаў, Мальдзісаў, Адамчыкаў, Рагойшаў і іншымі. Тыя высокадухоўныя бяседы мо былі і ў духу тых вялікасвецкіх вечароў, што праводзіла інтэлігенцыя Расійскай імперыі, Рэчы Паспалітай, ВКЛ раней, у мінулыя стагоддзі. Без ніякага перабольшвання, тыя нашыя «сурганаўскія вячоркі» вельмі паўплывалі на мяне: з імі вучыўся больш шырока спасцігаць свет і творча-навуковы кругагляд знаных асоб, гісторыю і культуру. Не кажучы ўжо пра тое, што наслухаўся розных небыліц, цікавых успамінаў, незвычайных выпадкаў з жыцця прысутных і іхніх знаёмых. Паверце, цяпер вельмі шкада, што ўжо такія «застоллі і гавэнды» рэдкія, што хочаш ці не хочаш, а мусіш часта ўтыкаць вочы ў тэлевізар, па якім паказваюць даўжэзныя і бездухоўныя, гнятлівыя для розуму і душы серыялы. Адно збавенне — прыстойныя кнігі. У тым ліку і Г. Кісялёва.

Прыемнае ўражанне на нас зрабіла і матуля Генадзя Васільевіча Алена Мікалаеўна, якая часта і падоўгу гасцявала ў сына і дачкі. Ад яе даведаліся, чаму наш сусед размаўляе па-беларуску з даволі моцным рускім акцэнтам. Адкрылі для сябе: ягоная маці — з Віцебскай губерні, а бацька — падмаскоўвіч, у свой час служыў у органах дзяржаўнай бяспекі і, хоць па службе яго пераводзілі і ў Беларусь, быў выхаваны менавіта на рускай культуры (бацька пакінуў гэты свет маладым). Ды і Генадзь Васільевіч пасля заканчэння школы падаўся вучыцца ў Маскву, у гісторыка-архіўны інстытут, а пасля яго ці не 11 гадоў працаваў у архівах Літвы і навучаўся там у аспірантуры. Але ўплыў маці (культасветнік і бібліятэкар), жонкі Яніны Міхайлаўны, знаўцы бібліятэчнай і архіўнай справы, беларускай, рускай, польскай і літоўскай моў, частыя сустрэчы з наездкамі ў Вільню беларускімі пісьменнікамі і літаратуразнаўцамі і, мабыць, свая, натуральная ўнутраная ўвага да беларускай гісторыі і літаратуры, сваё непахіснае жаданне сказаць шчырае слова пра нібыта заснулае ў архіўных папках і мала каму вядомае — усё гэта і іншае прывяло Г. Кісялёва спачатку да «Сейбітаў вечнага», а пасля да кнігі «З думай пра Беларусь: даследаванні і знаходкі з гісторыі беларускай літаратуры і рэвалюцыйнага руху другой паловы XIX ст.» (1966), якая таксама выклікала вельмі шырокі рэзананс. Адпаведна, у 1971-м аўтар паступіў на працу ў Інстытут літаратуры імя Янкі Купалы АН Беларускай ССР не навічком, а ўжо адным з самых аўтарытэтаў па даследаванні мінулага стагоддзя, асабліва па тэматыцы беларуска-руска-польскіх грамадска-рэвалюцыйных і літаратурных узаемадачыненняў. Літаральна на вачах аваладаў выдатнай беларускай літаратурнай мовай, а заадно і значна павысіў культуру творчасці, дабіваючыся стылявога бляску.

Ён працягваў вывучэнне дзейнасці, лёсаў паплечнікаў К. Каліноўскага, творчасці малазнаных і невядомых пісьменнікаў мінулай эпохі, а заадно настойліва паставіў сабе мэту адшукаць у пыльных архіўных папках з сухімі дакументамі, мемуарах, рукапісах імёны аўтараў славутых паэм «Энеіда навыварат» і «Тарас на Парнасе», зноў радуючы кнігамі пошукаў і знаходак «Загадка беларускай Энеіды» (1971), «Пошукі імя» (1978), «Героі і музы» (1982), «Спасцігаючы Дуніна-Марцінкевіча: спроба навуковай сістэматызацыі дакументаў і матэрыялаў» (1988), «Ад Чачота да Багушэвіча: праблемы крыніцазнаўства і атрыбуцыі беларускай літаратуры XIX ст.» (1993) і інш. А побач было нямала самых розных публікацый у перыядычным друку, у тым ліку і навуковым.

У сувязі з гэтым нельга не падкрэсліць характэрную рысу Г. Кісялёва — не толькі ягоныя мэтанакіраванасць, настойлівасць, цярплівае корпанне і ў самай, здавалася б, далёкай для першачарговай неабходнасці фактуры, але і незвычайную перакананасць, упартасць, а, урэшце, дасягненне мэты. І пры гэтым — нейкая ціхая, зусім не самапахвальная радасць. Скажам, нібыта ён проста ўклаў і выдаў унікальны не толькі ў беларускім літаратуразнаўстве том «Пачынальнікі» (1977), дзе сціпла пазначыў, што гэта «з гісторыка-літаратурных матэрыялаў XIX ст.»! А там — унікальная карціна грамадска-літаратурнага сэрцабіцця, г. зн. жыцця, творчасці часамі ў жудасных умовах папярэдняй эпохі: урыўкі з тагачасных публікацый пра стан беларускай мовы і патаемнае друкаванне кніг на ёй за мяжою, пра розныя культурныя асяродкі, мноства разнастайных дакументаў, лістоў, датычных творчых асоб! А колькі (часамі больш сотні) да кожнага раздзела, а значыць і да кожнага творцы і іх лёсу каментарыяў! А «Дадатак», дзе бібліяграфія дакументальных публікацый пра беларускую літаратуру XIX ст. з 1923 па 1976 год! А што да ананімных паэм, то зноў жа Г. Кісялёў дамогся свайго — адшукаў, даказаў не столькі гіпотэзамі, колькі дакументамі, хто аўтар кожнай! Цяпер ужо тыя паэмы не ананімныя! Цяпер літаратуразнаўцам, настаўнікам, бібліятэкарам і іншым неабходна, маючы пад рукой даследаванні Г. Кісялёва пра тых Вікенція Равінскага і Канстанціна Вераніцына, шырэй уводзіць гэта ва ўжытак. Найперш у школе. І тыя падпольныя аўтары, і вышуквальнік іх вартыя ісціны.

І яшчэ. Даследчык ахвотна, нават смела браўся і за новыя даследніцкія пласты, каб распрацаваць і іх. Да слова, не адзін год патраціў, каб сабраць, укласці зборы дакументаў і матэрыялаў пра жыццё, творчасць Янкі Купалы і Якуба Коласа. І зноў жа — колькі розных заўваг, каментарыяў, даведак! Нават пра нейкіх паліцэйскіх ці шавіністаў! Ды трэба было дзеля праўды, дасведчанасці расшыфраваць і іх, своеасаблівых герастратаў — мучыцеляў і ганьбітаў нашых класікаў! Тытанічная праца! І пры гэтым, як добра ведаю, ён не вызначаўся асабліва моцным фізічным здароўем. Ды не помніцца, каб ён клапаціўся пра адпачынак у поўным сэнсе гэтага слова: скончыўшы адну карпатлівую працу, тут жа браўся за іншую.

Па праве былога суседства, думаю, маю права падкрэсліць адну акалічнасць, што паспрыяла Генадзю Васільевічу столькі і гэтак плённа папрацаваць. Яму вельмі пашанцавала на жанчын. Пэўны час, у працяглым халасцяцтве, яго апекуном была маці-ўдава, якая прысвяціла сваё яшчэ маладое жыццё сыну-вучонаму, ствараючы яму для працы ўсе ўмовы. Пасля ёй на падмогу прыйшла жонка, якая таксама пазбавіла яго ад розных хатне-гаспадарскіх турбот, даючы яму магчымасць на працу ў архівах і бібліятэках, напісанне артыкулаў, кніг. Безумоўна, уцеху, радасць, творчае натхненне прыносілі яму і дочкі Лія і Наташа. Сям'я для Генадзя Васільевіча была вельмі моцным апірышчам.

...Нядаўна сям'я Генадзя Васільевіча падарыла мне выдадзены пры дапамозе шчырых дабрадзеяў том, у якім два раздзелы: «Кніга першая... Сейбіты: артыкулы пра беларускіх пісьменнікаў і дзеячаў рэвалюцыйнага руху 1863 года» і «... кніга апошняя. Скарынаўская сімволіка: вытокі, традыцыі, інтэрпрэтацыі».

Як бачым, Г. Кісялёў паўстае тут сімвалічна, у новым навуковым абліччы. Як з'яднаннем пад адной вокладкай навуковых прац, што пісаліся на працягу не менш чым паўстагоддзя, так і іхнім зместам. «Кніга першая» ў свой час запоўніла для зацікаўленых сучаснікаў «белыя плямы» пра высакародныя і трагічныя падзеі, пра лепшых сыноў нашага народа XIX стагоддзя, калі адвагай, намаганнямі і нашых землякоў быў нанесены не столькі ўзброены, колькі маральны ўдар па расійскім самадзяржаўі. У прыватнасці, В. Дуніным-Марцінкевічам і Ф. Багушэвічам — нават беларускім словам, якое не хацела паміраць дзеля яго, як справядліва зазначыў У. Ленін, «турмы народаў», а жадала таксама жыць, цвісці пад Божым сонцам. «Кніга другая» магла па-свойму, менавіта па-кісялёўску, запоўніць шмат «белых плям» эпохі папярэдніка названых пісьменнікаў — Францішка Скарыны, які, спасцігшы тагачасныя еўрапейскія веды вышэйшага ўзроўню, імі, а таксама народнай мудрасцю, роднай мовай землякоў, сваёй геніяльнасцю на пачатку XVI стагоддзя «слаўнае места Полацк», ВКЛ як дзяржаву, яго «люд паспаліты» ўславіў сваёй друкарскай справай, пазнаннямі ў галіне геаграфіі, астраноміі, гісторыі, філасофіі, літаратуры, матэматыкі, юрыспрудэнцыі і шмат яшчэ ў якіх іншых навук; але ў тым-сім Вялікі Беларус застаўся загадкавым, неспазнаным і сёння...

Г. Кісялёў падступаўся да выяўлення Скарынавых таямніц (напрыклад, сімволікі ягоных малюнкаў) спакваля, але зноў і зноў скрупулёзна, грунтоўна, з пэўным дэтэктыўным прыёмам. Зноў і зноў уражваюць яго глыбінныя веды, калі ён аналізуе самае яркае з напісанага пра Скарынаўскую сімволіку шматлікімі даследчыкамі на працягу не аднаго стагоддзя, умее тонка супастаўляць, аналізаваць, палемізаваць і пры гэтым не спяшацца спыняцца на сваім пункце погляду, запрашаючы пазнаёміцца з новымі фактамі і дакументамі, а таксама і з інтэрпрэтацыямі.

На жаль, на вялікі жаль, гэтая па задуме фундаментальная праца засталася няскончанай. «Атрыманы вынік я б назваў «Уводзінамі ў скарынаўскую геральдыку», — трапна заўважае ў прадмове да названых дзвюх кніг Генадзя Кісялёва такі ж масціты даследчык XIX стагоддзя і іншых эпох Адам Мальдзіс. — А яшчэ — навуковым дэтэктывам. Такім чынам, тытачу прапануецца песня вясновая, жаўруковая, і песня асенняя, жураўліная, нястомнага даследчыка-пісьменніка. А паміж імі стаяла гарачае і працавітае лета».

... Генадзь Кісялёў зарана адышоў ад нас. Але зробленае ім светлымі розумам і душой назаўсёды з намі: ён годна пісаў пра годнасць многіх нашых продкаў і заклікаў нас быць такімі...

ПАЧЫТАЕМ?

# ТРАНСЦЭНДЭНТАЛЬНЫЯ КЛАСІКІ І НЕ ТОЛЬКІ

Для літаратурнага працэсу істотна не колькі кніг напісана, а колькі з іх прачытана. Літаратуры цяпер выдаецца багата. У нас — таксама. Толькі паспявай сачыць за кніжнымі навінкамі ды наведваць прэзентацыі…

Калі вы не хочаце прапусціць штосьці цікавае, хочаце быць у курсе літаратурнага жыцця краіны, гэтая рубрыка — для вас. Кніжны аглядальнік **Ася ПАПЛАЎСКАЯ** разгледзіць выданні на любы густ. І патрабавальныя чытачы, аматары глыбокай паэзіі і прозы, і аматары белетрыстыкі ў кідкай вокладцы знойдуць тут сваю кнігу. Абавязкова.

## Пераасэнсаваная класіка ў пятрогліфах, эсэ, артыкулах

***Пятро ВАСЮЧЭНКА. АД ТЭКСТУ ДА ХРАНАТОПА. «ГАЛІЯФЫ», 2009. 200 старонак.***

***Навошта чытаць?..*** Хаця б для таго, каб расшыфраваць для сябе паняцце «трансцэндэнтальныя класікі». І… пабачыць беларуса вачыма яго ж самога.

***Каму чытаць?*** Усім, каго цікавіць свежы і непрадузяты, сучасны (!) погляд навукоўца, пісьменніка, крытыка, казачніка Пятра Васючэнкі на гісторыю літаратуры ў асобах.

«Канцэптуальнае адкрыццё Купалы звязана са спробай прарыву падвойнага экзістэнцыйнага кола: у праяве ХІІ «На могілках» Цень Мужыка паўстае з магілы, каб паглядзець, што памянялася ў свеце пасля ягонай смерці. Аглядзіны не прыносяць яму палёгкі: дзеці Мужыка цягнуць тую ж лямку цяжкога і вонкава марнага існавання.

Але ў тым, што падвойнае кола замкнулася, няма трагедыі, як няма і смерці, ёсць адвечны ўзаемапераход жыцця і смерці».

Кніга Пятра Васючэнкі «Ад тэксту да хранатопа» з'яўляецца працягам распачатай ім працы па асэнсаванні літаратуры як шматпавярховіка, слова як будаўнічага матэрыялу і пісьменнікаў як будаўнікоў. Пачатак — у зборніку «Адлюстраванне перштвора», які, акрамя пятрогліфаў («Пятрогліф: формула — чатыры «З». Звышлаканічнасць, звыш'ёмістасць, звышэканомія, звышглыбіня»), утрымлівае філалагемы («адбіткі святла ад Першаслова»). Разглядаемая мной кніга складаецца з ужо памянёных пятрогліфаў, а таксама з эсэ і артыкулаў. Побач са звышлаканічнасцю ды звыш'ёмістасцю — спроба разгадаць мастацкія таямніцы Якуба Коласа, паглыбіцца ў сімвалізм Максіма Багдановіча і Максіма Гарэцкага, зазірнуць у рай Уладзіміра Караткевіча…

«Тэсты адказваюць на пытанні «так» або «не», «ёсць» або «няма», «добра» або «дрэнна», але пры іх дапамозе ніколі не адкажаш на «гарэцкія» пытанні «што яно?», «адкуль яно?», «навошта?», «за што?».

## Анёлак і мы

***Леанід ДРАНЬКО-МАЙСЮК. АНЁЛАК І Я. «ГАЛІЯФЫ», 2009. 90 старонак.***
*Цёплая сацыяльна-філасофска-сатырычная проза*

***Навошта чытаць?..*** Каб зразумець, што такое Беларусь. Вачыма і розумам дзіцяці. Анёлка.

***Каму чытаць?*** Тым, хто любіць сапраўдную музыку. Тым, каму знаёмае адчуванне пакінутасці. Хто ведае, што такое любоў і каханне.

«…трэба навучыцца губляць, калі хочаш навучыцца знаходзіць».

Кніга Леаніда Дранько-Майсюка «Анёлак і я» складаецца з аднайменнага апавядання. Яно — пра гламурную N і пра Анёлка, які чакае маці ля ручая, пра адчуванне пакінутасці, любові, і нашай з вамі Беларусі, да Мінска. Твор багаты на ілюзіі, утрымлівае шмат аўтарскіх неалагізмаў: двуенне, асветар… У кішэннай кніжачцы — адказы на многія актуальныя пытанні.

«Творчасць — гэта перш за ўсё рух да кахання, але яна прыносіць большую, чым яно, радасць, бо не ператвараецца ў звычку; да кахання ж прывыкаеш як да лёсу, і тады твае думкі робяцца маруднымі, і мінецца дастаткова шмат часу, пакуль зразумееш: пазбавіцца звыклага кахання — усё адно, што разбагацець…»

Леанід Дранько-Майсюк: «Гэтае апавяданне ўтрымлівае шмат усяго: гэта і сацыяльная проза (узгадайма маці Анёлка, якая працуе пакаёўкай у Польшчы, зарабляе грошы), і філасофская, і паэтычная, і сатырычная проза (вобраз гламурнай N, такіх жанчын багата цяпер), гэта і паэма, і сімфонія... А сам Анёлак… У яго вобразе можна ўбачыць і Сымона-музыку Якуба Коласа (толькі мой Анёлак без скрыпкі, ён спявае, чакаючы стронгу), і Маленькага Прынца Экзюпеперы… Невыпадкова стары скрыпач выконвае адажыа Яўгена Глебава, што было напісана па матывах казкі «Маленькі Прынц». Я спадзяюся, што з'явіцца кампазітар, які напіша балет паводле гэтага апавядання».

## «Проста дзіўны лёс…»

***Тамара ЛІСІЦКАЯ. ИДИОТКИ (перавыданне). «РЕГИСТР», 2010. 688 старонак.***
*Выпрабавана на сабе.*

***Навошта чытаць?..*** Каб даць магчымасць галаве адпачыць, а сэрцу — папрацаваць.

***Каму чытаць?*** Тым, хто не баіцца пражыць драматычныя, поўныя слёз і расчараванняў 20 гадоў разам з трыма дзяўчатамі-мінчанкамі…

«Жизнь можно прожить правильно, но скучно. Или не скучно, но неправильно<…>. А что тут ответишь… Просто странная судьба… Не такая. Как у всех».

Першы раман вядомай тэле- і радыёвядучай Тамары Лісіцкай — пра трох сяброўак-мінчанак: бландзінку Ірку, не абцяжараную розумам і «цяжкімі» паводзінамі, пацанку Наташу, на долю якой выпадае так шмат выпрабаванняў, што не хочаш верыць, што такое магчыма, і рудую Лену, якая са змрочнай, няўпэўненай у сабе дзяўчынкі вырастае ў зорку тэлеэкрана (тыя, хто ведае біяграфію Тамары Лісіцкай, з лёгкасцю зразумее, што Лена — гэта і ёсць Тома)... Кожная з дзяўчат перажывае свае пераломныя моманты, свой крызіс асобы, ідзе да «якаснага» шчасця складаным, але цікавым шляхам.

Раман напісаны «на адным ўздыху», як кажа сама аўтарка. Чытаецца гэтак сама.

Смерць блізкага чалавека і любімай коткі; сарамлівае каханне, што стане праўдай, і каханне, якое апынулася жорсткім падманам; нялітасцівыя здрады і пакорлівая вернасць; легкадумныя аборты і нараджэнне дзяцей… — раман «Ідыёткі» Тамары Лісіцкай.

«Ехала, плакала, очень любила Ромку, Маруську, Леньку, Розу Наумовну, Ленку, Ирку, Минск… Была счастлива».

Тамара Лісіцкая: «Перавыданне рамана «Ідыёткі» было кампліментам для мяне. Перавыдаюць звычайна кнігі, якія карыстаюцца попытам: іх няма ў кнігарнях — прычыны перавыдання зразумелыя. У новым выданні ёсць шэраг істотных момантаў: раман выйшаў адным томам, а не двума, што спрошчвае жыццё чытача. Да таго ж, на вокладцы — больш актуальны фотаздымак, што спрошчвае жыццё аўтару».

## Па жыцці з гумарам

***Барыс ПЯТРОВІЧ. ПІЛІПІКІ. «ГАЛІЯФЫ», 2009. 82 старонкі.***
*Сур'ёзна-гумарыстычныя мініяцюры з жыцця*

***Навошта чытаць?..*** Кабузняць настрой сабе і тым, хто побач.

***Каму чытаць?*** Усім. Абсалютна ўсім.

«Піліп пісаў ліст бацькам у іншы горад. І так яму захацелася замест кропкі ў канцы апошняга сказа паставіць коску, што ён не вытрымаў і паставіў…»

Кніга Барыса Пятровіча пра Піліпа ўтрымлівае абсалютна звычайныя ды абсалютна незвычайныя гісторыі з нашага з вамі жыцця. Піліп сячэ дрэвы, палюе, піша лісты, едзе ў транспарце, разглядае лапавухую Неферціці… Часам Піліп падаецца небаракам, часам героем, а часам у дошку сваім хлопцам.

Аўтар, як і ў іншых сваіх творах, піша з цёплым нязлосным гумарам, стварае героя, у якім ёсць штосьці і ад нас з вамі.

«Піліпікі» — кніга, да якой хочацца звяртацца ў любым настроі і пры любым надвор'і.

«Вяртаючыся з лецішча ў горад на электрычцы, Піліп пазнаёміўся з адною жанчынаю. Не тое, каб пазнаёміўся, але сядзелі яны побач. Была яна крыху маладзейшая за Піліпа, што якраз найбольш і падабалася яму. Спачатку ён доўга, мо паўдарогі, сядзеў поруч з ёю моўчкі, а потым, калі пераязджалі рачулку, спытаў у яе…»

Барыс Пятровіч: «Піліпікі» пісаліся не жартам, не ўсур'ёз і не дзеля выпендрону. Яны проста пісаліся. А таму не задавайце пытання: а навошта яны пісаліся? Ні мне, ні сабе».

## Анатолю Сысу прысвячаецца…

***ЯГАМОСЦЬ. Вершы-прысвячэнні Анатолю Сысу. «МЕДЫСОНТ», 2009. 80 старонак.***
*«Паэту Беларусі — ахвяруем».*

***Навошта чытаць?..*** Каб аддаць даніну павагі Паэту ды параўнаць свае адчуванні паэзіі Анатоля Сыса з адчуваннем сталых і маладых творцаў, чые тэксты склалі кнігу.

***Каму чытаць?*** Прыхільнікам сапраўднае паэзіі.

Кніга вершаў-прысвячэнняў Анатолю Сысу «Ягамосць» выйшла да 50-годдзя паэта. Укладальнік кнігі — Сяржук Сыс, зямляк, блізкі сябра Анатоля Сыса. Кнігу склалі вершы як сяброў паэта, так і людзей, што не былі з ім знаёмыя; як сталых творцаў, так і паэтаў-пачаткоўцаў. Сярод аўтараў Эдуард Акулін, Рыгор Барадулін, Леанід Галубовіч, Адам Глобус, Анатоль Вярцінскі, Яўгенія Манцэвіч, Міра Лукша і іншыя.

Сяржук Сыс: «Назва кнігі нараджалася ў спрэчках, у сумненнях. Анатоль Сыс хацеў назваць сваю апошнюю кнігу так — «Ягамосць». З якой прычыны ён гэтага не зрабіў? Мусіць, таму, што гэта было б вялікім нахабствам — звяртацца так да сябе і сваёй творчасці. Таму што Анатоль называў ягамосцю не сябе асабіста, а паэта ў сабе. Калі ж сябры называюць яго так, гэта выглядае нармальна. Напачатку меркавалася назваць «Ягамосцю» кнігу выбранай паэзіі Анатоля Сыса «Алаіза». Гэтая назва ў выніку была аспрэчаная. З той жа прычыны, што гэтага не зрабіў сам Анатоль. Было б зноў жа нясціпла называць кнігу іншых вершаў «Ягамосць». Таму яна дасталася кнізе з вершамі-прысвячэннямі».

АКЦЫЯ

# ЛЕТА З БЫКАВЫМ



**Рэдакцыйная калегія Поўнага збора твораў народнага пісьменніка Беларусі Васіля Быкава, якая працуе пры Саюзе беларускіх пісьменнікаў, запрашае актывістаў беларускага мастацкага слова і грамадскіх распаўсюднікаў з рэгіёнаў Беларусі да супрацы.**

Мы хочам з вашай дапамогай бясплатна перадаць у бібліятэкі нашай краіны (гарадскія, раённыя, вясковыя, школьныя) 8 тамоў прозы нацыянальнага класіка, якія выйшлі ў свет (наступныя рыхтуюцца).

Давайце правядзём лета разам з праўдзівым і прароцкім словам Васіля Быкава!

Даведкі па мабільных тэлефонах: **(+375-29)6376643; (+375-29)2748597.**

КОНКУРС

# ПАВАЖАНЫЯ СЯБРЫ!

**ГА «Саюз беларускіх пісьменнікаў» праводзіць новы конкурс на лепшы літаратурны твор, у якім асвятляецца вобраз жанчыны ў сучасным грамадстве і асэнсоўваюцца актуальныя гендэрныя праблемы.**

На конкурс прымаюцца тэксты ўсемагчымых жанраў: паэзія, проза, драматургія, крытыка. Аўтарамі конкурсных твораў могуць быць і мужчыны, і жанчыны, і пачаткоўцы, і прафесіяналы.

Лаўрэатаў літаратурнага конкурса «Жанчына ў сучасным грамадстве», які будзе доўжыцца да 1 кастрычніка 2010 года, чакаюць прэміі, прызы і падарункі, а пераможца атрымае магчымасць выдаць свой тэкст асобнай кнігай!

Калі ласка, дасылайце свае творы на адрасы: паштовы — 220012, Мінск, вул. Кузьмы Чорнага, 31, пакой 906; электронны — sbp@tut.by.

**Сакратарыят Саюза беларускіх пісьменнікаў**

**Кіраўнік праекта «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» Алесь ПАШКЕВІЧ. Рэдактар Барыс САЧАНКА. Тэлефон для даведак: (8-017) 280-17-91. Мінск-25, а/с 91.**
**Адрас электроннай пошты: sbp@tut.by**

## 30 ЛІПЕНЯ, ПЯТНІЦА

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтарэсаў.
**09.05** Камедыйны серыял «Участак» (Расія).
**10.00** Меладраматычны серыял «Заўсёды кажы «заўсёды»-3» (Расія). 3-я серыя.
**10.55** Камедыйная меладрама «Не нарадзіся прыгожай» (Расія).
**11.40** «Актуальнае інтэрв'ю».
**12.10** Дэтэктыўная драма «Падаленыя наступствы» (Украіна).
**14.15** «OFF STAGE LIFE» з Вольгай Сярожнікавай.
**14.30** Альманах вандраванняў.
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** «Залатыя Віцязі» славянскага братэрства».
**16.10** Моладзевы серыял «Маладыя і шчаслівыя» (Расія). 5-я серыя.
**17.05** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё». «У маёй дачкі - пераходны ўзрост».
**18.05** Камедыйная меладрама «Не нарадзіся прыгожай» (Расія).
**19.25** «КЕНА».
**19.30** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**19.55** Камедыйны серыял «Участак» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.50** «Новая хваля-2010». Дзённік.
**22.00** «Новая хваля-2010». Конкурс. Дзень другі. Канцэрт чальцоў журы.
**00.45** Дзень спорту.

**06.00, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**10.00** «Дурэмар і прыгажуні».
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Чакай мяне». Беларусь.
**12.00** «Малахаў +».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.45** «Кантрольны закуп».
**15.30** «Хачу ведаць» з Міхаілам Шырвіндтам.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальнае кальцо». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Хай кажуць» з Андрэем Малахавым.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Камедыйны серыял.
**18.55** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Утаймаванне свавольных».
**22.55** «Уварванне».
**01.00** Нашы навіны.
**01.15-01.25** Навіны спорту.

**06.00** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.30** «24 гадзіны».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.30** «24 гадзіны».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавела.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Мачаха». Серыял.
**13.30** «24 гадзіны».
**13.50** «Сакрэтныя гісторыі».
**14.40** «Next 2». Серыял.
**15.35** «Чэркізона. Аднаразовыя людзі» Серыял.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** СТБ прадстаўляе: «З чаго пачынаецца Радзіма».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Мачаха». Серыял.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.20** «Добры вечар, маляня».
**20.40** «Камедыя па пятніцах»: «Знаёмства са спартанцамі». ЗША, 2008г.
**22.30** «24 гадзіны».
**22.55** Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**23.40** «Для тых, хто не спіць»: «Электра». ЗША - Канада, 2005г.
**01.15** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

**07.00** Добрая раніца.
**08.00** Час футбола.
**08.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.30** Жансавет.
**10.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**11.00** Дэтэктыў «Той, хто памнажае смутак» (Расія). 3-я серыя.
**12.00** Моладзевы фантастычны трылер «Замена» (Данія).
**13.35** Меладраматычны серыял «Пакахай мяне зноў» (Мексіка).
**14.30** Мультсерыял «Доктар Дог» (Францыя).
**14.55** Пазакласная гадзіна.
**15.10** Усё пра бяспеку.
**15.35** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі» (Аўстралія).
**16.25** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.30** Медычныя таямніцы з доктарам А.Цярэшчанкам.
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.05** Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**19.50** Калыханка.
**20.10** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы. Дзень 4-ы. Прамая трансляцыя.
**23.10** Пра мастацтва.
**23.35** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі» (Аўстралія).
**00.25** Гісторыка-прыгодніцкая камедыя «Сказ пра тое, як цар Пётр арапа ажаніў» (СССР).

РОССИЯ ТЕЛЕКАНАЛ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне». Расія, 2008 г.
**10.10** «»Мой срэбны шар. Павел Бондараў». Кіроўны - Віталь Вульф.
**11.00** Весткі.
**11.30** «Тэрыторыя прыгажосці». Тэлесерыял. 2009 г.
**12.25** Алена Якаўлева ў тэлесерыяле «Каменская».
**13.20** «Кулагін і партнёры».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** Прэм'ера. «Аб самім галоўным». Ток-шоў.
**15.20** Мастацкі фільм «Ісаеў».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.15** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Прэм'ера. «Кармеліта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Прэм'ера. Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне». Расія, 2008 г.
**20.30** «Сапраўднае каханне». 2009 г.
**22.20** Навіны - Беларусь.
**22.30-00.25** Алег Ефрэмаў, Людміла Зайцава і Міхаіл Конанаў у камедыі «Добры дзень і бывай».

НТВ

**07.00** Сёння.
**07.05** Інфармацыйны канал «Сёння раніцай».
**08.25** Вострасюжэтны серыял «Таксіст».
**09.15** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**10.00** Сёння.
**10.25** «Жаночы погляд».
**11.10** «Лепшы горад зямлі».
**12.05** Дэтэктыўны серыял «Крымінальнае відэа».
**13.00** Сёння.
**13.30** Крымінальны дэтэктыў «Мужы».
**15.05** «Прафесія-рэпарцёр».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** «Следства вялі…».
**20.35** Вострасюжэтны серыял «Хлопцы са сталі».
**22.25** «Зараза. Вораг усярэдзіне нас». Навуковы дэтэктыў Паўла Лабкова.
**23.35** Крымінальная драма «Гаспадары ночы».
**01.35** Рамантычная меладрама «Турэцкія лазні».

EUROSPORT

**08.30** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы. Барселона (Іспанія). Дзень 4.
**15.00** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы. Барселона (Іспанія). Дзень 3.
**16.00** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. Германія. 1/2 фіналу.
**17.20** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**17.30** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы. Барселона (Іспанія). Дзень 3.
**19.15** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы. Барселона (Іспанія). Дзень 4.
**23.15** Лёгкая атлетыка. Фотафініш. Барселона (Іспанія). Часопіс.
**23.45** Футбол. Чэмпіянат Еўропы да 19 гадоў. Францыя. Фінал.
**01.00** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы. Барселона (Іспанія). Дзень 4.
**02.00** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг. Часопіс.

БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** Праект «Будучыня» (навукова-папулярны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**07.50** «Урок беларускай мовы», дак. фільм, рэж. Міраслаў Дэмбінські, 2006 г., Польшча.
**08.40** «У пошуку ідышу», дак. фільм, рэж. Юрый Хашчавацкі, 2008 г., Беларусь.
**10.10** «Папялушка» (Kopciuszek), тэлесерыял: 36 серыя.
**10.35** YoLife! (моладзевая праграма)
**10.55** «Зграя», сенсацыйны серыял: 8 серыя.
**11.45** «Вясельныя клопаты», маст. фільм.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Папялушка», тэлесерыял.
**17.30** «Элі Макбіл», тэлесерыял: V сезон, 9 серыя.
**18.15** Форум (ток-шоў): «Уласнасць як аснова дэмакратыі».
**19.00** Басанож па свеце (спазнаваўчая праграма) (паўтор).
**19.25** «Надзвычай прыгодніцкія падарожжы Цюхці», мультсерыял.
**19.35** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.00** МакраФон: «Сон-трава», канцэрт гурта «Троіца», ч. 1.
**20.30** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча (паўтор).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** «Вышэй за падазрэнні», маст. фільм.
**23.00** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма).
**23.10** Аб'ектыў (паўтор).

## 31 ЛІПЕНЯ, СУБОТА

**06.50** Дакументальна-пазнавальны серыял «Планета дрэў» (Францыя).
**07.20** Існасць.
**07.45** Дзень спорту.
**07.55** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.05** Здароўе.
**09.45** Пазнавальны серыял «Чалавек супраць дзікай прыроды» (ЗША-Вялікабрытанія). Фільм «Французскія Альпы».
**10.40** «OFF STAGE LIFE» з Віталём Карпанавым і групай «Дразды».
**10.55** «Славянскі кірмаш». Абранае.
**12.10** Залатая калекцыя савецкага кінематографа. Прыгодніцкі фільм «Да мяне, Мухтар!» (СССР).
**13.45** Дакументальна-гістарычны цыкл «У пошуках ісціны» (Украіна). Фільм «Узлёты і падзенні Місіэра Шрубалёта».
**14.35** «ЗОНА Х». Вынікі тыдня.
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** Вакол планеты.
**16.10** Дакументальны цыкл «Фартыфікацыя» (Беларусь).
**16.55** Відэафільм АТН « Глыбоччына « цыкла «Зямля беларуская».
**17.10** Відэафільм АТН «Прабач мяне».
**17.35** «OFF STAGE LIFE» з Алінай Краўцовай.
**17.55** «Ваша лато».
**18.45** Латарэя «Пяцёрачка».
**19.25** «КЕНА».
**19.30** «Легенды рока. «Smoki» у Мінску».
**21.00** Панарама.
**21.35** «OFF STAGE LIFE» з групай «Lite Sound».
**21.50** «Новая хваля-2010». Дзённік.
**22.00** «Новая хваля-2010». Вечар Давыда Тухманава.
**00.45** Уласнай персонай.

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Суботняя раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** «Мая выдатная няня». 2004 год.
**09.45** «Здароўе».
**10.30** «Смак».
**11.10** Леанід Быкаў у фільме «Алешкіна каханне».
**12.50** Анімацыйны фільм «Вакацыі Гуфі».
**14.05** Фільм «Утаймавальніца тыграў».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Прэм'ера. «Леанід Якубовіч. Без матыля».
**17.20** Прыгодніцкі фільм «Ідальга».
**19.55** АНТ прадстаўляе: «Чакай мяне». Беларусь.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Добры дзень, дзяўчынкі!».
**22.30** Джодзі Фостэр у фільме «Ілюзія палёту».
**00.15** Фільм «Больш, чым проста гульня».

**07.35** «Афрамасквіч - 2». Камедыйны серыял.
**08.20** «Сямейнае кіно»: «Казка пра закаханага маляра». СССР, 1987 г.
**09.40** «Калі ласка, скардзіцеся».
**10.00** «Крокі да поспеху» з Алінай Кабаевай.
**10.55** «Мінск і мінчукі».
**11.30** «Салдаты. Залатыя серыі».
**13.15** «Новыя вандраванні дылетанта».
**13.50** «Залатая калекцыя»: «Удар! Яшчэ удар!». СССР, 1968 г.
**15.45** Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.45** «Наша справа».
**17.00** «Вялікі горад».
**17.45** «Кіно»: «Іншая асоба». Расія - Украіна, 2008г.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** «Сусветны блокбастар»: «Гнеў». ЗША - Вялікабрытанія, 2004 г.
**22.55** «Зорны рынг».
**00.00** «Нефармат»: «Фантомы». ЗША, 2008 г.
**01.30** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

**07.20** Кулінарная праграма «Смачна з Барысам Бурдой».
**07.45** «Вянок санетаў» («Беларусьфільм»).
**09.20** Нашы тэсты.
**09.55** Жансавет.
**10.35** Свая кампанія.
**11.15** «Запал па культуры» з Генадзем Давыдзько.
**11.55** Героіка-прыгодніцкі серыял «Ад'ютант яго правасхадзіцельства» (СССР). 1-я - 3-я серыі.
**16.05** Гісторыка-прыгодніцкая камедыя «Сказ пра тое, як цар Пётр арапа ажаніў» (СССР).
**17.55** Камедыйны серыял «Дурнушка Бэцці-2» (ЗША). 1-я серыя.
**18.50** «Летні жарт з...». Гумарыстычная праграма (Расія).
**19.25** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы. Дзень 5-ы. Прамая трансляцыя.
**22.40** Камедыйная меладрама «Тэорыя хаосу» (ЗША).
**00.15** Жывы гук.

РОССИЯ ТЕЛЕКАНАЛ

**07.00** Весткі.
**07.10** Алег Ефрэмаў, Людміла Зайцава і Міхаіл Конанаў у камедыі «Добры дзень і бывай».
**08.45** Дэтэктыў «Следствам усталявана».
**10.25** «Ранішняя пошта з Ларысай Грыбалёвай».
**11.00** Весткі.
**11.10** «Суботнік».
**11.50** «Сапраўднае каханне». 2009 г.
**13.45** «Здабытак рэспублікі».
**14.00** Весткі.
**14.15** «Эдзіта Пьеха». Дак. фільм.
**15.15** «Мядовы месяц».
**17.05** «Суботні вечар».
**19.00** Весткі.
**19.25** «Гарадок». Дайджэст.
**19.55** Тэлесерыял «Гаішнікі». Расія, 2008 г.
**22.05** Фільм «Салодкая жанчына».
**23.55** Канцэрт Валера Меладзэ «Акіян».

НТВ

**07.35** Мультфільм.
**08.00** Сёння.
**08.20** «Авіятары».
**08.50** «Агляд».
**09.20** «Без рэцэпту».
**10.00** Сёння.
**10.25** «Галоўная дарога».
**10.55** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.00** Сёння.
**13.20** «Жаночы погляд» Аксаны Пушкінай.
**14.10** Меладрама «Альпініст».
**16.00** Сёння.
**16.20** «Вочная стаўка».
**17.10** «Злачынства будзе раскрыта».
**19.00** Сёння.
**19.30** «Самыя гучныя «Рускія сенсацыі».
**21.30** «Ты не паверыш!».
**22.05** Прэм'ера. Фантастыка «Гандляр сном».
**23.50** Містычны дэтэктыў «Барвовыя рэкі-2: Анёлы апакаліпсісу».

EUROSPORT

**09.30** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы. Барселона (Іспанія). Дзень 4.
**11.00** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы. Барселона (Іспанія). Дзень 5.
**13.30** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы. Барселона (Іспанія). Дзень 4.
**14.00** Аўтаспорт. Формула 2. Брно (Чэхія). Гонка 1.
**15.00** Тэніс. Турнір WTA. Стэнфард (ЗША). 1/4 фіналу.
**16.00** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы. Барселона (Іспанія). Дзень 4.
**17.15** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы. Барселона (Іспанія). Дзень 5.
**23.00** Лёгкая атлетыка. Фотафініш. Барселона (Іспанія). Часопіс.
**23.30** Тэніс. Турнір WTA. Стэнфард (ЗША). 1/2 фіналу.
**01.00** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы. Барселона (Іспанія). Дзень 5.
**02.00** Лёгкая атлетыка. Фотафініш. Барселона (Іспанія). Часопіс.

БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**07.50** Форум (ток-шоў): «Уласнасць як аснова дэмакратыі».
**08.30** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**08.55** Басанож па свеце (спазнаваўчая праграма).
**09.20** МакраФон: «Сон-трава», канцэрт гурта «Троіца», ч. 1.
**09.55** «Папялушка», тэлесерыял: 37 серыя.
**10.20** «Надзвычай прыгодніцкія падарожжы Цюхці», мультсерыял.
**11.00** «Элі Макбіл», тэлесерыял: V сезон, 9 серыя.
**11.50** «Вышэй за падазрэнні», маст. фільм, рэж. Стывэн Ла Рок, 2000 г., ЗША.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**17.30** «Элі Макбіл», тэлесерыял: V сезон, 10 серыя.
**18.20** МакраФон: «Бардаўская восень–2007»: выступ Андрэя Мельнікава.
**18.40** Чалавек і вайна: «1945. год, які змяніў свет.
**19.30** «Надзвычай прыгодніцкія падарожжы Цюхці», мультсерыял.
**19.40** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.10** «Падарожжа па руінах», рэпартаж, рэж. Уладзімір Самойлаў, 2010 г., Беларусь.
**20.30** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма).
**20.40** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.10** Паляванне на дзівосы (спазнаваўчая праграма).
**21.30** Суботні сеанс: «Вышук», маст. фільм.
**23.00** Аб'ектыў (паўтор).

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



## 1 ЖНІЎНЯ, НЯДЗЕЛЯ

**Першы канал**

07.55 Камедыя «Пасля кірмаша» («Беларусьфільм»).
09.00, 12.00, 15.00 Навіны.
09.05 «Арсенал». Праграма аб войску.
09.35 «Зброя». Цыкл дакументальных фільмаў (Беларусь).
09.50 Альманах вандраванняў.
10.20 Кулінарнае шоў «Кухар на хаце» (ЗША).
10.50 «OFF STAGE LIFE» з Вікторыяй Алешка.
11.05 «Млын моды-2010». Перадача 1-я.
12.15 Залатая калекцыя савецкага кінематографа. Меладрама «Вас чакае грамадзянка Ніканорава» (СССР).
13.55 Хранікальна-дакументальны цыкл «Гарачыя кропкі» (Беларусь).
15.10 Навіны рэгіёна.
15.30 Відэафільм «Планета гольфа: Літва».
15.55 Меладрама «Ванечка» (Расія).
18.00 Суперлато.
19.00 Дакументальна-гістарычны цыкл «У пошуках ісціны» (Украіна). Фільм «Праклён скарбу Мазепы».
19.35 Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна). Фільм «Цімаці».
20.30 «Спортлата 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
20.50 «КЕНА».
21.00 «У цэнтры ўвагі».
21.50 «Новая хваля-2010». Дзённік.
22.00 «Новая хваля-2010». Конкурс. Дзень 3.

**АНТ**

07.00 АНТ прадстаўляе: «Нядзельная раніца».
08.00, 09.00 Нашы навіны.
09.05 Нядзельная пропаведзь.
09.20 «Мая выдатная няня». 2004 год.
09.55 «Шалапутныя нататкі».
10.15 Пакуль усе дома.
11.10 «Шчасце ёсць!».
12.00 «Фазэнда».
12.35 «Фаіна Ранеўская. «Прыгажосць - страшная сіла».
13.35 Анімацыйны фільм «Алладзін».
15.00 Прэм'ера. «Вера Сотнікава. Уцёкі ў каханне».
16.00 Нашы навіны.
16.15 Навіны спорту.
16.20 АНТ прадстаўляе: «Гарады-героі. Мурманск».
17.20 «Жаночая ўласнасць».
19.00 «Дэтэктар хлусні».
20.00 Контуры.
21.05 «Вялікая розніца».
22.10 Прэм'ера. Юбілейны вечар Леаніда Якубовіча.
00.30 «Паўднёвае Бутава».

**СТБ**

07.20 «Афрамасквіч - 2». Серыял.
08.10 «Кіно»: «Знаёмства са спартанцамі». ЗША, 2008 г.
09.30 «Аўтапанарама».
10.00 «Відавочца прастаўляе: самае смешнае».
10.50 «Вялікі сняданак».
11.30 «Салдаты. Залатыя серыі».
13.15 «Добры дзень, доктар!».
13.50 «Дарагая перадача».
14.30 «Залатая калекцыя»: «Дон Кіхот». СССР, 1957 г.
16.30 «24 гадзіны».
16.50 «Асабістая цікавасць» з Паўлам Каранеўскім.
17.20 Канцэрт Міхаіла Задорнава.
19.00 «Аўтапанарама».
19.30 «Тыдзень».
20.30 Чэмпіянат Рэспублікі Беларусь па футболе: «ФК Мінск» - «ФК Нафтан». Прамая трансляцыя.
22.25 СТБ прадстаўляе: «А напярэдадні ў нас усё жыццё».
23.45 «Арт-хаўс»: «Трэцяе пакаленне». Германія, 1979 г.
01.40 «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

**ЛАД**

07.20 Кулінарная праграма «Смачна з Барысам Бурдой».
07.45 Камедыйная меладрама «Тэорыя хаосу» (ЗША).
09.20 Нашы тэсты.
09.55 Школа рамонту.
11.00 Гераіка-прыгодніцкі серыял «Ад'ютант яго правасхадзіцельства» (СССР). 4-я - 5-я, заключная, серыі.
13.45 «Правы чалавека». Аўтарская праграма Яўгенія Новікава.
14.00 Гаспадар.
14.30 Прыгодніцкая меладрама «Дом з нестадзеўкай» (Расія). 1- я -4-я, закл., серыі.
17.40 Дакументальны цыкл «Неверагодныя гісторыі кахання» (Украіна).
18.35 Камедыйны серыял «Дурнушка Бэцці-2» (ЗША). 2-я серыя.
19.25 Жаночая ліга.
19.55 Смешная часіна.
20.30 Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы. Дзень 6-ы. Прамая трансляцыя.
23.05 Драма «Аўгуст» (ЗША).
00.30 Свая музыка. Працяг.

**РОССИЯ**

07.00 «ХА». Маленькія камеды.
07.25 «Салодкая жанчына».
09.00 «Гаішнікі». Расія, 2008 г.
11.00 Весткі.
11.10 «Сам сабе рэжысёр».
12.15 Фільм «Будзем чакаць, вяртайся».
14.00 Весткі.
14.15 «Смехапанарама Яўгенія Петрасяна».
15.15 Фільм «Жанчыны».
17.15 «Смяяцца дазваляецца». Гумарыстычная праграма.
19.00 Весткі.
19.25 «Сумленны дэтэктыў». Аўтарская праграма Эдуарда Пятрова. «Хросны мэр».
20.00 Фільм «Час шчасця».
22.10 Вострасюжэтны фільм «Помста». 2007 г.

**НТВ**

07.40 Мультфільм.
08.00 Сёння.
08.20 «Дзікі мір».
08.45 «Іх норавы».
09.20 «Ядзім хаты!».
10.00 Сёння.
10.25 Прэм'ера. «Першая перадача». Аўтамабільная праграма.
10.55 «Крамлёўскія жонкі».
11.55 «Дачны адказ».
13.00 Сёння.
13.20 «Лепшы горад зямлі».
14.15 Фантастычны баявік «Перакрыжаванні міроў».
16.00 Сёння.
16.20 «І зноў добры дзень!».
17.10 «Злачынства будзе раскрыта».
19.00 Сёння.
19.30 «Чыстасардэчнае прызнанне».
20.05 Дэтэктыўны серыял «Дарожны патруль-2».
00.00 «Футбольная ноч».
00.30 «Асабліва небяспечны!».

**EUROSPORT**

09.30 Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг. Warm up. Брно (Чэхія).
10.00 Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы. Барселона (Іспанія). Дзень 5.
11.00 Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы. Мужчыны. Марафон. Барселона (Іспанія).
13.30 Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг. Брно (Чэхія).
14.00 Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг. Брно (Чэхія).
15.00 Суперспорт. Чэмпіянат свету. Данінгтон (Вялікабрытанія).
16.00 Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. Германія. Фінал.
18.15 Супербайк. Чэмпіянат міру. Данінгтон (Вялікабрытанія). Заезд 1.
18.45 Супербайк. Чэмпіянат міру. Данінгтон (Вялікабрытанія). Заезд 2.
19.30 Матаспартовы часопіс.
19.45 Вось дык так!!!
20.00 Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы. Барселона (Іспанія). Дзень 5.
20.30 Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы. Барселона (Іспанія). Дзень 6.
23.30 Лёгкая атлетыка. Фотафініш. Барселона (Іспанія). Лепшыя моманты. Часопіс.
00.30 Тэніс. Турнір WTA. Стэнфард (ЗША). Фінал.
02.15 Матаспартовы часопіс.

**БЕЛСАТ tv BELSAT**

07.00 Аб'ектыў.
07.10 Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
07.40 Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
07.55 Паляванне на дзівосы (спазнаваўчая праграма).
08.10 «Падарожжа па руінах», рэпартаж, рэж. Уладзімір Самойлаў, 2010 г., Беларусь.
08.30 МакраФон: «Бардаўская восень–2007»: выступ Алеся Камоцкага і Андрэя Мельнікава.
08.50 Чалавек і вайна: «1945. год, які змяніў свет» 2005 г.
09.35 Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
10.00 «Надзвычай прыгодніцкія падарожжы Цюхці», мультсерыял.
10.35 «Элі Макбіл», тэлесерыял: V сезон, 10 серыя.
11.20 Суботні сеанс: «Вышук» (Wanted), маст. фільм, рэж. Тэрэнс М. О'Кіф.
17.05 Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
17.30 «Таямніца крэпасці шыфраў», тэлесерыял: 5 серыя.
18.15 Моўнік (лінгвістычная праграма).
18.30 Дакументальная гадзіна: «Цягнік стаіць пяць хвілінаў», дак. фільм, рэж. Яніна Лапінскайтэ, 2009 г.
19.30 «Надзвычай прыгодніцкія падарожжы Цюхці», мультсерыял.
19.35 «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: ч. 2, 4 серыя.
19.25 Вагон (сатырычна-забаўляльная праграма).
20.30 Басанож па свеце (спазнаваўчая праграма).
21.00 Тыдзень у «Аб'ектыве».
21.30 Побач з намі (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
21.50 Фільматэка майстроў: «Апошні імператар», маст. фільм, рэж. Бэрнарда Бэрталуччы (Bernardo Bertolucci), 1987 г., Брытанія–Кітай–Ган-Конг.
00.30 Тыдзень у «Аб'ектыве» (паўтор).

# Шаноўныя чытачы!

**Будзьце ўважлівымі: змяніліся нашы рэквізіты ў банку і адрас рэдакцыі. Рахунак: 3012741108019 у аддзяленні №539 ОАО «Белінвестбанка», код банка 153100739. Адрас банка: 220004, Мінск, вул. Калектарная, 11. Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, вул. Мележа, 1, офіс 1234**
**Падпісацца можна на перыяд ад 1 месяца да 1 года праз пошту або праз банк.**

## Падпіска на «Новы час» праз пошту

1. Ідзем на бліжэйшае паштовае аддзяленне.
2. На ПАШТОВЫМ ПЕРАВОДЗЕ пішам суму грашовага пераводу ў лічбах і прапісам.
3. У графе «Ад каго» пішам прозвішча, імя, імя па бацьку.
4. Ніжэй указваем адрас.
5. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
6. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

БЕЛПОЧТА

ф. ПС 112

**ЭЛЕКТРОННЫЙ ДЕНЕЖНЫЙ ПЕРЕВОД**

№ ______ (вход, по карте отправки)

ВЫРУЧКА ☐ НАЛОЖЕННЫЙ ПЛАТЕЖ ☐

(сумма цифрами) (сумма прописью)

ПОЛУЧАТЕЛЬ___ Г-та «Новы час», р/с 3012741108019 отд. №539 ОАО «Белинвестбанк», код 153100739, УНН 190790926

КУДА 220004, г. Минск, ул. Коллекторная, 11
почтовый код, адрес получателя, телефон)

ОТПРАВИТЕЛЬ ____
почтовый код, адрес отправителя, телефон)

АДРЕС ____

Доставка ☐ уведомление ☐ простое ☐ заказное ☐ электронное

(назначение платежа)

(письменное сообщение)

Отметки отделения почтовой связи места приема:
(почтовый код, оттиск контрольно-переводной печати, кол. шт.)
№ перевода по ф. 5 ______________
Время приема _______ ч. _____ мин.
Подпись

## Падпіска на «Новы час» праз банк

1. Ідзем у адзяленне банка і на адмысловым бланку пішам прозвішча, імя, імя па бацьку і адрас.
2. Указваем суму аплаты і здзяйсняем пералік грошай.
3. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
4. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
отд. №539 ОАО «Белинвестбанк»
(наименование банка)

Счет получателя 3012741108019 Лицевой счет Код 739

УНП* 190790926

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |

Период подписки указывает абонент

Плательщик

Пеня ________

Всего ________

Кассир

**Для тых, хто прымае рашэнні!**

Новы час

www.novychas.org

ГЕАПАЛІТЫКА

# ЦЯЖАР КАЛАНІЗАТАРА

Алег НОВІКАЎ

**50-я ўгодкі незалежнасці Афрыкі, якія адзначаюцца сёлета, можна таксама назваць юбілеем палітыкі вайсковых інтэрвенцый Францыі на Чорным кантыненце.**

За паўстагоддзя Францыя ператварылася ў Афрыцы ў нешта сярэдняе паміж жандарам і службай выратавання. 40 (!) разоў за 50 гадоў французскія вайскоўцы выконвалі розныя місіі, прычым не толькі ў сваіх былых калоніях. Калі сітуацыя станавілася крытычнай, французаў на дапамогу выклікалі кіраўнікі дзяржаў, якія калісьці ў якасці калоній і мандатных тэрыторый належалі Вялікабрытаніі, Італіі, Бельгіі.

Лічыцца, што асновы палітыкі вайсковых інтэрвенцый заклалі дамовы, якія французы заключылі ў 1960 годзе з урадам кожнай са сваіх былых калоній. Дамовы былі напісаныя пад шаблон, і адзін з пунктаў гарантаваў мясцоваму ўраду вайсковую дапамогу ў выпадку неабходнасці.

Хаця першы раз Парыж даслаў войскі сыходзячы выключна са сваіх скурных інтарэсаў. Калі ў 1956 годзе Туніс абвясціў незалежнасць, адразу ўзнікла пытанне вайсковай французскай базы ў партовым горадзе Бізерце. Шарль дэ Голь вельмі баяўся, што ў Бізерце, які знаходзіцца побач з Алжырам, прыхільнікі алжырскай незалежнасці стварацьсвой плацдарм. Адпаведна, французы адмовіліся эвакуяваць персанал. Па Тунісу пракацілася антыфранцузская грамадская кампанія, якая закончылася ўзброенымі правакацыямі і блакадай базы.

Тады ўпершыню было вырашана выкарыстаць paras (так у Францыі называюць дэсантнікаў). Увогуле, paras і салдат Іншаземнага легіёну пасылаюць на першую лінію падчас падобных аперацый. У Бізерце дэсантнікі хутка выцеснілі праціўніка. Спачатку ўрад Тунісу пратэставаў у ААН і пагражаў разарваць адносіны з Парыжам, аднак пасля пайшоў на кампраміс. У 1963 годзе французы самі эвакуявалі базу.



Міратворчыя місіі французаў у Заіры, Самалі. Кот-д'Івуары, Нігерыі, Эрытрэі дапамаглі стабілізаваць унутраныя канфлікты, вырашыць праблему голаду і эпідэмій

Французска-туніскі канфлікт — выключэнне з правілаў. Звычайна французы прыходзяць у тую ці іншую краіну Афрыкі па рашэнню міжнароднай супольнасці або па просьбе тутэйшых палітыкаў. Упершыню так здарылася ў Габоне ў 1964 годзе. Там афіцэры і апазіцыя пазбавілі ўлады вельмі аўтарытарнага прэзідэнта Леона Мба (ён праславіўся тым, што хадзіў па вуліцах з палкай і збіваў кожнага мінака, які не салютаваў яму). Дарма змоўнікі прасілі французскага пасла не дасылаць paras. Тыя прыйшлі і аднавілі статус-кво. Праўда, пасля французы зразумелі, што памыліліся. У Мба пачалася псіхічная хвароба. Яго вывезлі ў Парыж, а ў Габоне прызначылі новага больш адэкватнага прэзідэнта.

Нельга сказаць, што французскі спецназ падтрымліваў выключна дыктатараў. У 1979 годзе французы дапамаглі легітымнаму прэзідэнту Давіду Даско вярнуць сабе кантроль над Цэнтральна-Афрыканскай Рэспублікай. Адначасова была знішчана дыктатура імператара Жана-Бідэля Бакасы, які, як вядома, быў канібалам і папросту еў сваіх апанентаў.

Асобную старонку займаюць учынкі французаў у Афрыцы ў часы «халоднай вайны». Так, у 1977 годзе Нацыянальны фронт вызвалення Конга (FNLC) пачаў вайсковыя дзеянні супраць празаходняга ўраду Заіру. За FNLC стаялі Ангола — сатэліт Масквы і Гаваны. Паўстанцам удалося захапіць стратэгічна важны горад. Навіна яго пра падзенне шакавала ўлады Заіру. Тагачасны прэзідэнт краіны Мабуту асабіста абрываў тэлефон французскага прэзідэнта Валеры Жыскар д'Эстэна, молячы яго пра падтрымку. Французы ў выніку дапамаглі ачысціць горад ад партызан.

Гэта аперацыя стала хрэстаматыйнай. Згубіўшы прыкладна 5 чалавек, paras забілі 250 паўстанцаў, якія трымалі ў жаху жыхароў Колвеці. Нядзіўна, што тубыльцы сустракалі французаў кветкамі. Парадокс у тым, што ад тэрору партызан іх вызвалiў другі полк Іншаземнага легіёну. Менавіта гэта фармаванне ў часы алжырскай вайны выклікала самы вялікі жах у мірнага насельніцтва.

Варта таксама згадаць пра ўдзел французаў у канфлікце ў Чадзе ў 1970–1980-я гады. Парыж стаяў на баку ўраду Хісена Хабрэ, якому на поўначы краіны яшчэ з 1960-х супрацьстаяў паўстанцкі сепаратысцкі рух. У 1980-я ў сепаратыстаў знайшоўся спонсар — Лівія. Лінія фронту хутка рушыла на поўдзень. Французы дапамаглі Хабрэ спыніць наступ паўстанцаў і стварыць яму больш-менш здатную армію.

Больш таго, у лютым 1985 года французскія самалёты нанеслі ўдар па аднаму лівійскаму гораду, дзе партызаны знайшлі сабе прытулак. Увесь парк вайсковых самалётаў на мясцовым аэрадроме быў знішчаны. Абураны Муамар Кадафі ў адказ даў загад бамбіць сталіцу Чаду Нджамену. Аднак да гораду змог даляцець толькі адзіны савецкі «Ту», і той нічога кепскага не зрабіў.

Інтарэсы Лівіі і Францыі таксама перасякаліся ў Марока, дзе Трыпалі падтрымліваў сепаратысцкі Фронт вызвалення Заходняй Сахары. А вось барацьба з сепаратыстамі ў Руандзе стала чорнай плямай на рэпутацыі *paras*. Армія, якую падрыхтавалі французскія спецыялісты, адыграла вядучую ролю ў генацыдзе народу тутсі.

Незвычайную аперацыю правялі французы ў 1995 годзе на Каморах. Яе асаблівасць у тым, што *paras* змагаліся з былым французскім спецназаўцам Бобам Дэнарам. Боб Дэнар, авантурыст па натуры, здолеў сабраць банду падобных да сябе, арганізаваць на выспах вайсковы пераварот і абвесціць сябе яе прэзідэнтам. Сусветная супольнасць была ў шоку. Праўда, дзякуючы французскім вайскоўцам незвычайная дзяржава Дэнара пратрымалася нядоўга.

Нарэшце, варта адзначыць міратворчыя місіі французаў у Заіры, Самалі. Кот-д'Івуары, Нігерыі, Эрытрэі. Тут яны дапамаглі стабілізаваць унутраныя канфлікты, эвакуяваць дыпламатычны персанал, вырашыць праблему голаду і барацьбы з эпідэміямі. Зараз французскія спецыялісты актыўна працуюць у прграме барацьбы з самалійскімі піратамі.

Нягледзячы на тое, што французская армія была і застаецца важным чыннікам у вырашэнні шматлікіх канфліктаў, стала своеасаблівым гарантам адноснай палітычнай стабільнасці, здабыла каласальны досвед вайсковых дзеянняў, стаўленне да гэтага феномену ў Францыі вельмі рознае. Шмат хто крытыкуе палітыку вайсковых інтэрвенцый. Падобныя аперацыі, на думку крытыкаў, падрываюць давер да Францыі сярод часткі палітычнага істэблішменту, асобных этнасаў.

Сам Нікаля Сарказі падчас нядаўняга саміту з лідэрамі афрыканскіх дзяржаў прызнаваўся, што даўно хацеў бы паставіць кропку ў афрыканскай старонцы гісторыі французскага войска. Але як гэта зрабіць? Па падліках часопіса «Le Monde Diplomatique», на тэрыторыі Афрыкі сёння налічваецца каля 200 «замарожаных» канфліктаў, якія могуць у любы час выбухнуць.



## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

З расійскага боку хутка могуць пачаць гучаць лозунгі пра тое, што Лукашэнка з'яўляецца дыктатарам, каб замяніць яго іншай менш харызматычнай і незалежнай асобай, якая пагодзіцца на прыватызацыю. У гэтым пытанні Германія, Італія і Расія могуць падзяліць паміж сабой беларускі торт. Мядзведзеў не выпадкова назваў сярод партнёраў менавіта гэтыя краіны. Аднак нельга забываць і пра адносіны Мінску з Кітаем. Саюз з Кітаем можа змяніць сітуацыю, калі кітайцы паспрабуюць ператварыць Беларусь у сваю запасную базу.

**«Regnum» (Расія)**

Праблема ў тым, што ні вечных субсідый, ні вечных транзітных прыбыткаў не бывае. Гандлёвыя шляхі заўсёды мяняюцца, а калі трымальнік транзіту пачынае ламаць надмерныя, з пункту гледжання гандляра, кошты, гэта стымулюе пошукі абыходных шляхоў. Нагадаем, што Амерыка была адкрыта ў пошуках тых самых абыходных шляхоў, калі Венецыя, якая падпарадкавала гандлёвыя шляхі з Усходам, дастала ўсіх манапалізмам. Да адкрыцця абыходных газаправодаў Расія актыўна рыхтуецца. Пасля чаго жаданне і далей трываць жывую і непасрэдную манеру Аляксандра Лукашэнкі моцна паменшыцца. Сябраваць з такім саюзнікам можна толькі ад глыбокай безвыходнасці, але гэтай безвыходнасці ўжо няма. Палітыка не стаіць на месцы, ёсць іншыя шляхі і магчымасці. З адпаведнымі наступствамі для цяперашняга прэзідэнта Беларусі.

**«Вести» (Расія)**

А пошнія выступы Міхаіла Саакашвілі з нагоды «Усходняга партнёрства» вельмі дзіўныя. Спалі-спалі, і на табе, такі спрынт! З чаго б гэта Грузія захацела закласці ў падмурак партнёрства Рэспубліку Беларусь? Такія ідэі, як правіла, прасоўвае Вашынгтон.

**«Georgia Times» (Грузія)**

Эксперты трох краін, Беларусі, Грузіі і Расіі са здзіўленнем адрэагавалі на падтрымку беларускага прэзідэнта грузінскім. Грузія лічыцца ўзорным вучнем заходняй рынкавай эканомікі, у той час як Беларусь — нароўні з Паўночнай Карэяй — апошняя планавая эканоміка ў свеце. Рашучы выступ Саакашвілі, які лічыцца «заклятым ворагам Крамля», тлумачыцца ў прыватнасці тым, што Беларусь, нягледзячы на моцны ціск з боку Расіі, не прызнала суверэнітэт Абхазіі і Паўднёвай Асеціі.

**«Frankfurter Rundschau» (Германія)**

Несумяшчальнасць двух дыктатарскіх розумаў і інтарэсаў завялі справу ў тупік. Аднак Масква ўклала ў рэжым Лукашэнкі 50 мільярдаў долараў. А можа, нават больш. І не атрымала наўзамен ніякай адмысловай падзякі. Магчыма, Лукашэнка, адчуўшы пагрозу і эканамічны ціск, яшчэ паспрабуе выправіцца. Напрыклад, прызнае «незалежнасць» Абхазіі і Паўднёвай Асеціі. Але палітычная кан'юнктура для яго замены вельмі зручная. Не з-за любові да дэмакратыі і правоў чалавека расійскае тэлебачанне занялася выкрыццём Лукашэнкі.

**«Latvijas Avize» (Латвія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### АЗЕРБАЙДЖАН. СВЯТА ПРЫХОДУ АЛІЕВА

У Баку адбыліся святочны канцэрт і феерверк. Святкавалі 41-я ўгодкі прызначэння Гейдара Аліева (цяпер нябожчыка) першым сакратаром Цэнтральнага камітэта Камуністычнай партыі Азербайджана. На вышэйшую пасаду рэспубліканскага ўзроўню Аліеў прыйшоў з пасады старшыні КДБ Азербайджанскай ССР, дзе прапрацаваў 28 гадоў, пачаўшы кар'еру ў 1941 годзе з пасады супрацоўніка НКУС і даслужыўшыся да генерала. У Азербайджане гэта не адзіная дата, звязаная з кланам Аліевых, якія з невялікімі перапынкамі кіруюць Азербайджанам больш за 30 гадоў. Напрыклад, 10 мая праводзяцца штогадовыя ўрачыстыя цырымоніі ў гонар дня нараджэння Гейдара Аліева. Пакуль не зразумела, навошта было ў гэтым годзе так шырока святкаваць увогуле не круглую дату, звязаную з Аліевым. Магчыма, каб прыцягнуць увагу да кнігі член-карэспандэнта Нацыянальнай акадэміі навук Азербайджана Вагіфа Абасава «Урокі жыцця вялікіх і мудрых», якую прэзентавалі 12 ліпеня. Кніга прысвечана памяці Гейдара Аліева, які ставіцца аўтарам у адзін шэраг з такімі фігурамі, як прарок Мухамед, Ібн Сіна, Атацюрк, Ньютан, Рузвельт і іншыя.

**Па матэрыялах азербайджанскай службы «Радыё Свабода»**

### ПОЛЬШЧА. ПАТРЭБНА ДВА ПРЭЗІДЭНТА

З такой незвычайнай ініцыятывай выступіла адно польскае выданне. Матывацыя простая: польскае грамадства, як прадэманстравалі вынікі апошніх выбараў, падзеленае на два лагеры, які ўмоўна завуць «Польшча А» (буржуазія, гарадскі сярэдні клас) і «Польшча Б» (правінцыя, працоўныя нізкай кваліфікацыі). Першыя галасуюць за ліберальную «Грамадзянскую платформу», другія — за кансерватыўную партыю «Права і справядлівасць». На апошніх прэзідэнцкіх выбарах з невялікім адрывам перамог Браніслаў Камароўскі, кандыдат «Грамадзянскай платформы», што, на думку шматлікіх аглядальнікаў, абяцае працяг канфрантацыі. Каб унікнуць унутранага канфлікту, выданне прапануе кожнай Польшчы абіраць свайго асабістага прэзідэнта, якія б маглі разам кіраваць краінай. Прынамсі такая формула гарантуе нацыянальны дыялог. Аўтар канцэпцыі таксама лічыць, што геаграфічна вызначыць выбарчыя зоны «Польшчы А» і «Польшчы Б» няцяжка. «Польшча А» — гэта метраполія і найбольш развітыя гарады (Варшава, Кракаў, Лодзь). Усе іншае — «Польшча Б».

**Па матэрыялах «Neesweek» (Польшча)**

### ІСПАНІЯ. НОВЫЯ ПРАВІЛЫ ПРАКАТУ

Парламент Каталоніі прыняў закон пра ўвядзенне з 1 студзеня 2011 года новых правіл пракату фільмаў на тэрыторыі аўтаноміі. Цяпер усе стужкі павінны перакладацца на каталонскую мову або мець каталонскія субцітры. Не выключэнне і фільмы на іспанскай мове, што, уласна, і выклікала пратэсты. Справа ў тым, што рабіць поўны дубляж галівудскіх фільмаў на каталонскую мову для мясцовых пракатчыкаў занадта дорага. Таму яны будуць дубліраваць некалькі галоўных блакбастэраў, а ўсе іншыя фільмы пускаць у пракат з субцітрамі на каталонскай мове. Між тым, у суседніх правінцыях Іспаніі тыя ж фільмы будуць ісці ў поўным перакладзе на іспанскую. Такая схема, на думку крытыкаў, гарантуе стварэнне ў Каталоніі чорнага рынку DVD. На 99 працэнтаў такі рынак будзе знаходзіцца на рынку «Perpignan», дзе традыцыйна прадаюцца кнігі, фільмы, музыка. Парадаксальна, аднак у часы дыктатуры Франка менавіта тут з-пад палы прадаваліся кнігі на забароненай у Іспаніі каталонскай мове. Цяпер час прадаваць з-пад палы творы на іспанскай мове.

**Па матэрыялах «ABC» (Іспанія)**

### ПОЛЬШЧА. СУМ ЗА КАМУНІСТЫЧНЫМ ТУРЫЗМАМ



Самы папулярны польскі партал *Onet.pl* сцвярджае, што пасля 20 гадоў падзення камуністычнага рэжыму палякаў, якія нарадзіліся да 1985 года, ахапіла дзіўная настальгія па камуністычнай мадэлі турызму. Форумы перапоўненыя падобнымі на эсэ гісторыямі пра тое, як добра ў часы камуны было разам з сябрамі збегчы з дому ад бацькоў на прыроду і жыць у палатках, або дапамагаць родзічам на вёсцы, або жыць у дамах адпачынку. Адначасова актыўна крытыкуюцца стандарты сучаснага турызму. Пры гэтым аўтары падобных опусаў прызнаюць, што тагачасная інфраструктура ў часы летніх адпачынкаў была проста ў хаосе. У напрамку Балтыкі нельга было дастаць білетаў, у курортных кафэ стаялі вялізарныя чэргі, у вагонах і аўтобусах было папросту нельга дыхаць з-за колькасці пасажыраў і таннай касметыкі. Аднак цяпер чамусьці ўсё гэта падаецца такім мілым. Каментатары кажуць, што ў падобнай настальгіі няма нічога дзіўнага. Паўсядзённае жыццё ў Польскай Народнай Рэспубліцы было дастаткова сумнае і шэрае. І нячастыя адпачынкі пакідалі больш значны эмацыйны след, чым цяперашнія туры ў Турцыю і Егіпет.

**Па матэрыялах Onet.pl (Польшча)**

---

▸ **ЦІКАВА**

# ВЕЦЕР ПЕРАМЕНАЎ З ЯРОЧЫНУ

***Алег НОВІКАЎ***



**«Басовішча», «Краіна Мрій» і іншыя вядомыя ўсходнееўрапейскія рок-фестывалі так ці інакш вядуць свой пачатак ад маленькага польскага гарадку Ярочын. У гэтым годзе Ярочынскаму фестывалю, які ў савецкія часы быў самай буйной рок-імпрэзай у краінах Варшаўскай дамовы, споўнілася 30 гадоў.**

Усё, праўда, пачалося не ў 1980-м, а яшчэ на дзесяць гадоў раней. Прыкладна з 1970-га тутэйшы аматар рок-музыкі Кшыштаў Ваднічак арганізаваў на базе ярочынскага Дому культуры штогадовы конкурсны фестываль «Вялікапольскія рытмы маладых». Першым часам Ваднічак працаваў галоўным чынам з мясцовымі музыкамі. Аднак рэгулярны характар правядзення фестывалю на працягу 1970-х гадоў паступова зрабіў яму імя па ўсёй Польшчы. На ярочынскую акцыю штогод у ліпені пачалі прыязджаць вядомыя сталічныя рок-гурты («Dzem», «TSA», «Dezerter», «Kult», «Republica» і г.д). Зала Дома культуры зрабілася ўжо занадта цеснай, і мясцовыя ўлады пагадзіліся аддаць Ваднічку амфітэатр у гарадскім парку культуры і адпачынку. Пасля фестываль пераехаў на мясцовы стадыён.

У 1980 годзе «Ярочынам» зацікавіліся ў Варшаве. Узнікла ідэя стварыць нешта накшталт польскага Ньюпарта (курортнае месца ў ЗША, дзе штогод адбываюцца буйныя музычныя фестывалі). «Польскі Ньюпарт» — так вырашылі назваць Агульнапольскі парад музыкі маладой генерацыі (слова «рок» тады яшчэ мела крамольны палітычны прысмак). Была распрацаваная формула мерапрыемства: канцэрт зорак плюс конкурсная праграма.

Першы Ярочынскі фестываль быў вельмі паспяховым. Сакрэт палягаў у атмасферы мерапрыемства. Замест таго, каб камерна сядзець і слухаць выступы артыстаў, публіка ахвотна танчыла і выказвала сваю ацэнку музычным нумарам, кідаючы на сцэну памідоры. Спадабаўся фармат акцыі і музыкам. Нейкім чынам арганізатары дамовіліся, што на фестывалі не будзе цэнзуры з боку ідэалагічных ведамстваў.

Аднак сапраўдную славу «Ярочыну» прынеслі часы вайсковага становішча. Фестывалю пашанцавала — чамусьці, у адрозненні ад іншых імпрэзаў, яго вырашылі праводзіць. Так маленькі гарадок штогод у ліпені пачаў ператварацца ў своеасаблівы востраў свабоды, пляцоўку вольнага духу. Рок быў сімвалам супраціву. Калі ў 1984 годзе канцэрт паспрабаваў весці вядучы дзяржаўнага радыё, яго папросту засвісталі.

Хацелася б таксама згадаць, што «Ярочын» з'явіўся на свет, калі ў Польшчу прыйшла мода на панк. Іншымі словамі, фестываль аказаўся галоўным штогадовым мерапрыемствам для самай значнай і папулярнай моладзевай субкультуры таго часу. Акрамя таго, панк — вельмі агрэсіўная жыццёвая філасофія, пабудаваная на прынцыпах пратэсту супраць дзяржавы і яе атрыбутаў, перш за ўсё паліцыі.

Праўда, былі ў «Ярочына» і крытыкі. Шмат хто казаў, што Ярочынскі фестываль прыдуманы ўладамі (сапраўды, ягоны патронам быў мясцовы камсамол), каб накіроўваць моладзевы палітычны пратэст у субкультурныя рэчы, якія пагрозы для дыктатуры не ўяўляюць. Дарэчы, асцярожна ставілася да фестывалю і антыкамуністычнае падполле. Дысідэнтам не падабалася антыклерыкальная складовая рок-руху. У 1986 годзе група металістаў зрабіла дэбош на кальварыі ў Ярочыне. Касцёл, блізкі да «Салідарнасці», адрэагаваў заявай пра пагрозу сатанізму.

Так ці інакш, пачатак 1980-х стаў залатым часам «Ярочына». Кожны год у ліпені прыкладна 20 тысяч маладых людзей прыязджалі сюды з усёй краіны. Колькасць гуртоў, якія хацелі б выступіць на Ярочынскім фестывалі, даходзіла да 300 (звычайна адбіралі толькі 25–30). Пра «Ярочын» пачалі казаць па той бок жалезнай заслоны. BBC зняла цэлы фільм, прысвечаны фестывалю. Міф пра «Ярочын» крочыў таксама і на Усход. Так, арганізатары першага ўкраінскага фестывалю альтэрнатыўнай музыкі «Червона Рута» (1989 год) бралі за аснову менавіта фармат «Ярочына».

У 1988 годзе Міністэрства культуры часткова ўзяло на сябе функцыі арганізатараў, прызнаючы мастацкую каштоўнасць польскага року. Праўда, за чыноўнікамі з Мінкультуры прыйшлі і людзі ў цывільным, якія ўвялі цэнзуру для тэкстаў песняў. Канец 1980-х стаў пачаткам крызісу «Ярочына».

Прычым галоўную ролю тут адыграў свабодны рынак. Фестываль з самага пачатку не быў рэнтабельным і выжываў выключна за кошт вонкавай падтрымкі (як правіла, дзяржаўнай). У часы трансфармацыі грамадства колькасць спонсараў скарацілася. Першыя спробы камерцыялізацыі выклікалі адмоўную рэакцыю аўдыторыі. У 1994 годзе панкі зламалі ўсе рэкламныя плакаты кампаніі Philip Morris — афіцыйнага спонсара фестывалю.

У 1995-м фестываль увогуле давялося адмяніць. Цікава, што моладзь не ведала пра матэрыяльныя праблемы арганізатараў і па традыцыі ўсё роўна ў вялікай колькасці прыехала ў Ярочын.

Аднак пра адраджэнне Ярочынскага фестывалю можна было казаць толькі ў XXI стагоддзі. Вялікім поспехам адзначыўся фестываль 2005 года. Быў прыдуманы арыгінальны фармат. На час мерапрыемства Ярочын быццам зрабіў падарожжа на машыне часу і вярнуўся ў пачатак 1980-х. Вуліцы зноў насілі камуністычныя назвы, недзе можна было пабачыць транспаранты, якія заклікалі выканаць заўчасна пяцігодку, часам праходзілі злыя паліцэйскія патрулі… Ідэя спрацавала: усе 12 тысяч абанементаў на фестываль былі прададзеныя. Упершыню за сваю гісторыю фестываль прынёс прыбытак.

З таго часу арганізатары спрабуюць пры распрацоўкі канцэпцыі неяк балансаваць паміж настальгіяй па залатых часах Ярочына і бізнесам. Так, у гэтым годзе адной з фішак фестывалю абяцае быць продаж кефіру ў даўно забытых з савецкіх часоў шкляных бутэльках. Аднак, каб купіць той кефір, давядзецца на нейкі час сапраўды вярнуцца ў савецкі час — выстаяць вялізную чаргу. На гэтым камунізм заканчваецца — білет на тры дні фестывалю каштуе 200 злотых (прыкладна 70 долараў).

ЦІКАВА

# НАШТО ЧАВЕСУ БАЛІВАР

Іван БІЧ

**У Венесуэле ўскрылі магілу Сімона Балівара — героя вайны за незалежнасць Лацінскай Амерыкі. Чавес абяцае вялікую сенсацыю.**



Упершыню пра эксгумацыю Балівара свет даведаўся не з афіцыйных крыніц, а з персанальнага твітэра Уга Чавеса. У паведамленні было сказана: «Вітаю, сябры! Гэтай ноччу я перажыў адзін з самых эмацыйных момантаў свайго жыцця. Мы пабачылі рэшткі вялікага Балівара», — пісаў Чавес. «Вялікі шкілет павінен належаць Балівару, паколькі адчуваецца нейкі дух. Балівар жыве!» — распавёў таксама ў сваім твітэры венесуэльскі чыноўнік, сведка падзеі. Пазней у адміністрацыі Чавеса прызналі факт ускрыцця магілы Балівара, якая знаходзіцца ў будынку нацыянальнага пантэона ў Каракасе.

Цяпер усё, што было знойдзена ў труне, уважліва даследуюць навукоўцы. Іх асноўная задача — высветліць сапраўдныя прычыны смерці Сімона Балівара. Славуты дзеяч памёр у далёкім 1830 годзе. Паводле цяперашняй асноўнай версіі, прычынай смерці Вызваліцеля (прозвішча Балівара) быў туберкулёз. Аднак Чавес — правадыр абвешчанай ім самім баліварскай рэвалюцыі — упарта сцвярджае, што Балівара забілі, як мінімум атруцілі. Пры гэтым ён спасылаецца на нейкія мемуары сучасніка Балівара, хаця прозвішча аўтара не згадвае. Ён таксама кажа пра маральны абавязак венесуэльцаў высветліць прычыны смерці рэвалюцыянера, паколькі ягоныя рэшткі ў любы час могуць… знікнуць.

Увогуле, спекуляцыі на папулярнай у народзе асобе Балівара — стары папулісцкі трук у Венесуэле. Чавес у гэтай галіне не адкрыў Амерыкі. Аднак пры Чавесе постаць Балівара стала цэнтральным элементам палітычнай ідэнтыфікацыі. Культ Балівара з'яўляецца часткай афіцыйнай ідэалогіі цяперашняй Венесуэлы. Можна згадаць, што пасля прыходу да ўлады Чавес змяніў назву краіны. Былая Рэспубліка Венесуэла стала Баліварскай Рэспублікай Венесуэла.

Шануецца ўсё, што звязана з імем Вызваліцеля. Так, увесну з паўночнага Перу перанеслі ў Каракас парэшткі каханкі Балівара. У дзіцячых кніжках шмат месца прысвечана Навара — любімаму сабаку Балівара.

Больш таго, Уга кажа, што ён — сын Балівара, хаця і ў духоўным сэнсе. «Я сын Балівара, а Альвара Урыбе (прэзідэнт Калумбіі, палітычны праціўнік Уга) — сын здрадніка Сантандэра», — падкрэслівае венесуэльскі прэзідэнт. Францыска Сантандэр — паплечнік Балівара, які быў у свой час асуджаны за спробу забіць Вызваліцеля.

Чавес і яго паслядоўнікі сцвярджаюць, што іх палітыка грунтуецца на ідэйнай спадчыне Балівара. Мелі і маюць месца спробы стварыць з твораў Вызваліцеля больш-менш стройную арыгінальную дактрыну. Галоўны пункт канцэпцыі — пачатая Баліварам вайна за незалежнасць працягваецца і зараз, з той толькі розніцай, што галоўны вораг народаў Лацінскай Амерыкі зараз не Іспанія, а Злучаныя Штаты.

Такога кшталту інтэлектуальныя прарывы іранічна ўспрымаюцца сярод апанентаў рэжыму. Гэта тое ж самае, што аб'яднаць вужа і вожыка, кажуць яны. Па іх словах, Балівар быў сынам свайго часу, калі грамадства было падзеленае на прыхільнікаў і праціўнікаў лозунгаў Французскай рэвалюцыі. Адпаведна, сам Балівар належаў да лагеру якабінскай рэспубліканскай буржуазіі. Чавес, які называе сябе пераемнікам Балівара, ідэалізуе кубінскі досвед і спрабуе будаваць сацыялізм у XXI стагоддзі.

Не спадабалася апазіцыі і ідэя эксгумацыі Балівара. Па словах яе лідэраў, асноўным матывам для Чавеса капацца ў магілах з'яўляецца неабходнасць стварэння медыйнай падзеі, якая б магла адцягнуць увагу грамадства ад мінорнага стану рэчаў у эканоміцы. Толькі ў чэрвені інфляцыя склала 31 працэнт — самы высокі паказнік ва ўсёй Лацінскай Амерыцы. Апублікаваная на днях статыстыка эканамічных індэксаў за першы трыместр сведчыць пра рэцэсію венесуэльскай гаспадаркі.

Трэба таксама ўлічыць асаблівасці мясцовага палітычнага календара. На носе выбары. 26 верасня грамадзяне краіны павінны абраць новы склад парламенту. Апазіцыя, якая байкатавала папярэднія выбары, марыць узяць рэванш.

Важна ўлічыць таксама тое, што дзяржаўныя СМІ ўвесь час кажуць пра намеры ворагаў баліварскай рэвалюцыі забіць яе лідэра. Іншымі словамі, калі навукоўцы давядуць, што Балівара сапраўды тайна забілі, узнікае асацыяцыя паміж ім і Чавесам. Гэты момант, безумоўна, будзе выкарыстаны афіцыйнымі прапагандыстамі.

На карысць трактоўкі апазіцыі працуе таксама пазіцыя гісторыкаў. Навуковы свет вельмі скептычна ставіцца да тэзісу Чавеса пра тое, што Балівара маглі забіць. Іспанскае выданне «El Pais» дае слова дырэктару Нацыянальнай акадэміі гісторыі. Навуковец адзначае: «Не існуе ніякіх падстаў казаць пра тое, што Балівара маглі забіць. За ўвесь час з 1830 года ніводны гісторык нават не прапаноўваў такую версію».

З іншага боку, даследаванне рэшткаў Балівара будзе праводзіць вядомы іспанскі эксперт. Калі б мела месца палітычная замова, то, думаецца, улады знайшлі б якога-небудзь больш лаяльнага навукоўца. Увогуле, у даследаванні рэшткаў Балівара прымуць удзел 50 навукоўцаў.

Аднак прысмак таго, што ва ўсім гэтым замешана палітычная кан'юнктура, усё ж застаецца. Не верыцца, што такая вялікая медыйная кампанія вакол эксгумацыі Вызваліцеля застанецца без сенсацыі. Грамадства заінтрыгавалі і настроілі на сюрпрыз.

Прынамсі *BBC* цытуе аднаго з прадстаўнікоў адміністрацыі, які кажа, што навукоўцы ўжо накапалі ў магіле Балівара нешта вельмі цікавае і хутка пазнаёмяць грамадства са сваім адкрыццём.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ



### БАРАК АБАМА

Як вядома, частку свайго дзяцінства і юнацтва прэзідэнт ЗША правёў у Інданезіі. Гэты факт ужо стаў аб'ектам культурнай эксплуатацыі. Інданезійскі рэжысёр Джон Дэ Рантау зняў фільм пра тры гады, якія будучы прэзідэнт ЗША правёў у адной са школ у раёне Ментэнг, што ў Джакарце, сталіцы Інданезіі. Сюды ён паступіў у 1968 годзе і вучыўся да 1971-га, пакуль не пераехаў у ЗША. Ролю маладога Абамы выканаў Хасан Фарук Алі — амерыканец, які жыве ў Інданезіі. Роля маці Абамы дасталася нідэрландскай актрысе. Сюжэт фільма, які называецца «Барак Абама: гады ў Інданезіі», дастаткова банальны. Бары (такую мянушку меў Барак у маладосці) цяжка адаптаваўся да жыцця ў новай школе. Яму дапамагаюць новыя сябры. Разам яны супрацьстаяць мясцовым хуліганам, якія нікому праходу не даюць. Тройцы ў барацьбе супраць хуліганаў даводзіцца часам ужываць нават фізічную сілу. У выніку атрымалася інданезійская версія Цімура і яго каманды, што, натуральна, выклікала скепсіс у гісторыкаў. Не кажучы пра тое, што Абама на экране ўвесь час падкрэслівае веліч Інданезіі. З іншага боку, у працы над фільмам прынялі ўдзел тыя самыя былыя школьныя сябры Абамы. Яны сцвярджаюць, што ўсё так і было.

### МІХАЙ ГІМПУ



Гімпу, які часова выконвае абавязкі прэзідэнта Малдовы, прыняў удзел у святкаваннях юбілею Грунвальдскай бітвы ў Польшчы, чым выклікаў цікавую гістарычную палеміку на радзіме. У цэнтры дыскусіі пытанне, якім бокам малдаване датычаць бітвы з крыжакамі. Урадавыя гісторыкі кажуць,што Гімпу меў права прысутнічаць на полі Грунвальда, паколькі Малдова, якая на той час ужо 50 гадоў была незалежнай дзяржавай, адправіла ў дапамогу Ягайлу 400 чалавек. Між тым, апазіцыя пабачыла ў такой матывацыі Гімпу поўны правал ягоных канцэпцый. Нагадаем, што Міхай Гімпу на кожным кроку сцвярджае, што ніякіх малдаван няма, існуюць толькі румыны. Апазіцыйнай прэса піша: падставай для паездкі Гімпу ў Польшчу паслужыў той факт, што ў даўняй бітве ўдзельнічала каля 400 малдаван, пасланых ваяваць на баку ВКЛ малдаўскім гаспадаром. Адзінае пытанне — пры чым тут румын Міхай Гімпу?



### БАШАР АСАД

Прэзідэнт Сірыі, які атрымаў уладу ад свайго бацькі-нябожчыка, прыняў закон аб забароне нашэння паранджы. Праўда, ён забараняе паранджу, або, як яна тут называецца, нікаб, выключна ў школах. Пад дзеянне закона трапляюць як школьніцы, так і настаўнікі. Такі крок выклікаў цікавыя каментары заходніх палітолагаў. З аднаго боку, новы закон цалкам лагічны: у Сірыі жывуць вернікі каля 12 канфесій, таму свецкая рэспубліканская ўлада павінна дабівацца роўнасці для ўсіх. З іншага боку, у краіне назіраецца ўздым папулярнасці ісламу (рэакцыя ў тым ліку на дэфіцыт дэмакратыі і адсутнасць сацыяльнага прагрэсу). Чаго хацеў дамагчыся Асад падпісаннем такога закону? Большасць экспертаў бачаць у гэтым спробу прыцягнуць на свой бок дысідэнтаў, якія выступаюць за лібералізацыю і правы чалавека. Пасланне да іх вельмі простае: або вы будзеце жыць у аўтарытарнай краіне, не маючы грамадзянскіх праў, аднак маючы права на асабістае жыццё, або атрымаеце ісламскую дзяржаву — і нічога не будзеце мець. Як не дзіўна, такая стратэгія працуе. Жаночыя арганізацыі Сірыі дружна віталі забарону нікабу. У той жа час у Францыі арганізацыі жанчын не змаглі знайсці адзінай пазіцыі адносна забароны ісламскага адзення.

КНІГАРНЯ

# «БОЙНЯ №5»: ПРАЎДЗІВЫ РЭПАРТАЖ АПАКАЛІПСІСУ

Марыя МАРТЫСЕВІЧ

**Яшчэ адна адзнака сёлетняга 65-годдзя Вялікай Перамогі, шырока святкаванага ў Беларусі: днямі выходзіць даўно анансаваны раман амерыканскага пісьменніка Курта Вонегута «Бойня №5, або Крыжовы паход дзетак» у перакладзе на беларускую мову. Выданне здзейсніцца ў выдавецтве «Логвінаў» у серыі кніг «Біліятэка «Бацькаўшчыны»— Пераклады». Пра тое, чым можа прыдацца кніга беларускаму чытачу, мы гутарым з яе перакладчыкам Паўлам Касцюкевічам.**




«Бойня №5, або Крыжовы паход дзетак» («Slaughterhouse-Five, or The Children's Crusade») была напісана ў 1969 годзе. Гэта аўтабіяграфічны раман Курта Вонегута (1922–2007) пра бамбардаванне Дрэздэна падчас другой сусветнай вайны.

У 1944 годзе Вонегут, які добраахвотна ўступіў у армію ЗША, каб ваявацьз фашызмам у Еўропе, трапіў у палон і быў накіраваны ў Дрэздэн, дзе працаваў на заводзе па вырабе соладавага сіропу для цяжарных жанчын. 13–14 лютага 1945 года ён стаў сведкам бамбардавання Дрэздэна войскамі саюзнікаў. Ён апынуўся ў ліку тых сямі амерыканскіх палонных, што выжылі падчас масакры, у якой пацярпелі пераважна мірныя жыхары. У Дрэздэне не было бомбасховішчаў, паколькі горад не быў стратэгічным аб'ектам, і таму на ноч палонных замыкалі ў гарадской скатабойні №5, а падчас авіяналётаў спускалі ў падвал з мяснымі тушамі. Вонегут быў вызвалены з палону войскамі Чырвонай арміі ў 1945 годзе.

Бамбардаванне Дрэздэну стала самым страшным ваенным перажываннем Вонегута. Разам з іншымі палоннымі ён разбіраў завалы і выносіў з-пад руінаў тысячы трупаў. Свае перажыванні Вонегут адлюстраваў у рамане: крытыкуючы фашызм, ён тым не менш выразна асуджае знішчэнне Дрэздэна.

У першыя гады выхаду «Бойні №5» раман зазнаваў цэнзуру ў ЗША.

## «Вонегута я перакладаў заўсёды»

***— Павел, ты вядомы як паспяховы перакладчык ізраільскай літаратуры. Калі і пры якіх абставінах ты зацікавіўся амерыканістыкай?***

— Як мне цяпер здаецца, Вонегута я перакладаў заўсёды. Я жыў у Ізраілі і намерваўся распачаць кар'еру перакладчыка мастацкай літаратуры. Але літаратура на мове іўрыт па першым часе не здавалася мне прынадным аб'ектам для перакладу. Я не залічваў яе ў «гранд-літаратуры». Іншая справа — французская, брытанская, нямецкая, польская… А тое, што я стаў перакладаць менавіта гэты раман менавіта гэтага аўтара, было шчаслівым выпадкам.

У Ізраілі я працаваў ахоўнікам у ерусалімскім раёнчыку Нямецкая Калонія, дзе, паводле завядзёнкі, селіцца інтэлігенцыя. Культурны кантынгент — і сметнікі ў раёне культурныя. Мінаючы, заўсёды можна разжыцца якаснай кніжкай, якая ахайна ляжыць на ходніку перад кантэйнерамі. Было шмат англійскамоўнай літаратуры. У адну ноч я знайшоў «Сідхартху» Германа Гесэ па-англійску і наступнага дня сеў — нямецкі тэкст з англійскай мовы — перакладаць. Але вельмі хутка адступіўся ад гэтага намеру. І дзякуй Богу, бо сёння «Сідхартха» паспяхова абеларушаны германістам Арцёмам Арашонкам. А канкурэнцыя паміж перакладчыкамі, асабліва ў малой літаратуры, — гэта не жарты…

А адступіўся я ад «Сідхартхі» таму, што літаральна на наступны дзень адшукаў ля таго ж сметніку «Бойню №5» Вонегута. Я палічыў гэта шчаслівым знакам — і ўзяўся за пераклад менавіта гэтай кнігі.

***— Гэта было тваё першае знаёмства з пісьменнікам?***

— З пісьменнікам — не. Вядома ж, у дзяцінстве я, як, думаю, многія, чытаў выдатныя рускія пераклады Вонегута, якія належаць пяру Рыты Райт-Кавалёвай. Але тое былі культавыя ў СССР «Сірэны Тытана» ды «Калыска для коткі» — адзіныя, па-мойму, кнігі гэтага аўтара, прапушчаныя савецкай цэнзурай. Прапушчаныя таму, што ў іх не згадваецца Савецкі Саюз. «Бойня №5» — гэта твор, з дапамогай якога Вонегут спрабуе разабрацца з уласнай радзімай — і гэта як бы дае яму карт-бланш не цырымоніцца і з іншымі краінамі, уцягнутымі ў другую сусветную. Таму на рускую мову твор быў перакладзены толькі ў часы позняй Перабудовы. Між тым, у ЗША Вонегут зрабіўся шырока вядомым найперш дзякуючы гэтаму раману, які стаў класікай яшчэ пры жыцці аўтара, увайшоў у амерыканскую культуру і мову на ўзроўні цытатаў. Напрыклад, папулярная лаянка, якую я пераклаў як «каб ты ляцеў і пярдзеў праз дзірку бубліка». Або з гэтага раману пайшла ў гутарковую мову фраза «So it goes» — у маім перакладзе — «Во як!». Ну і, вядома ж, знакамітая малітва Курта Вонегута:

*Божа! Дай мне лагоды*
*прыняць тое, што*
*я не магу змяніць,*
*мужнасці*
*змяніць тое, што магу,*
*і мудрасці —*
*заўсёды адрозніць першае ад другога.*

Але ўсе гэтыя матывацыі — сусветная прызнанасць аўтара, неперакладзенасць на нашу мову, блізкасць закранутых ім тэмаў, — прыйшлі пазней, у працэсе працы над перакладам.

## «Праўда мяне вельмі ўзрушыла»

***— Чым асабіста табе блізкая закранутая аўтарам тэма бамбардавання Дрэздэна?***

— Ну як жа? Вайна! Пякучая праблема. Як ні круці, гэта адпраўны пункт найноўшай беларускай гісторыі. Дзяцінства маёй маці прыйшлося на 1960-я, і яна памятае, што ўсе размовы ў доме так ці інакш тычыліся вайны. Дарэчы, цікава, як у Беларусі кажуць «у вайну, пасля вайны», і ўсе імгненна разумеюць, пра якую з тысячы людскіх войнаў вядзецца гаворка. З другой сусветнай усе саюзнікі выйшлі героямі, але бамбардаванне Дрэздэну было злачынствам з боку Брытаніі і ЗША, і Вонегут першы ў Амерыцы пачаў пра гэта адкрыта гаварыць. Яго нават спрабавалі забараняць першыя гады, але, мяркую, нават у 1970-я ў Амерыцы Вонегут сутыкаўся з меншымі абмежаваннямі свабоды слова, чым гэта мае месца цяпер у Беларусі. У кожнай краіне, якую закранула, другая сусветная пакінула безліч праблемаў, іх цяжка развязаць і цяпер. Напрыклад, у Беларусі, з аднаго боку пэўная частка нацыянальнага пантэону — гэта калабаранты пры нацысцкай акупацыйнай уладзе. І тое трэба асэнсоўваць, у тым ліку мастацкімі сродкамі. З гэтым трэба жыць.

З іншага боку, невядома, да чаго могуць давесці бяздумныя пампезныя святкаванні… Існуе небяспечная тэндэнцыя — найперш сёння ў Расіі — рамантызацыі, «гламурызацыі» не толькі савецкай зоркі, але і нацыскага арла.

***— Ты лічыш, што беларуская ваенная проза гаворыць недастаткова «праўды пра вайну»?***

— Я лічу, што яна старанна ўнікае падводных камянёў гэтай тэмы. І справядліва: крок улева, крок управа — і ты асуджаны на грамадскае ганьбаванне. Курт Вонегут жа, выдатна ведаючы гэта, у працівагу беларускай прозе не дае дакладных адказаў на адвечныя пытанні: «Хто вінаваты?» і «Што рабіць?». Яго спосаб хоць неяк прасунуцца ў асвятленні гэтай праблемы — апісаць усё, як было. І таму ў гэтым творы ён падае праўдзівы рэпартаж Апакаліпсісу. Я памятаю, у момант чытання праўда мяне вельмі ўзрушыла.

**Я лічу, што беларуская ваенная проза старанна ўнікае падводных камянёў тэмы праўды пра вайну. Крок улева, крок управа — і ты асуджаны на грамадскае ганьбаванне**

## «Апошні класік, які пісаў без накуркі»

***— Якія цяжкасці напаткалі цябе падчас перакладу?***

— Самым цяжкім было перамагчы ў сабе пісьменніка, застацца рамеснікам і зрабіць менавіта пераклад, а не свой уласны твор. Пэўны час я думаў, што не буду перакладаць, а буду пісаць свой раман, на падставе кнігі Вонегута. Выходзіла такая «піктарыяльная фатаграфія», калі мастак расквечвае чорна-белы здымак на свой густ і ўпадабанне. Але, на шчасце, перакладчык ува мне перамог. Усе свае роздумы над гэтым тэкстам я выклаў у паслямове да перакладу.

Што да тэхнічнага аспекту працы з тэкстам, то тут мне пашанцавала. Пасля працы ахоўнікам у Нямецкай Калоніі, дзе я знайшоў кнігу, я ахоўваў ешыву, куды прыязджала шмат амерыканскіх яўрэяў, карэнных нью-йоркцаў. З аднаго боку, ім быў блізкі наш еўрапейскі кантэкст, з якога яны так ці іначай усе паходзяць, з іншага — яны вельмі добра зналіся на амерыканскіх рэаліях, дапамагалі мне з моўнымі цяжкасцямі ды схаванымі цытатамі. Гэта быў ідэальны асяродак для перакладу «Бойні №5». Да Вонегута яны ставіліся так, нібы Нью-Йорк — гэта вялікая вёска, і вось яны вернуцца дадому, зойдуць у суседнюю кавярню, пабачаць Вонегута — і лёгка мяне з ім пазнаёмяць.

***— Знаёмства адбылося?***

— Не. Але ў мяне ёсць аўтограф Курта Вонегута, яго для мяне здабыў амерыканскі беларус Лявон Юрэвіч незадоўга да смерці майстра. Ён сапраўды амаль выпадкова сустрэў Вонегута ў Нью-Йорку.

***— Каму раман «Бойня №5» прыйдзецца даспадобы?***

— Кожнаму, каму блізкая сусветная класіка XX стагоддзя. «Вясёла-сур'ёзная» літаратура. Курт Вонегут — гэта ўжо брэнд. Гэта, відаць, апошні класік XX стагоддзя, які пісаў «без накуркі». Хоць тэксты ў яго выходзілі «накураныя». Ну і не варта забывацца і пра аматараў фантастыкі. Усё-ткі Вонегут вельмі ўдала маскіраваў свае філасофскія рэчы пад «саенс фікшн». Хоць я не лічу яго пісьменнікам-фантастам. Для мяне гэта сучасны класік разраду Васіля Быкава.



«Вось ён я, на амерыканскай зямлі са сваёй баявой сяброўкай: нам па 21, і мы, яшчэ нават не паспеўшы пераапрануцца ў цывільнае, у шараговай нью-йорскай школе на бездакорнай англійскай вучым амерыканскую дзятву рускай мове. Дарэчы, у сваім школьніцтве я не сумняваўся, што самі мы вучым англійскую якраз дзеля ваенных і да іх падобных мэтаў — інакш на чорта ўсе гэтыя выдыганні з «Pass me your money please», «Can I have your watch?». Нашто нам словы, якія інакш ніколі не давядзецца прамаўляць, калі яны не будуць гучаць у загадным рытме, якому, усё роўна як настаўніцкая ўказка, дапамагае калашнікавая руля?

Я лічыў, што выкладаць амерыканятам рускую мову ў першыя пасля перамогі дні — звышважна. Дзеці ж ні ў чым не вінаватыя і прагнуць сапраўдных ведаў: праўдзівай матэматыкі, праўдзівай біялогіі і такой самай хіміі. Праўда возьме сваё, нягледзячы на тое, што раней ім дзяўблі, што добрае — гэта дрэннае і — наадварот. Я думаў, што амерыканскім дзецям трэба адно як след усё патлумачыць, зрабіўшы гэта на самай правільнай мове свету — рускай».

**Павел Касцюкевіч,**
**з паслямовы да раману К. Вонегута «Бойня №5, або Крыжовы паход дзетак»**

ПРАБЛЕМА

# КУПЛЯЙ БЕЛАРУСКАЕ — СЛУХАЙ СВАЁ!

Анатоль МЯЛЬГУЙ

**Уладзімір Караткевіч сваёй навелай «Кніганошы» рамантызаваў небяспечную працу тых, каго сёння называюць «распаўсюднікамі непадцэнзурнай беларускамоўнай кніжнай прадукцыі». Сучасным кніганошам знайшлася праца. Толькі цяпер яны заняты распаўсюджваннем беларускіх дыскаў, кніг, у тым ліку і па музычнай тэматыцы, адпаведнай атрыбутыкі (значкоў, постэраў і саколак) нашых выканаўцаў.**



Менавіта дзякуючы гэтым сціплым героям музычнага рынку беларускамоўная прадукцыя ўсё часцей знаходзяць сваіх удзячных спажыўцоў. На захадзе гэта з'ява набыла назву «дыстро» (ад англ. distro: disk + bistro) — так называюцца некамерцыйная сетка распаўсюджвання музыкі, друкаваных выданняў і атрыбутыкі на тую ці іншую музычную тэматыку.

Працуюць беларускія дыстро ў асноўным у інтэрнэце, але існуе актыўная сетка распаўсюднікаў, якія вядуць гандаль беларускамоўнай прадукцыяй наўпрост, у кантакце са спажыўцамі. Сёння прапаную некалькі штрыхоў да партрэта сучаснага кніганошы, а дакладней — дысканошы. У гэтым мне дапамога пачынальнік і легенда беларускамоўнага дыстро, вядомы беларускі літаратар і музычны крытык Вітаўт Мартыненка.

## Сучасны беларускі кніганоша

Колькасць распаўсюднікаў беларускамоўнай прадукцыі ў нашай краіне пакуль не такая вялікая, каб стварыць сацыяльны партрэт гэтай культурніцкай з'явы. Тым не менш, сярод гандляроў беларускімі дыскамі ёсць людзі рознага ўзросту і сацыяльнага становішча. Быць распаўсюднікам такой важнай прадукцыі выказваюць ахвоту і студэнты, і прадпрымальнікі сярэдняга ўзросту, і пенсіянеры...

Да таго ж, ёсць адна рыса, якая аб'ядноўвае беларускіх дысканошаў і якая вельмі неабходна ўсім, каб стаць паспяховым распаўсюднікам, — любоў да беларушчыны, да беларускай музыкі ўсіх накірункаў. Гэта якасць дапамагае весці з патэнцыяльным спажыўцом бесперапынны дыялог, падчас якога выяўляюцца яго музычныя прыхільнасці, рэкламуюцца навінкі беларускага музычнага рынка, прапануецца прадукцыя, якая найбольш адпавядае густу пакупніка. Галоўнае — любіць тую музыку, якую прапануеш набыць. Урэшце, такія ўзаемаадносіны вядуць да таго, што беларуская прадукцыя ўсё часцей знаходзіць свайго спажыўца.

Заўважу, што сярод тых, хто звяртае сваю ўвагу на «меню» беларускага дыстро, сустракаюцца не толькі ўжо вопытныя знаўцы айчынных музычных навінак, але і неафіты, якія ў сваім жыцці ніколі не сутыкаліся з нацыянальным мастацкім прадуктам. Для іх у распаўсюджвальнікаў беларускамоўнай прадукцыі назапашана вялікая колькасць класічных і найноўшых альбомаў (іх можна паслухаць «жыўцом» на CD-прайгравальніку), якія могуць перавярнуць іх уяўленне пра сучасную беларускую музыку, а таксама моцная аргументацыя, каб стаць спажыўцом нацыянальнага музычнага прадукту. Па-першае, тлумачаць ім дысканошы, набываць беларускія дыскі — гэта модна, ці, па-сучаснаму, «крута», па-другое, такога прадукту няма ў іх сяброў, а таму яны будуць валодаць эксклюзіўным музычным таварам!

Вядзецца дыялог і з нешматлікімі беларусафобамі, якія для задавальнення сваёй цікаўнасці бывае заглядаюць на паліцы з беларускамоўным таварам («*А, это ваши белорусские дела!*»). Галоўны аргумент у спрэчцы з імі — факт шырокага стылістычнага спектра беларускамоўнай музычнай прадукцыі. Як і адносіны да любой з'явы, так і іх цікаўнасць да айчыннай музычнай прадукцыі праходзіць праз тры этапы: першы — «поўная лухта!» потым — «у гэтым нешта ёсць», трэці — «беларуская музыка выдатная!». Вось чаму трэба адзначыць вялікую заслугу беларускіх распаўсюджвальнікаў у тым, што нядобразычліўцаў беларушчыны становіцца менш.

## Беларускі музычны тавар

Яшчэ адна асаблівасць распаўсюджвання беларускамоўнай музычнай прадукцыі — мабільнасць гандлёвых кропак, якія ладзяцца дысканошамі на канцэртах і фестывалях, культурніцкіх імпрэзах нацыянальнай скіраванасці. Такой развароцістасці не дачакаешся ад дзяржаўнага гандлю. Як і прымальнага для масавага пакупніка кошту на прадукцыю.

А як фарміруюцца цэны на беларускамоўную прадукцыю ў сучасных дысканошаў? Пра гэта распавядае Вітаўт Мартыненка: «У свой час я паматаўся па свеце і паглядзеў, як, напрыклад, у Канадзе фарміруюцца кошты на музычную прадукцыю. Кожны гандляр там імкнецца быць прывабным для пакупніка: забяспечвае якасць тавару і аптымальнасць яго кошту. Але ў беларускім дзяржаўным гандлі ўсё знаходзіцца ў полі адміністрацыйнага кіравання. Напрыклад, кніга «222 альбомы беларускага року і ня толькі...» (В. Мартыненкі і аўтара гэтых радкоў А. Мяльгуя) у краме «Акадэмкніга» каштуе 22 тысячы рублёў. У краме «Падземка» — 29 тысяч, у галерэі «Ў» — 24 тысячы 800 рублёў. І цэннікі на яе не мяняюцца гадамі...

Я ж перад тым, як выставіць кошт дыска ці кнігі, высвятляю ў выдаўца яе сабекошт і колькі грошай я павінен яму здаць пасля таго, як увесь тавар распрадасца. Дадаю да гэтай сумы свае пару тысяч рублёў і фарміірую кошт тавару, які ў выніку атрымліваецца даволі прывабным для пакупніка. Для параўнання: у дзяржаўных крамах, калі тыя бяруць на распродаж беларускія дыскі ці кнігі, «накруткі» дасягаюць двух з паловай разоў! Зразумела, трэба плаціць заробкі гандлярам, плаціць арэнду... Мы ад гэтага не залежым, таму і можам прапанаваць зусім іншыя, больш нізкія кошты. Тую ж энцыклапедыю «222 альбомы беларускага року і ня толькі...» ў мяне можна набыць па 17–20 тысяч рублёў у залежнасці ад якасці выдання. Але я магу прадаць яе і за 15 тысяч, калі бачу, што чалавек вельмі цікавіцца, а грошай на поўны кошт не хапае.

У маркетынгу ёсць такое паняцце, як «імгненны попыт»: чалавек, магчыма, пад уздзеяннем дыялогу з гандляром ці ад разумення грашовай выгады, выказвае жаданне тэрмінова зрабіць пакупку таго ці іншага выдання. І калі гэты попыт не задаволіць у гэтую ж хвіліну, то жаданне можа згаснуць назаўсёды. Мы маем магчымасць задавальняць «імгненны попыт», бо ўвесь час мы знаходзімся ў кантакце з пакупнікамі, мы аператыўна інфармуем пра тую музыку, пра тую культуру, якую мы самі любім і шануем!»

Да таго ж, ніводная дзяржаўная крама не можа прапанаваць музычныя дыскі ці кнігі з аўтографамі выканаўцаў ці аўтараў тэкстаў. У выпадку з прадукцыяй ад Вітаўта, разам са многімі музычнымі альбомамі ў яго можна атрымаць і аўтограф. Як аўтара вершаў (для гурта P.L.A.N., напрыклад), аўтара прадмовы да новых дыскаў БМAgroup ці той жа кнігі «222 альбомы беларускага року і ня толькі...». Тады тавар, які куплены ў беларускім дыстро, набывае для ўладальніка падвойную каштоўнасць!

## Накарміце карову айчыннага шоу-бізнесу

Праблема, якая ўвесь час пераследуе гандляроў беларускамоўнай музычнай прадукцыяй, — узаемаадносіны з дзяржаўнымі кантралюючымі органамі і інстанцыямі. Таму ў сучаснага дысканошы павінна быць «алібі» на той выпадак, калі ўзнікне пытанне наконт законнасці гандлю музычнай прадукцыяй. І кожны з іх шукае найбольш абгрунтаванае выйсце: хтосьці ўзаконьвае сваю дзейнасць як прыватны прадпрымальнік, хтосьці мае пасведчанне ад грамадскіх структур, якія раней аформілі права на гандаль. Вітаўт Мартыненка праводзіць свае гандлёвыя «вылазкі» як аўтограф-сесіі, што дазваляюцца заканадаўствам.

Нагадаю, што Вітаўт браў удзел у стварэнні вялікай колькасці альбомаў і кніг, якія можна набыць у яго ным дыстро. Таму, калі міліцыя ці прадстаўнікі адміністрацыі канцэртных залаў бачаць перад сабой аднаго з аўтараў некалькіх беларускіх дыскаў і шыкоўна выдадзенай кнігі «222 альбомы беларускага року і ня толькі...», усе пытанні адпадаюць самі сабой...

Чаму ж не пайсці найбольш лёгкім шляхам, не аформіць пасведчанне прыватнага прадпрымальніка? На гэта ў Вітаўта свае аргументы: «Цяпер у краіне адносіны да прыватнай ініцыятывы можна ахарактарызаваць наступным чынам: «Даіць карову пачынаюць да таго, як яна паела». Іншымі словамі, у гэтую справу можна ўбухаць не адну тысячу долараў, каб потым зразумець, што яна стратная. Сама сістэма падаткаабкладання не спрыяе развіццю некамерцыйнай культурніцкай дзейнасці.

На захадзе, калі гандляр займаецца распаўсюджваннем некамерцыйных накладаў кніг ці дыскаў (да 1 тысячы экземпляраў), то ён атрымлівае льготы ад дзяржавы. Бо там разумеюць, што гэта спрыяе творчаму росту выканаўцаў, якія потым папаўняюць шэрагі зорак шоу-бізнесу. Вось гэтыя зоркі, а таксама лэйблы, якія выдаюць камерцыйныя тыражы дыскаў, і з'яўляюцца асноўнымі падаткаплацельшчыкамі. У нас некамерцыйныя тыражы абкладаюцца татальнымі падаткамі і дыскі становяцца больш дарагімі, чым, напрыклад, у ЗША.

Вось чаму незалежныя распаўсюджвальнікі беларускамоўнай музычнай прадукцыі, якія працуюць з некамерцыйнымі тыражамі, з'яўляюцца пачынальнікамі сапраўднага шоу-бізнесу ў краіне. Альтэрнатыва заўсёды на карысць слухачам і выканаўцам».

Прыйдзе час, і гісторыя ацэніць тую ролю, якую выканалі незалежныя распаўсюджвальнікі ў дачыненні да сучаснай беларускай культуры. Як гэта адбылося з асэнсаваннем ролі кніганошаў у гісторыі культуры Літвы і Беларусі, так маляўніча расказана Уладзімірам Караткевічам.

Але цяпер ёсць значныя адрозненні ад сітуацыі XIX стагоддзя. І галоўная з іх: вопыт беларускіх дыстро — рэальны доказ таго, што нават і ва ўмовах нечуванага прэсінгу ўсяго нацыянальнага ў краіне можна пашыраць веды пра канкурэнтаздольную нацыянальную культуру на роднай мове і, адначасова, атрымліваць матэрыяльны прыбытак ад працы на беларушчыну.

▸ ВЫСТАВА

# КОКТЫШ І СЕЛЯШЧУК У «ДОБРЫХ МЫСЛЯХ»

Аляксей ХАДЫКА

**У фальварку «Добрыя мыслі» — трэцяя фотавыстава з серыйнага праекту Таццяны Гаранскай і Віктара Маркаўца — «Памяці Міколы Селяшчука». З нязменным аўтарам, знакамітым фатографам Яўгенам Коктышам, чые густоўныя чорна-белыя фотаздымкі нагадваюць то далікатныя графічныя аркушы, то экспрэсіўныя плакаты, то партрэтны жывапіс. 50 фотаработ вяртаюць гэтым разам успамін пра слыннага беларускага мастака пакалення 1970–1990-х гадоў.**

У падзеі ёсць і святочны аспект — днямі аўтар здымкаў адсвяткаваў 70-годдзе, хаця гледзячы на энергічнага ўсмешлівага барадача, якога ад імя чытачоў "НЧ" шчыра віншуем з юбілеем, хочацца гаварыць не пра ўзрост. Больш уражваюць творчыя здзяйсненні. За кожнай з трох праведзеных у «Добрых мыслях» выстаў — 1–2 тысячы фотаздымкаў, прысвечаных яе героям. Невыпадкова, што кватэра майстра даўно ператварылася ў своеасаблівы архіў новай гісторыі Беларусі. Асабліва ўражвае тое, што майстру ўдалося захаваць выдатныя калекцыі здымкаў з часоў яшчэ далічбавай фатаграфіі. З тых, калі яму даводзілася лепшыя негатывы адсылаць замоўцам, таму ж маскоўскаму агенцтву «*Новости*», якое зараз бессаромна гандлюе яго здымкамі ў інтэрнэце.

Папярэднія выставы ў «Добрых мыслях» прысвячаліся Васілю Быкаву і Алесю Адамовічу. Знакавыя асобы беларускай культуры, якія, здавалася, заўсёды былі навідавоку ў віры грамадскага жыцця, але стварыць такую фотагалерэю, летапіс іх жыцця давялося толькі Яўгену Коктышу.

Сябры Міколы Селяшчука, што прыйшлі на адкрыццё экспазіцыі, прыгадвалі: прыязныя творчыя дачыненні паміж Быкавым, Адамовічам і адносна маладымі мастакамі ўсталёўваліся менавіта дзякуючы Коктышу.



Мікола Селяшчук, Уладзімір Савіч, Міхась Раманюк... Каляды–1980 у Заслаў'і.



З Маргарытай Шчэмелевай. Купалле ў Заслаўі. 1978.



Коктыш і Быкаў.

## Маладыя і мэтры

Наколькі істотнай для мастакоў была сяброўская цёплая падтрымка ўжо знакамітых пісьменнікаў — можна толькі здагадвацца. Яўген Коктыш прыгадвае эпізод, калі ў 1980-х яго запрасіў Анатоль Сульянаў, генерал-маёр, кіраўнік палітупраўлення БВА і пісьменнік, зрабіць фотаздымкі яго разам з Адамовічам і Быкавам на кургане Славы. Хоць выбраліся на шыкоўнай генеральскай машыне, добра прамерзлі на вятры на кургане. І на зваротным шляху Быкаў прыгадаў пра карціну мастака, якая ўразіла яго на нядаўняй выставе. Вырашана — едуць у майстэрню да Селяшчука. І вось ужо сам Быкаў вядзе экскурсію па майстэрні, пераходзячы ад палатна да палатна і даючы суразмоўцам свае мастацтвазнаўчыя тлумачэнні. Кола сяброў і наведвальнікаў майстэрні — тут жа на здымках Коктыша ў «Добрых мыслях»: Уладзімір Някляеў, Рыгор Барадулін, мноства мастакоў, крытыкаў, журналістаў, проста шчырых і добрых людзей.

Якая карціна так прывабіла Быкава? Мала хто мог даць на юбілейныя патрыятычныя выставы такія творы, якія найперш гаварылі пра сваё асабістае — і адначасна выклікалі, правакавалі значныя для грамадства пытанні. Можа, палатно «Вярнуліся» (1985), дзе, стылізаваныя, як на старым фотаздымку, паўсталі дзве постаці ветэранаў вайны? А можа, карціна «Канец сезону туманоў» (1985, фактычна партрэт першай жонкі, маладой жанчыны на фоне амаль пустэльнага краявіду), чый загадкавы вобразны свет прымусіў мінскую публіку задавацца пытаннем: сезон туманоў — гэта эпоха брэжнеўскага застою?

Кажуць, трапіўшы ў калекцыю тагачаснага сакратара Мінскага гаркама КПБ, а затым міністра замежных спраў Беларусі Пятра Краўчанкі, твор зрабіўся своеасаблівым пропускам для Селяшчука ў Еўропу: мастак атрымаў дазвол на замежныя выставы, яго карціны пачалі выгодна прадавацца. А можа самотніку Быкаву прыйшоўся да спадобы твор «Матылькі тут не жывуць» — шчымлівы метафарычны партрэт чалавечай адзіноты? Пра раз'яднанасць людзей у быццам бы шчаслівым савецкім грамадстве так выразна Селяшчук першым сказаў у беларускім жывапісе.

## Галерэя жыцця

На большасці фотаздымкаў Яўгена Коктыша — Селяшчук, вясковы хлопец з-пад Маларыты, які так натуральна зрабіўся арганічнай часткай сталічнага культурнага жыцця, застаўся з прыязнай адкрытай усмешкай на твары. Вось ён у майстэрні, а вось побач са сваім настаўнікам, Васілём Шаранговічам — адукацыю ў Акадэміі мастацтваў, тагачасным Тэатральна-мастацкім інстытуце, ён атрымаў як майстар кніжнай і станковай графікі. Адсюль, з моцнай плыні новага беларускага графічнага мастацтва, разам з захапленнем імпрэсіяністамі, сюррэалізмам і іншымі сучаснымі з'явамі актуальнай еўрапейскай культуры, якое падтрымліваў яго старэйшы сябра мастак Георгій Скрыпнічэнка, — загадкавасць і неадназначнасць жывапіснага ладу карцін Селяшчука. Графіка давала свабоду эксперыменту, які мастак пераносіў на вялікае палатно, насычаючы яго дзіўнымі фалькларнымі вобразамі.

На адным з фотаздымкаў — Селяшчук разам з Уладзімірам Савічам і Уладзімірам Тоўсцікам побач з Палацам мастацтваў на вуліцы Казлова ў Мінску — насупраць іхняй агульнай майстэрні над крамай «Акіян». «Я жыву над акіянам», — паўжартам казаў Мікола ў тыя часы. Усе трое — выдатныя, знакавыя постаці ў беларускім мастацтве XX стагоддзя, чыя супольнасць узбагаціла творчы почырк кожнага паасобку. З акіяну іх мастацкіх знаходак чэрпае натхненне не адзін сучасны беларускі акадэмік: работы Селяшчука дагэтуль разыходзяцца на вобразныя цытаты.

Яшчэ здымкі: Мікола з дзяўчынамі, мадэлямі з Беларускага дома мод, яны потым пераўтвараліся ў загадкавых прыгажунь яго палотнаў — і ў гераінь фотапартрэтаў Коктыша, які і заахвочваў паненак да працы з мастаком. А вось фальклорныя святы ў Заслаўі, што яднালі ў тыя гады мноства маладых беларускіх інтэлектуалаў.

## Вяртанне пазык

Гутарка сяброў, знаёмых, Селяшчука, мастацтвазнаўцаў і экспертаў за круглым сталом на адкрыцці фотавыставы закранула няпростыя пытанні, якія засталіся пасля трагічнай гібелі мастака летам 1996 года на Цірэнскім моры ў Італіі. Паехаў у краіну класічнай мастацкай культуры, пазнаёміцца з якой так марыў, і не вярнуўся. А ў Мінску дагэтуль цяжка пабачыць яго творы. Яны разышліся па прыватных зборах, трапілі за мяжу.

У гэтыя дні ў Нью-Ёрку адбываецца выстава-аўкцыён, дзе прадстаўлена каля 20 карцін Селяшчука. А ініцыятыва арганізавацца прысвечаны яму фонд і калекцыю адразу ў 1996-м натыкнулася на перашкоды: правы ўласнасці, кошт твораў, пошук памяшкання. 14 гадоў чакае выдання адзіная манаграфія творчасці, падрыхтаваная крытыкам Валянцінай Трыгубовіч пры непасрэдным удзеле самога Селяшчука. Перад апошнім яго ад'ездам з радзімы, здавалася, усё было гатова да яе здачы ў друк. Раптоўная смерць спыніла працу.

А выдадзены Наталляй Шаранговіч 335-старонкавы альбом-каталог і зборнік успамінаў «Мікола Селяшчук. Гучанне музыкі нябёсаў» (2007) ахоплівае не ўсе звязаныя з творчасцю мастака матэрыялы.

Фатаграфія — схоплены момант мінулага, архіў гістарычнай памяці, з'ява мастацтва, калі да яе дакранаецца рука і пачуццё такога адмыслоўцы, як Яўген Коктыш. «Добрыя мыслі» з Таццянай Гаранскай і Яўгенам Коктышам увосень плануюць прадоўжыць фотападарожжа па вяршынях айчыннай культурнай спадчыны. У планах стварэнне галерэй-успамінаў пра музыку Уладзіміра Мулявіна, актрысу Стэфанію Станюту, скульптара Анатоля Анікейчыка.

Новы Час
Агульнапалітычная штотыднёвая газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар Кароль Аляксей Сцяпанавіч

Зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі РБ. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў». Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220013, г. Мінск, вул. Мележа, 1-1234.
Тэл.: +375 29 651 21 12.
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП "Плутас-Маркет".
г. Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.
Замова № 685

Падпісана да друку 23.07.2010. 8.00.
Наклад 6000 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.

Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.

Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы. Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.